## Дзяржава і царква павінны разам процістаяць глабальным выклікам XXI стагоддзя

**Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка і Мітрапаліт Мінскі і Слуцкі Філарэт, Патрыяршы Экзарх усяе Беларусі на сустрэчы 6 красавіка абмеркавалі пытанні ўзаемадзеяння дзяржавы і царквы.**

Размова ішла таксама аб сумеснай рабоце па сцвярджэнні традыцыйных духоўных каштоўнасцей беларускага грамадства, аб дапамозе з боку праваслаўнай царквы тым, хто мае ў ёй патрэбу.

Асабліва было адзначана, што дзяржава і царква павінны разам процістаяць глабальным выклікам XXI стагоддзя, забяспечваць маральнае адзінства грамадства, падтрымліваць мір і стабільнасць на беларускай зямлі.

Кіраўнік беларускай дзяржавы разам з Мітрапалітам Філарэтам пабывалі ў дамавой царкве Мінскага епархіяльнага ўпраўлення, асвячонай у гонар Сабора беларускіх святых, запалілі свечкі каля храмавога абраза.

**Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.**

## Уладзімір Макей абмеркаваў праблемныя аспекты беларуска-расійскіх адносінаў

**Кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта Беларусі Уладзімір Макей і яго расійскі калега Сяргей Нарышкін на сустрэчы 6 красавіка ў Маскве ў адкрытай і даверлівай форме абмеркавалі праблемныя аспекты беларуска-расійскіх адносінаў, перспектывы актывізацыі двухбаковага супрацоўніцтва па ўсіх кірунках.**

Нагадаем, што рабочая паездка Кіраўніка Адміністрацыі Уладзіміра Макея ў расійскую сталіцу адбылася як развіццё дамоўленасцяў, дасягнутых раней у тэлефоннай размове паміж прэзідэнтамі Беларусі і Расіі Аляксандрам Лукашэнкам і Дзмітрыем Мядзведзевым.

Уладзімір Макей і Сяргей Нарышкін дамовіліся аб прапрацоўцы сустрэчы прэзідэнтаў Беларусі і Расіі ў найбліжэйшы час, тэрміны і парадак дня якой будуць узгоднены па дыпламатычных каналах. Пры гэтым прынцыповая пазіцыя беларускага боку заключаецца ў тым, каб гэта сустрэча мела канкрэтны, прадметны і змястоўны характар.

Уладзімір Макей правёў таксама шэраг гутарак у Пасольстве Беларусі з прадстаўнікамі беларускай дыяспары і абмеркаваў пытанні больш актыўнага прыцягнення патэнцыялу беларусаў, якія пражываюць у Расійскай Федэрацыі, у рэалізацыю канкрэтных гандлёва-эканамічных праектаў у Беларусі.

Акрамя таго, у Маскве Кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта Беларусі сустрэўся таксама з Дзяржаўным сакратаром Саюзнай дзяржавы Паўлам Барадзіным. Яны дэталёва разгледзелі актуальны парадак дня інтэграцыйных працэсаў у рамках Саюзнай дзяржавы.

## Медальную скарбонку цяжкаатлетаў папоўніла Валянціна Ляхавец

На чэмпіянаце Еўропы па цяжкай атлетыцы, які праходзіць гэтымі днямі ў Мінску, скарбонка беларускай зборнай папоўнілася яшчэ адным медалём. Валянціна Ляхавец, якая выступае ў вагавой катэгорыі да 53 кг, паказала трэці вынік па суме двабор'я — 198 кг (87 кг — рывок +111 кг — штуршок). Чэмпіёнкай кантынента стала турэцкая спартсменка Айлін Дэсдэлен — 208 кг (88 кг +120 кг), прычым у другім практыкаванні яна ўстанавіла новы рэкорд Еўропы. Сярэбраная ўзнагарода на рахунку балгаркі Баянкі Коставай — 199 кг (87 кг +112 кг). Нагадаем, што днём раней чэмпіёнам Еўропы стаў беларус Віталь Дзербянёў.

Усяго ў актыве беларусаў шэсць вялікіх і малых медалёў — два залатыя, сярэбраны і тры бронзавыя. На рахунку Віталя Дзербянёва, акрамя залатога медаля па суме двабор'я, медаль такой жа вартасці ў рыўку. Валянціна Ляхавец стала другой у рыўку, трэцяй у штуршку і па суме двабор'я. Генадзь Махвіеня паказаў трэці вынік у рыўку, стаўшы па суме двухбор'я чацвёртым.

**Алена КРАВЕЦ.**

Трыбуна прафсаюзнага з'езда

Аляксандр БОЙКА:

# «ПЕРАВОД НАСТАЎНІКАЎ НА КАНТРАКТ ПАДРЫВАЕ ЯКАСЦЬ АДУКАЦЫІ»

**— Здольнасць сістэмы адукацыі эфектыўна рэагаваць на патрэбы сучасных навучэнцаў у многім залежыць ад тых дзеянняў, якія прадпрымаюцца з боку дзяржавы для найму, падрыхтоўкі, падтрымкі настаўнікаў і забеспячэння педагогам годных умоў працы, — такую думку агучыў з трыбуны VI з'езда Беларускага прафесійнага саюза работнікаў адукацыі і навукі старшыня галіновага прафсаюза Аляксандр БОЙКА.**

VI з'езд прайшоў у Мінску 6 красавіка. Яго дэлегатамі сталі больш за 300 прадстаўнікоў галіновага прафсаюза. А гасцямі з'езда — прадстаўнікі прафсаюзаў работнікаў адукацыі з Расіі, Украіны, Літвы, Арменіі, Таджыкістана, а таксама генеральны сакратар Пан-еўрапейскай структуры Інтэрнацыянала адукацыі спадар Марцін Ромар.

**«Уражвае актыўнасць, з якой уключыліся чытачы ў дыскусію ў газеце «Звязда» па выніках сумеснага пасяджэння калегіі Міністэрства адукацыі і Прэзідыуму ЦК прафсаюза. Гэта чарговае сведчанне таго, што пытанні, якія ставіць прафсаюз, і бачанне іх вырашэння ідуць непасрэдна ад жыцця...»**

Аляксандр Бойка падкрэсліў, што адной з асноўных сваіх задач прафсаюз бачыць павышэнне прэстыжу педагагічнай прафесіі ў грамадстве, паколькі гэтая задача напрамую звязана з прыцягненнем у галіну высокакваліфікаваных і зацікаўленых у якасці сваёй работы спецыялістаў. Да таго ж, і ў тых, хто ўжо шчыруе на ніве педагогікі, павінен быць матыў, каб застацца працаваць у галіне і не расчаравацца ў абранай прафесіі. Дасягненне гэтых мэтаў залежыць ад статуса педагагічных работнікаў, іх заробкаў, магчымасцяў службовага росту, павагі з боку грамадства, а таксама ад таго, наколькі педагогі свабодныя ў развіцці свайго творчага педагагічнага патэнцыялу.

Лідар галіновага прафсаюза мусіў канстатаваць, што ўсё больш заўважным становіцца стаўленне да адукацыі як да паслугі: **«Нас спрабуюць навучыць усё больш актыўна зарабляць, і гэта часта перамяшчае акцэнты ў рэалізацыі адукацыйнай палітыкі на месцах, бо галоўнае ў рабоце педагагічнага калектыву — не прыбытак. Галоўнае — гэта выхаванцы і выпускнікі, ацаніць уклад якіх у развіццё дзяржавы можна толькі праз дзесяцігоддзі...»**

Аляксандр Бойка паведаміў дэлегатам з'езда, што па пытаннях павышэння заробкаў прафсаюз неаднойчы звяртаўся ва ўсе магчымыя інстанцыі, аднак дабівацца росту рэальнай заработнай платы становіцца ўсё больш складана. Шматлікасць работнікаў адукацыйнай галіны часта ўскладняе вырашэнне пытання.

— Гэта на розных узроўнях ледзьве не ставіцца нам у віну, маўляў, вас занадта многа, — дадаў Аляксандр Бойка. — Аднак калі дзяцей у краіне будзе нараджацца больш, значыць, і педагогаў краіне спатрэбіцца больш...

Сярэднямесячная заработная плата работнікаў галіны склала ў 2009 годзе 693,9 тысячы рублёў (248 долараў ЗША). Вельмі невысокай застаецца заработная плата ў работнікаў устаноў пазашкольнага навучання і выхавання, метадыстаў, работнікаў цэнтралізаваных бухгалтэрый, гаспадарчых групаў, абслугоўваючага персаналу, без якіх галіна проста не можа функцыянаваць. Так, памер заработнай платы ў работнікаў абслугоўваючага персаналу, якія тарыфікуюцца па першым разрадзе (прыбіральшчык, дворнік, падсобны рабочы) з улікам надбаўкі за стаж і стымулюючых выплат складае 265 тысяч рублёў (92 долары), або 66,5 працэнта мінімальнага спажывецкага бюджэту. Зразумела, што гэтых грошай не хапае на пакрыццё нават першачарговых жыццёвых выдаткаў.

Ва ўстановах адукацыі не хапае настаўнікаў фізікі, матэматыкі, інфарматыкі, хіміі... Цяпер на педагагічных пасадах працуюць каля 8 тысяч настаўнікаў у пенсійным узросце і больш як 300 студэнтаў.

— Прафсаюз не збіраецца мірыцца з сітуацыяй, якая склалася па заробках у адукацыйнай галіне, — запэўніў Аляксандр Бойка. — Спадзяюся, што і сацыяльныя партнёры прафсаюза, і дэпутацкі корпус падзяляюць нашу пазіцыю...

### ЯК ЗАТРЫМАЦЬ КАДРЫ Ў ДАШКОЛЬНЫХ УСТАНОВАХ?

У выступленнях многіх дэлегатаў з'езда гучала праблема ўкамплектавання кадрамі дзіцячых дашкольных устаноў. Ёсць рэгіёны, дзе на вакансіі выхавальнікаў накіроўваюцца маладыя спецыялісты, якія хоць і маюць педагагічную адукацыю, аднак не профільную, што, вядома, нельга лічыць якасным вырашэннем праблемы з дэфіцытам педагагічных кадраў.

— За апошнія гады быў прыняты шэраг законаў і нарматыўных прававых актаў, якія, з аднаго боку, палепшылі ўмовы працы памочнікаў выхавальнікаў у плане ўстанаўлення ім надбавак і павелічэння працягласці адпачынку да 24 каляндарных дзён, а з другога — пагоршылі ўмовы працы для выхавальнікаў, — паведаміла **старшыня пярвічнай прафсаюзнай арганізацыі ўстановы адукацыі «Яслі-сад № 132» г. Мінска Кацярына КОМЛАЧ.** — У першую чаргу я маю на ўвазе скарачэнне працоўнага адпачынку выхавальнікам да 30 дзён.

Усё гэта прывяло да таго, што колькасць выхавальнікаў, што фактычна працуюць у дзіцячых садах, значна меншая за колькасць пасадаў у штатным раскладзе. Незапоўненымі застаюцца таксама вакансіі памочнікаў выхавальнікаў, медыцынскіх работнікаў і кухараў. Ці варта гэтаму здзіўляцца — зарплата выхавальніка (маладога спецыяліста з вышэйшай адукацыяй, без катэгорыі) складае 470 тысяч рублёў, а ў выхавальніка з вышэйшай адукацыяй, 15-гадовым стажам работы і вышэйшай катэгорыяй яна не перавышае 600 тысяч рублёў. Максімум, на які можа разлічваць памочнік выхавальніка, — гэта 300 тысяч рублёў, а кухар — на 250 тысяч рублёў. І гэта з улікам дзейных у сталіцы штомесячных даплат педагогам у памеры трох базавых велічынь, грантаў і прэмій Мінгарвыканкама. Магчыма, гэтыя выплаты і невялікія, аднак яны дазваляюць павысіць узровень сярэднямесячнай заработнай платы работнікаў сталічных устаноў адукацыі адносна рэспубліканскіх паказчыкаў.

Кацярына Комлач звярнула ўвагу на вялікі аб'ём нагрузкі на выхавальніка, які працуе на стаўку — яна складае 36 гадзін у тыдзень. **36 гадзін непасрэдных зносінаў з выхаванцамі, іх бацькамі і пастаяннай адказнасці за жыццё і здароўе дзяцей.**

— Хоць праблема зніжэння тыднёвай нагрузкі да 30 гадзін узнімаецца на працягу больш як 10 гадоў на розных узроўнях, але па сённяшні так і не вырашаная. І ў такіх умовах мы не проста працуем, але яшчэ і ўкараняем новыя тэхналогіі. Усё, што толькі магчыма, выхавальнікі робяць сваімі рукамі — займаюцца бягучым рамонтам і добраўпарадкаваннем тэрыторыі, вырабляюць навучальнае і гульнявое абсталяванне. Мы імкнёмся да таго, каб дзецям было ўтульна і цёпла, а бацькам — спакойна за сваіх дзяцей, — дадала Кацярына Комлач.

### «КАНТРАКТНАЯ СІСТЭМА — ІНСТРУМЕНТ АДМІНІСТРАЦЫЙНАГА ЦІСКУ»?

Не сакрэт, што да пераходу на кантрактную форму найму педагогі паставіліся калісьці надзвычай хваравіта. Галоўная прычына — няўпэўненасць у заўтрашнім дні і асцярога ціску з боку кіраўнікоў устаноў. І, на жаль, боязь педагогаў была небеспадстаўная. Многія з іх аказаліся пад пагрозай застацца без работы пасля завяршэння тэрміну кантракта. Кантракты, заключаныя тэрмінам на адзін год, фактычна пераўтвараюцца ў інструмент адміністрацыйнага ціску: педагогі цалкам справядліва хвалююцца за сваю будучыню...

**За перыяд з 2005 па 2010 гады колькасць агульнаадукацыйных устаноў скарацілася ў нашай краіне на 423, а колькасць педагагічных работнікаў — на 12 520 чалавек.**

— Асаблівую заклапочанасць у галіновага прафсаюза выклікаюць парушэнні заканадаўства аб працы пры заключэнні, падаўжэнні і скасаванні кантрактаў. Праўда, мэтанакіраваная работа прафсаюзных органаў на працягу шэрагу гадоў дала станоўчыя вынікі, — паведаміў Аляксандр Бойка. — Так, колькасць кантрактаў, заключаных з работнікамі на адзін год, скарацілася ў 2009 годзе да 18,6 працэнта. Узрасла колькасць кантрактаў, заключаных тэрмінам на пяць гадоў: з 21 працэнта у 2005 годзе да 35 працэнтаў летась.

— Не толькі ў сталіцы, але і ўвогуле па краіне застаецца нявырашанай праблема вылучэння ў поўным аб'ёме дадатковых сродкаў для павышэння тарыфнай стаўкі і аплаты дадатковага заахвочвальнага адпачынку работнікам устаноў адукацыі, якія працуюць на кантрактнай форме найму, — канкрэтызавала праблему Кацярына Комлач. — Але яшчэ ніхто не прааналізаваў эфектыўнасць павальнага пераходу на кантракты, бо недарэмна ж **Інтэрнацыянал адукацыі звязвае зніжэнне якасці адукацыі ў свеце з кароткатэрміновасцю працоўных зносінаў з педагагічнымі работнікамі.** Ці апраўданае заключэнне кантрактаў з усімі катэгорыям работнікаў галіны, калі з-за нізкіх заробкаў установам адукацыі і так не хапае тых жа прыбіральшчыкаў, памочнікаў выхавальнікаў ці дыетсёстраў?

— Мы цалкам згодныя з пазіцыяй Інтэрнацыянала адукацыі: перавод настаўніка на кантракт падрывае якасць адукацыі, — выказаўся на гэты конт Аляксандр Бойка. — Нягледзячы на павелічэнне кантрактаў, у якія ўключаны меры дадатковага стымулявання працы, іх памеры, як правіла, мінімальныя.

### РАЗМЕРКАВАННЕ — АДЗІНЫ СПОСАБ ЛАТАННЯ «КАДРАВЫХ ДЗІРАК»

За апошнія гады прафсаюзам было здзейснена шмат захадаў для абароны правоў маладых спецыялістаў. У прыватнасці, удалося замацаваць на заканадаўчым узроўні за маладымі спецыялістамі права на packetразмеркаванне, звальненне ў парадку перавода да іншага наймальніка, магчымасць накіравання выпускнікоў, якія навучаліся на платнай аснове, на вакансіі, што застаюцца пасля размеркавання «бюджэтнікаў» і г.д. Асабліва актуальнай бачыцца цяпер праблема катастрафічна нізкай заработнай платы ў маладых выкладчыкаў у ВНУ і сярэдніх спецыяльных навучальных установах. Сярэдні яе памер складае ў ВНУ 455,5 тысяч рублёў.

— Для нашага каледжа, як і для многіх іншых, застаецца нявырашанай праблема кадравага забеспячэння выкладчыкамі спецыяльных дысцыплін, у прыватнасці, па спецыяльнасцях «электразабеспячэнне» і «прамысловая цеплаэнергетыка», — прызналася ў сваім выступленні **старшыня пярвічнай прафсаюзнай арганізацыі работнікаў Магілёўскага дзяржаўнага тэхналагічнага каледжа Наталля ПАЎШКІНА.** — Нягледзячы на тое, што ў ВНУ з разуменнем ставяцца да вырашэння праблемы і размяркоўваюць сваіх выпускнікоў для работы выкладчыкамі, але яны замацоўваюцца ў нас толькі на два гады адпрацоўкі па размеркаванні, а пасля завяршэння тэрміну адпрацоўкі адбываецца адток кадраў на вытворчасць, дзе значна вышэйшая заработная плата. Для таго, каб сацыяльна падтрымаць маладога спецыяліста, мы вымушаныя прапаноўваць яму амаль дзве стаўкі педагагічнай нагрузкі, што, натуральна, адбіваецца на якасці яго работы.

**На пачатак 2010 года, па інфармацыі прафсаюзных органаў, у цэнтрах занятасці насельніцтва знаходзіліся на ўліку 722 былыя работнікі галіны, у тым ліку 531 педагог.**

— Сімвалічна, што VI з'езд Беларускага прафсаюза работнікаў адукацыі і навукі праходзіць у Год якасці. Прафсаюз заўсёды імкнуўся выконваць свае функцыі якасна. Мы не абыходзілі ўвагай ні адну катэгорыю работнікаў і вучнёўскую моладзь, па меры магчымасці і неабходнасці ўмешваліся ў далёка няпростыя сітуацыі, — заявіў Аляксандр Бойка. — Пасля з'езда перад прафсаюзам і яго сацыяльнымі партнёрамі стаіць складаная, але, безумоўна, выканальная задача — прывядзенне ў адпаведнасць з новым Галіновым пагадненнем на 2010—2012 гады дакументаў усіх узроўняў калектыўна-дагаворнай работы ў галіне. **Нас вельмі радуе тая акалічнасць, што інфармацыя аб рабоце прафсаюза стала актуальнай для друкаваных і электронных СМІ. У нас склалася вельмі плённае супрацоўніцтва з газетай «Звязда», «Настаўніцкай газетай» і «Народнай газетай». Уражвае актыўнасць, з якой уключыліся чытачы ў дыскусію ў газеце «Звязда» па выніках сумеснага пасяджэння калегіі Міністэрства адукацыі і Прэзідыума ЦК прафсаюза. Гэта чарговае сведчанне таго, што пытанні, якія ставіць прафсаюз, і бачанне іх вырашэння ідуць непасрэдна ад жыцця...**

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

## Абзац

**◢ Завершана выданне ўніверсальнага нарматыўнага даведніка беларускай тапанімії «Назвы населеных пунктаў Рэспублікі Беларусь». Даведнік складаецца з шасці кніг, што адпавядае кожнай з абласцей рэспублікі: Мінскай, Брэсцкай, Гомельскай, Гродзенскай, Віцебскай і Магілёўскай. Рашэнне аб распрацоўцы і выданні нарматыўнага даведніка «Назвы населеных пунктаў Рэспублікі Беларусь» было прынята ў 1998 годзе Тапанімічнай камісіяй пры Савеце Міністраў Беларусі. Ініцыятарам выдання быў Камітэт па зямельных рэсурсах, геадэзіі і картаграфіі пры Савеце Міністраў (цяпер Дзяржкаммаёмасці), які фінансаваў усе работы па падрыхтоўцы матэрыялаў да выдання і яго тыражаванні.**

◢ Каля 3 кг ртуці сабралі выратавальнікі ў адным з прыватных падворкаў Магілёва. Небяспечнае рэчыва разліў выпадкова на сваім падворку гаспадар набытага нядаўна дома. Пры праверцы змесціва знойдзенай на верандзе гумовай грушы ён выліў ртуць на зямлю. Спецыялісты МНС правялі дэмеркурызацыйныя працы, пацярпелых няма. Праверку праводзіць міліцыя.

### Поўны абзац

**◢ Жыхарка горада Цызнань у кітайскай правінцыі Шаньдун упершыню пайшла ў школу ў 102 гады. Кітаянка па імені Ма Сюсіянь марыла пра школу ўсё жыццё, якое вымусіла яе ў 13 гадоў пачаць працаваць, а ў 18 — выйсці замуж. Магчымасць пайсці ў школу Ма Сюсіянь дала адна з навучальных устаноў, у якой даведаліся пра мару старой з інтэрв'ю, узятага ў яе мясцовай газетай. Дзякуючы гэтаму 102-гадовая жанчына на адзін дзень стала вучаніцай першага класа: на ўроках, каб лепш чуць, яна выкарыстоўвала слыхавы апарат, а для чытання кніг — лупу. Ма Сюсіянь нарадзіла дзевяць дзяцей, большасць з якіх атрымалі вышэйшую адукацыю. Сын жанчыны, 58-гадовы І Фэньсінь, расказаў, што ў дзяцінстве яго маці нават прадавала каштоўнасці, каб адправіць дзяцей вучыцца. Пасля праведзенага ў школе дня Ма Сюсіянь падзякавала настаўніку і аднакласнікам і паабяцала старанна вучыцца.**

◢ Пажылы брытанец прадаў у камісійнай краме чамадан з зашытымі за падкладкай 60 тыс. фунтаў стэрлінгаў. Як высветлілася, яго жонка хавала грошы ў старым чамадане, пра што мужчына не ведаў. Пенсіянер адправіўся ў камісіёнку і папрасіў вярнуць рэч, але яе да той пары прадалі. Удачлівага пакупніка паспрабавалі вылічыць па звестках аб пакупках, якія здзяйсняліся з дапамогай крэдытных картак, але не атрымалася. Паколькі грошы былі пад падкладкай, магчыма, пакупнік і не ведаў пра іх. Аднак паліцыя ўсё ж арыштавала мужчыну і жанчыну: яны выявілі грошы, але не вярнулі іх законнаму ўладальніку. Большую частку сумы, якая ўжо была размеркаваная па розных банкаўскіх рахунках, удалося вярнуць.

***Паводле паведамленняў карэспандэнтаў «Звязды» і інфармагенцтваў.***

# ГРЭЦКІЯ БЛІНЫ МАЛОЙ ЛЮЦІНКІ

***(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)***

На працягу мінулага года «Марцінову гусь» наведалі каля 600 гасцей, сядзіба, па сутнасці, ператварылася ў асноўную крыніцу даходаў. Аднак сцвярджаць, што справа прыносіць вялікія грошы, таксама нельга. Асабістыя зберажэнні, што былі ўкладзеныя ў праект ад самага пачатку, змогуць акупіцца не хутка.

— Напэўна, пакуль больш важна, што ў сядзібы з'явіўся «свой кліент», — лічыць Алесь Белы. — Людзі едуць сюды за непаўторным духам XIX стагоддзя, зруйнаваным пасля паўстання 1864 года, у якім згарэла шмат людзей, лёсаў і цікавых задум. Аднак пры тым усё магло быць інакш. Таму мы проста прапануем кожнаму ўявіць: як выглядала б наваколле без драматычных падзей таго часу.

### «ЗАЛАТОЕ КОЛА» НАЛІБОЧЧЫНЫ

Прозвішча самага вядомага жыхара Люцінкі, пачынальніка новай беларускай літаратуры натуральна «перагукаецца» з імем каталіцкага святога Марціна. А ў дзень святога Марціна католікі ўсяго свету маюць завядзёнку гатаваць стравы з гусяціны. Адсюль і не зусім звычайная назва сядзібы Белых. Але гэта «напамінак» зусім не адзіны. У самім доме пра «дзядзьку Вінцэся» нагадвае многае — фотаздымкі, карціны, карты-планы вёскі пазамінулага стагоддзя.

— Вядома ж, мы ніякія не сваякі, — усміхаецца Алесь. — Але пры гэтым сапраўды шмат у чым лічым сябе спадкаемцамі Дуніна-Марцінкевіча, збіраем рэчы таго часу, імкнёмся рабіць невялікі музей. Бо асабіста мне гэта цікава, у рэшце рэшт, у нас нават шмат агульнага — мы абодва «ўцяклі» з гарадоў.

Аднак невялікі музей класіка толькі адзін з адметных праектаў. За сем кіламетраў ад Люцінкі ёсць знакаміты палац Тышкевічаў, недалёка знаходзіцца Баравікоўшчына — месца расстрэлу немцамі ксяндзоў-францішканцаў падчас мінулай вайны. Блізка адсюль Валожын, Ракаў, Івянец, Вішнева, Дзяржынава і знакамітая Налібоцкая пушча.

— Ці не ў кожнай еўрапейскай краіне існуе своеасаблівы культ рэгіянальных адметнасцяў: Ламбардыя, Таскана ці Бургундыя маюць і старанна зберагаюць свае лакальныя міфы, ганарацца мясцовымі рамёствамі і стравамі, — падкрэслівае Алесь Белы. — Шкада, што ў Беларусі такой завядзёнкі няма, гэты недахоп трэба выпраўляць. Вельмі хацелася б, каб мы таксама мелі сваю «іскрынку» — Налібоччыну.

У пэўнай ступені Налібоцкі край можа стаць папулярным месцам так званага настальгічнага турызму. Рэгіён мае вялікія сувязі і з суседняй Польшчай, малавядомай старонкай нашай гісторыі дагэтуль застаецца масавы польскі антыфашысцкі супраціў у наваколлі. Удзельнікі тых падзей жывуць за Бугам і сёння, як, дарэчы, жывуць шматлікія выхадцы з раёну і ў Ізраілі — Валожыншчына здаўна лічылася адным з сусветных цэнтраў яўрэйскай культуры.

— І ўсё ж развіваць адметнасці Налібоччыны неабходна не столькі для прыцягнення іншаземцаў, колькі для сябе, — перакананы Алесь Белы. — Безумоўна, нам не абысціся без буйной сельскагаспадарчай вытворчасці, яна была і павінна заставацца. Але тое, што часцяком тут няма альтэрнатывы — ужо мінус, з-за адсутнасці выбару заняткаў з'язджае ў гарады моладзь, вёскі пусцеюць і прыходзяць у заняпад. Прычым тое ўжо добра разумее дзяржава — адсюль і цяперашняя падтрымка аграсядзібаў. А гэта дае шанцы: я спадзяюся, што з цягам часу Люцінка можа ператварыцца ў невялікае ўтульнае мястэчка, дзе будуць займацца рамеснікі, з'явяцца мікрапрадпрыемствы па вытворчасці харчовых прадуктаў, дзе пашырыцца фермерства, прычым — са стаўкай на экалагічную вытворчасць.



### ДВА ЛІТРЫ ПІВА Ў ДЗЕНЬ — ПА-НАШАМУ

Лазняй, рыбалкай і нават паляваннем здзівіць сёння ўжо цяжка. Сядзіба ў Люцінцы вылучаецца далёка не гэтым і нават не магчымасцю пакаштаваць зноў жа «рэгіянальныя» налібоцкія стравы — салату з яйкамі і чарамшой, зразы па-шляхецку з чарнаслівам, мучныя калдуны графа Тышкевіча. Бо Белы — вядомы знаўца кулінарыі. І даследчык гістарычнай беларускай кухні, які займаецца зборам старажытных рэцэптаў вось ужо больш за дзесяць гадоў. Размова з гаспадаром нават здольная выклікаць лёгкі «светапоглядны» шок. Так, Алесь сцвярджае: дранікі і бабка — стравы не ўласнабеларускія. Усю ежу з цёртай бульбы нашы продкі некалі «пазычылі» ў яўрэяў. Дарэчы, гэтаксама, як і сакрэты фаршыраванай рыбы.

У пэўнай ступені запазычваннем стала і папулярная крамбамбуля — спачатку падобны напой выраблялі ў Германіі. Нашы ж продкі гатавалі іншае — скажам, настойку на аеры. А ўвогуле, «моцны» алкаголь трэба лічыць з'явай для беларусаў нехарактэрнай, «эпоха» той жа гарэлкі цягнецца ўсяго стагоддзі тры, прычым «скачок» спажывання адбыўся яшчэ пазней — калі гадоў 160-170 таму навучыліся вырабляць спірт з бульбы.

— Я не кажу, што моцныя напоі павінны знікнуць зусім, але лічу: яны мусяць каштаваць вельмі дорага, у некалькі разоў больш, чым цяпер, — зазначае Алесь. — Увогуле, дарослы чалавек мог бы абмежавацца і адным літрам такіх напояў у год, аднак пры гэтым спажываў менавіта якасны прадукт, «насычаны» гістарычнымі і міфалагічнымі сюжэтамі. Напрыклад, як у выпадках з тэкілай ці віскі.

Іншая справа — піва. Якраз яно — «наша класіка». Цяжка ўявіць, але некалі сярэдні беларускі шляхціч спажываў 700 літраў (!) бурштынавага напою ў год — немцы і чэхі могуць зайздросціць. Праўда, неверагодны аб'ём усё ж мае свае тлумачэнні. Працяглы час нашы продкі проста не ведалі, што можна кіпяціць ваду, і для змяншэння рызыкі захворванняў кампенсавалі патрэбу арганізма ў вадкасці півам. Прычым часцяком для яго прыгатавання выкарыстоўвалі не хмель, а ядловец ці іншыя зёлкі.

— Увогуле, з выкарыстання зніклі многія цікавыя кампаненты: цяпер амаль ніхто не гатуе стравы з крапівы, нягледзячы на парады дыетолагаў, мала хто звяртае ўвагу на нашы традыцыйныя бручку, пастарнак, рэпу, рэдзьку, — працягвае Алесь Белы. — Былі надзвычай распаўсюджанымі і стравы з грэчкі, але сёння пакаштаваць грэцкую бабку ці грэцкія бліны — амаль нерэальна.

Яшчэ больш значная «пераарыентацыя» густаў закранула такі цікавы напрамак, як спецыі. З цягам часу беларускія гаспадыні амаль цалкам адмовіліся ад бядрынцу і агурочніку. Тым часам яны даюць магчымасць разнастаіць меню, з'яўляюцца не менш цікавым «дадаткам» да бульбы, чым цыбуля, кроп ці кмен.

— Мы спрабуем нешта зрабіць самі, напрыклад, наведвальнікам сядзібы прапануюцца тыя ж грэцкія бліны, — заўважае Алесь Белы. — Але гэтага мала: бракуе спецыяльных праграм захавання і адраджэння нацыянальнай кулінарыі. Адно радуе, што літаральна ў апошні год па кансультацыю да мяне сталі звяртацца кампаніі, што займаюцца распрацоўкай рэцэптаў прадуктаў харчавання. І, магчыма, з цягам часу тыя парады ўсё ж будуць адлюстраваныя ў новых «брэндавых партфелях» нашых вытворцаў.

*Валожынскі раён.*

Организация:

## ОТКРЫТОЕ АКЦИОНЕРНОЕ ОБЩЕСТВО «БЕЛОМО-СТРОЙ»

Учетный номер плательщика: **УНП 100626320**
Вид деятельности: **технадзор в строительстве**
Организационно-правовая форма: **Открытое акционерное общество**
Орган управления: **Юридическое лицо без ведомственной подчиненности**
Единица измерения: **млн руб.**
Адрес: **г. Минск, пр-т Независимости, 172-309**

### БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС на 01 января 2010 года

| АКТИВ | Код строки | На начало года | На конец отчетного периода |
|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 |
| **I. ВНЕОБОРОТНЫЕ АКТИВЫ** | | | |
| Основные средства | | | |
| первоначальная стоимость | 101 | 58 | 31 |
| амортизация | 102 | 31 | 31 |
| остаточная стоимость | 110 | 27 | - |
| Нематериальные активы | | | |
| первоначальная стоимость | 111 | 2 | 2 |
| амортизация | 112 | 2 | 2 |
| остаточная стоимость | 120 | - | - |
| Доходные вложения в материальные ценности | | | |
| первоначальная стоимость | 121 | - | - |
| амортизация | 122 | - | - |
| остаточная стоимость | 130 | - | - |
| Вложения во внеоборотные активы | 140 | 2 945 | 2 945 |
| в том числе: незавершенное строительство | 141 | 2 945 | 2 945 |
| Прочие внеоборотные активы | 150 | - | - |
| **ИТОГО по разделу I** | **190** | **2 972** | **2 945** |
| **II. ОБОРОТНЫЕ АКТИВЫ** | | | |
| Запасы и затраты | 210 | 276 | 477 |
| в том числе: сырье, материалы и другие аналогичные активы | 211 | 61 | 68 |
| животные на выращивании и откорме | 212 | - | - |
| затраты в незавершенном производстве и полуфабрикаты | 213 | - | - |
| расходы на реализацию | 214 | - | - |
| готовая продукция и товары для реализации | 215 | - | - |
| товары отгруженные | 216 | - | - |
| выполненные этапы по незавершенным работам | 217 | - | - |
| расходы будущих периодов | 218 | 215 | 409 |
| прочие запасы и затраты | 219 | - | - |
| Налоги по приобретенным товарам, работам, услугам | 220 | 25 | 32 |
| Дебиторская задолженность (платежи по которой ожидаются более чем через 12 месяцев после отчетной даты) | 230 | - | - |
| в том числе: покупателей и заказчиков | 231 | - | - |
| прочая дебиторская задолженность | 232 | - | - |
| Дебиторская задолженность (платежи, по которой ожидаются в течение 12 месяцев после отчетной даты) | 240 | 76 | 162 |
| в том числе: покупателей и заказчиков | 241 | 75 | 161 |
| поставщиков и подрядчиков | 242 | - | - |
| по налогам и сборам | 243 | - | - |
| по расчетам с персоналом | 244 | - | - |
| разных дебиторов | 245 | - | - |
| прочая дебиторская задолженность | 249 | 1 | 1 |
| Расчеты с учредителями | 250 | - | - |
| в том числе: по вкладам в уставный фонд | 251 | - | - |
| прочие | 252 | - | - |
| Денежные средства | 260 | 11 | - |
| в том числе: денежные средства на депозитных счетах | 261 | - | - |
| Финансовые вложения | 270 | - | - |
| Прочие оборотные активы | 280 | - | - |
| **ИТОГО по разделу II** | **290** | **388** | **671** |
| **БАЛАНС (190+290)** | **300** | **3 360** | **3 616** |

| ПАССИВ | Код строки | На начало года | На конец отчетного периода |
|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 |
| **III. КАПИТАЛ И РЕЗЕРВЫ** | | | |
| Уставный фонд | 410 | 175 | 175 |
| Собственные акции (доли), выкупленные у акционеров (учредителей) | 411 | - | - |
| Резервный фонд | 420 | - | - |
| в том числе: резервные фонды, образованные в соответствии с законодательством | 421 | - | - |
| резервные фонды, образованные в соответствии с учредительными документами | 422 | - | - |
| Добавочный фонд | 430 | 305 | 305 |
| Чистая прибыль (убыток) отчетного периода | 440 | - | - |
| Нераспределенная (неиспользованная) прибыль (непокрытый убыток) | 450 | -498 | -498 |
| Целевое финансирование | 460 | 2 364 | 2 340 |
| Доходы будущих периодов | 470 | - | - |
| **ИТОГО по разделу III** | **490** | **2 346** | **2 322** |
| **IV. ДОЛГОСРОЧНЫЕ ОБЯЗАТЕЛЬСТВА** | | | |
| Долгосрочные кредиты и займы | 510 | 737 | 1 000 |
| Прочие долгосрочные обязательства | 520 | - | - |
| **ИТОГО по разделу IV** | **590** | **737** | **1 000** |
| **V. КРАТКОСРОЧНЫЕ ОБЯЗАТЕЛЬСТВА** | | | |
| Краткосрочные кредиты и займы | 610 | - | - |
| Кредиторская задолженность | 620 | 277 | 294 |
| в том числе: перед поставщиками и подрядчиками | 621 | - | - |
| перед покупателями и заказчиками | 622 | 154 | 168 |
| по расчетам с персоналом по оплате труда | 623 | 9 | 2 |
| по прочим расчетом с персоналом | 624 | 1 | - |
| по налогам и сборам | 625 | 1 | 44 |
| по социальному страхованию и обеспечению | 626 | 1 | - |
| по лизинговым платежам | 627 | - | - |
| перед прочими кредиторами | 628 | 111 | 80 |
| Задолженность перед участниками (учредителями) | 630 | - | - |
| в том числе: по выплате доходов, дивидендов | 631 | - | - |
| прочая задолженность | 632 | - | - |
| Резервы предстоящих расходов | 640 | - | - |
| Прочие краткосрочные обязательства | 650 | - | - |
| **ИТОГО по разделу V** | **690** | **277** | **294** |
| **БАЛАНС (490+590+690)** | **700** | **3 360** | **3 616** |
| Из строки 620: | | | |
| долгосрочная кредиторская задолженность | 701 | - | - |
| краткосрочная кредиторская задолженность | 702 | 277 | 294 |

| Активы и обязательства, учитываемые за балансом | Код строки | На начало года | На конец отчетного периода |
|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 |
| Арендованные (в том числе полученные в пользование, лизинг) основные средства | 001 | - | - |
| Товарно-материальные ценности, принятые на ответственное хранение | 002 | - | - |
| Материалы, принятые в переработку | 003 | - | - |
| Товары, принятые на комиссию | 004 | - | - |
| Оборудование, принятое для монтажа | 005 | - | - |
| Бланки строгой отчетности | 006 | - | - |
| Списанная в убыток задолженность неплатежеспособных дебиторов | 007 | - | - |
| Обеспечения обязательств и платежей полученные | 008 | - | - |
| Обеспечения обязательств и платежей выданные | 009 | - | - |
| Амортизационный фонд воспроизводства основных средств | 010 | - | - |
| Основные средства, сданные в аренду (лизинг) | 011 | - | - |
| Нематериальные активы, полученные в пользование | 012 | - | - |
| Амортизационный фонд воспроизводства нематериальных активов | 013 | - | - |
| Потеря стоимости основных средств | 014 | - | - |

### ОТЧЕТ О ПРИБЫЛЯХ И УБЫТКАХ с 1 января 2009 г. по 31 декабря 2009 г.

| Наименование показателей | Код строки | За аналогичный период прошлого года | За отчетный период |
|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 |
| **I. ДОХОДЫ И РАСХОДЫ ПО ВИДАМ ДЕЯТЕЛЬНОСТИ** | | | |
| Выручка от реализации товаров, продукции, работ, услуг | 010 | 101 | 101 |
| Налоги и сборы, включаемые в выручку от реализации товаров, продукции, работ, услуг | 011 | 17 | 17 |
| Выручка от реализации товаров, продукции, работ, услуг (за вычетом налогов и сборов, включаемых в выручку) (010-011) | 020 | 84 | 84 |
| Справочно: из строки 010 сумма государственной поддержки (субсидий) на покрытие разницы в ценах и тарифах | 021 | - | - |
| Себестоимость реализованных товаров, продукции, работ, услуг | 030 | 160 | 160 |
| Валовая прибыль (020-021-030) | 040 | -76 | -76 |
| Управленческие расходы | 050 | - | - |
| Расходы на реализацию | 060 | - | - |
| **ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК) от реализации товаров, продукции, работ, услуг (020-030-050-060)** | **070** | **-76** | **-76** |
| **II. ОПЕРАЦИОННЫЕ ДОХОДЫ И РАСХОДЫ** | | | |
| Операционные доходы | 080 | 88 | 88 |
| Налоги и сборы, включаемые в операционные доходы | 081 | 15 | 15 |
| Операционные доходы (за вычетом налогов и сборов, включаемых в операционные доходы) (080-081) | 090 | 73 | 73 |
| в том числе: проценты к получению | 091 | - | - |
| доходы от участия в создании (учредительстве) других организаций | 092 | - | - |
| доходы от операций с активами | 093 | 73 | 73 |
| прочие операционные доходы | 099 | - | - |
| Операционные расходы | 100 | 29 | 29 |
| в том числе: проценты к уплате | 101 | 26 | 26 |
| расходы от операций с активами | 102 | 3 | 3 |
| прочие операционные расходы | 109 | - | - |
| **ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК) от операционных доходов и расходов (090-100)** | **120** | **44** | **44** |
| **III. ВНЕРЕАЛИЗАЦИОННЫЕ ДОХОДЫ И РАСХОДЫ** | | | |
| Внереализационные доходы | 130 | - | - |
| Налоги и сборы, включаемые во внереализационные доходы | 131 | - | - |
| Внереализационные доходы (за вычетом налогов и сборов, включаемых во внереализационные доходы) (130-131) | 140 | - | - |
| Внереализационные расходы | 150 | - | - |
| **ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК) от внереализационных доходов и расходов (140-150)** | **160** | **-** | **-** |
| **ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК) (±070±120±160)** | **200** | **-32** | **-32** |
| Расходы, не учитываемые при налогообложении | 210 | - | - |
| Доходы, не учитываемые при налогообложении | 220 | - | - |
| **ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК) до налогообложения (±200+210-220)** | **240** | **-32** | **-32** |
| Налог на прибыль | 250 | - | - |
| Прочие налоги, сборы из прибыли | 260 | - | - |
| Прочие расходы и платежи из прибыли | 270 | 20 | 20 |
| **ЧИСТАЯ ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК) (200-250-260-270)** | **300** | **-52** | **-52** |
| Справочно (из строки 300): сумма предоставленной льготы по налогу на прибыль | 310 | - | - |
| Прибыль (убыток) на акцию | 320 | - | - |
| Количество прибыльных организаций / сумма прибыли | 330 | 0 / 0 | 0 / 0 |
| Количество убыточных организаций / сумма убытка | 340 | 1 / -52 | 1 / -52 |

### РАСШИФРОВКА ОТДЕЛЬНЫХ ВНЕРЕАЛИЗАЦИОННЫХ ДОХОДОВ И РАСХОДОВ

| Показатель: наименование | код | За отчетный период: доход | За отчетный период: расход | За аналогичный период предыдущего года: доход | За аналогичный период предыдущего года: расход |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 |
| Штрафы, пени и неустойки, признанные или по которым получены решения суда (арбитражного суда) об их взыскании | 350 | - | - | - | - |
| Прибыль (убыток) прошлых лет | 360 | - | - | - | - |
| Возмещение убытков, причиненных неисполнением или ненадлежащим исполнением обязательств | 370 | - | - | - | - |
| Курсовые разницы по операциям в иностранной валюте | 380 | - | - | - | - |
| Списание дебиторских и кредиторских задолженностей, по которым истек срок исковой давности | 390 | - | - | - | - |
| Прочие доходы и расходы | 400 | - | - | - | - |
| **ИТОГО** | **500** | **-** | **-** | **-** | **-** |

**Руководитель** **Аарон Гелдер**
**Главный бухгалтер** **Н.В. Сахно**
**Дата подписания: 31 марта 2010 г.**

# МЕСТНОЕ САМОУПРАВЛЕНИЕ

ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ

8 красавіка 2010 г.
№ 14 (208)


БЛІЗКАЯ ЎЛАДА

## Не спыняцца на паўдарозе

**На працягу апошніх чатырох гадоў галоўнай тэмай для Салігорскага рэгіёна было пытанне добраўпарадкавання. Яно і зразумела: на гэты час выпалі тры знамянальныя даты — 50-гадовы юбілей Салігорска (2008 год), 65-годдзе вызвалення Беларусі і 85 гадоў існавання Салігорскага раёна (2009 год). Натуральна, падрыхтоўка да любога свята пачынаецца з навядзення парадку на тэрыторыі, а Салігорску ў гэтым плане трэба было «трымаць марку» — нездарма ў 2007-м раён стаў пераможцам у рэспубліканскім спаборніцтве па добраўпарадкаванні.**

— Напачатку, чатыры гады таму, калі старшыня выканкама агучыў, якую суму нам трэба сабраць на правядзенне ўсіх запланаваных мерапрыемстваў па добраўпарадкаванні, я была перакананна, што гэта нерэальная задача, — узгадала **старшыня Салігорскага раённага Савета дэпутатаў Лідзія КЛІШЭВІЧ**. — Размова ішла аб мільярдах рублёў. Пасля ўсебаковага аналізу сітуацыі было прынята неардынарнае рашэнне — распачаць у раёне правядзенне штомесячных суботнікаў з адлічэннем пэўнай сумы ад кожнага працуючага ў спецыяльны фонд. Мера, вядома, непапулярная, затое, у выніку, за перыяд з 2007-га па верасень 2008-га сабралі каля 3 мільярдаў рублёў!

Што ж было зроблена за гэтыя грошы? Калі вы наведвалі наш горад напярэдадні юбілею, то на свае вочы пабачылі маштаб работ. На ўсіх цэнтральных вуліцах ішла масавая замена тратуарнай пліткі, бардзюраў, рамонт дарожнага пакрыцця, фарбаванне агароджаў і фасадаў дамоў. Быў упарадкаваны гарадскі Парк чатырох стыхій, распачалася рэканструкцыя вакзала. Да свайго 50-годдзя горад набыў новае аблічча. Частка грошай пайшла на добраўпарадкаванне сельсаветаў. Натуральна, з улікам маштабнасці задач, далёка не ўсё мы паспелі зрабіць за год. Многае ажыццявілі ў 2008-м, многае — у 2009-м.

***— Аднак 2009 год быў крызісным. Як гэта паўплывала на рэалізацыю праграм па добраўпарадкаванні?***

— Сапраўды, крызіс закрануў усіх. У нас выкананне бюджэту за 2009 год аказалася амаль удвая меншым у параўнанні з 2008-м. Аднак, нягледзячы на гэта, у Салігорску не былі згорнуты работы па добраўпарадкаванні, хоць яны і аказаліся не такімі маштабнымі, як раней. Мы ўсе добра разумелі, што спыняцца на паўдарозе нельга. Таму ў шмат якіх выпадках даводзілі работы па добраўпарадкаванні ў доўг (за што вельмі ўдзячны кожнай арганізацыі, хто паставіўся да сітуацыі з разуменнем і пайшоў нам насустрач). На сёння даўгі ў нас значныя — і перад дарожнікамі, і перад камунальнікамі, і перад будаўнікамі, і перад малымі прыватнымі прадпрыемствамі. Па меры магчымасці будзем іх пагашаць.

У юбілейны для раёна 2009 год шмат чаго ў плане добраўпарадкавання было зроблена ў сельскіх населеных пунктах, у тым ліку і аддаленых. Напрыклад, у гарадскім пасёлку Чырвоная Слабада (30 км ад Салігорска). Святкаванні 85-годдзя раёна прайшлі ў кожным сельскім населеным пункце. А да свята, натуральна, патрэбна было падрыхтавацца.

(Заканчэнне на 2-й стар. «МС».)

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.



## АПЕРАЦЫЯ «КААПЕРАЦЫЯ»

Якператварыць аграэкатурызм у агульнавясковы бізнэс?

**За апошнія чатыры гады колькасць аграсядзібаў у Беларусі павялічылася ў 26 разоў. У пачатку гэтага года на тэрыторыі краіны былі зарэгістраваныя 884 падобныя ўстановы, якія прынялі на адпачынак каля 70 тысяч гасцей. І разам з тым, пакуль попыт на паслугі вясковага турызму задаволены не цалкам. Агульная «ўмяшчальнасць» айчыннага рынку тут можа дасягнуць адзнакі ў паўмільёна чалавек штогод. Такі прагноз стане рэаліяй пры дзвюх істотных умовах — адсутнасці перашкод для развіцця па сутнасці новай галіны на ўзроўні райвыканкамаў і сельвыканкамаў, а таксама паступовай «кааперацыі» саміх аграсядзібаў.**

### Дзе інвестыцыі для вёскі?

Нельга спрачацца з тым, што «твар» вёскі перш-наперш будзе вызначаць сельская гаспадарка. Аднак прыклад суседніх Польшчы, Літвы, Украіны сведчыць, што малако і мяса — варыянт далёка не адзіны. Аграэкатурызм амаль не прыносіць бюджэтам «прамых» паступленняў. І ў той жа час зразумела: такім чынам у вёсках з'яўляюцца новыя і да таго ж прывабныя для моладзі працоўныя месцы. Апроч таго, стварэнне самой аграсядзібы вядзе да паступовага змянення ўсёй інфраструктуры рэгіёнаў, прыток турыстаў робіць больш запатрабаванымі краму, пошту, аптэку, банк і часта «выратоўвае» гэтыя аб'екты ад закрыцця.

— Кожны раён можа жыць за кошт дзвюх крыніц — вытворчасці на экспарт або прытоку капіталу, — кажа намеснік старшыні грамадскага савета па развіцці аграэкатурызму ў Мінскай вобласці Эдуард Вайцяховіч. — Аднак трэба пагадзіцца: наіўна меркаваць, што кожная вёска здолее выпрацаваць прадукцыю, канкурэнтаздольную на знешніх рынках. А вось шанцы прыцягнуць дзякуючы тым або іншым рэгіянальным адметнасцям турыстаў не такія і прывідныя. Прычым, кожны турыст пакіне пэўныя грошы, і гэтыя грошы будуць «працаваць» на мясцовую эканоміку.

Яшчэ адзін відавочны «плюс» — інвестыцыі ў захаванне гістарычнай спадчыны. З бюджэтным фінансаваннем аднаўлення старажытных маёнткаў і паркаў традыцыйна існавалі цяжкасці. У той жа час для многіх гаспадароў вясковых тураб'ектаў такія ўкладанні сёння падаюцца цікавымі, бо гэта — работа на патэнцыйнага кліента.

### У лес... А потым — як атрымаецца

Новы напрамак эканомікі «сельскагаспадарчых» рэгіёнаў прызнаны неабходным, больш за тое, на дзяржаўным узроўні тут вызначаны значныя меры падтрымкі. Аграсядзібы практычна вызваленыя ад падаткаабкладання, прычым не выключана, што ў найбліжэйшай будучыні такая льгота будзе дзейнічаць пры здаванні турыстам да дзесяці пакояў (сёння — да пяці пакояў).

Важны нюанс — і выгаднае крэдытаванне. Але якраз тут узнікае першая праблема. Працэдура выдачы крэдытаў атрымліваецца складанай, раз-пораз афармленне папер займае па некалькі месяцаў. За гэты час могуць змяніцца цэны на будматэрыялы і паслугі, а ў выніку, частка крэдыту па сутнасці «згарае».

Асобная гаворка пра дарогі. У сярэднім пракладка кіламетра пад'язнога шляху ацэньваецца прыкладна ў 10 мільёнаў рублёў. Для большасці гаспадароў аграсядзібаў такія выдаткі становяцца «непад'ёмнымі», адсюль адбываецца натуральнае скарачэнне турыстычнага сезона — ён абмяжоўваецца красавіком—кастрычнікам.

Не менш складаная тэма — пошук аграсядзібаў. Добра, калі вясковы тураб'ект знаходзіцца паблізу населенага пункта, нашмат горш, каля месціцца ён каля хутара або ў лесе. Тлумачэнні кшталту «пяцьсот метраў направа, кіламетр прама, а потым яшчэ паўтара — налева» сур'ёзнымі лічыць нельга, без прыдарожных паказальнікаў патрапіць на адпачынак часам нерэальна. Але кошт аднаго паказальніка можа даходзіць да 3 мільёнаў рублёў — сума зноў жа значная. Прычым выйсці з сітуацыі турысту не заўсёды ўдаецца і пры цалкам лагічным звароце да мясцовай улады — у большасці сельсаветаў ніякай інфармацыі пра аб'екты аграэкатурызму проста няма.

Таксама вострыя моманты — пытанні з тэхнічнай дакументацыяй на будаўніцтва, афармленнем зямлі, перадачай будынкаў, якія даўно нікім не выкарыстоўваюцца. Апроч таго, дзе-нідзе на роўным месцы ствараецца сітуацыя, фактычна не сумяшчальная з адпачынкам. Напрыклад, узнікае аграсядзіба, а праз нейкі час літаральна ля яе мяжы тутэйшае сельгаспрадпрыемства распачынае ўзворваць землі. Або каля самай мяжы аграсядзібы спрабуюць размясціць вальеры для трэніровак сабак.

— Можна гаварыць і пра кепскае ўзаемадзеянне з органамі мясцовай улады, — зазначае гаспадар сядзібы «Лапушка» Пухавіцкага раёна Ігар Саладуха. — Калі-нікалі тут адсутнічае паразуменне, узнікае розная трактоўка заканадаўства, з'яўляюцца нават розныя планы інфраструктуры тэрыторый. А адсюль і блытаніна: сельскі Савет можа прымаць адно, а райвыканкам — ужо супрацьлеглае рашэнне.

(Заканчэнне на 2-й стар. «МС».)

ВЫБАРЫ-2010

## АГІТАЦЫЯ І КАНКУРЭНЦЫЯ

**У Магілёўскай вобласці самы высокі ў рэгіёнах конкурс сярод кандыдатаў у дэпутаты ў сельскія Саветы — 1,8 чалавека на месца.**

Увогуле акруговыя і тэрытарыяльныя камісіі Магілёўшчыны зарэгістравалі 5796 кандыдатаў у дэпутаты. Паводле статыстыкі, на адзін дэпутацкі мандат прэтэндуе 1,86 чалавекі — гэта другое месца пасля сталіцы. Пры гэтым, за дэпутацкае крэсла ў абласным Савеце канкурыруюць 2,2 чалавека, у гарадскія Саветы — 2,4.

Сярод кандыдатаў у дэпутаты амаль трацiна — дэпутаты папярэдняга 25-га склікання. Сярод тых, хто змагаецца за дэпутацкае месца, без малога палову (49,6 працэнта) складаюць жанчыны. Моладзь да 30 гадоў — 7,8 працэнта.

У складзе кандыдатаў — 123 вылучэнцы палітычных партый. Найбольшую актыўнасць выявіла Камуністычная партыя Беларусі.

Ёсць сярод кандыдатаў у дэпутаты і 11 грамадзян Расійскай Федэрацыі: яны маюць пасведчанні на права жыхарства і права на ўдзел у выбарах.

— Цяпер ідзе агітацыйная кампанія, і справа выбарчых камісій усіх узроўняў — забяспечыць роўнасць у агітацыі ўсіх кандыдатаў у дэпутаты, — пракаментаваў **старшыня Магілёўскай абласной выбарчай камісіі Валерый БЕРАСТАЎ**. — А далей — праца саміх кандыдатаў і іх давераных асобаў. Іх справа — весці агітацыю, даносіць свае думкі да выбаршчыкаў.

**Старшыня Магілёўскага аблвыканкама Пётр РУДНІК** нагадаў, што, паводле апытання, 71,2 працэнта жыхароў вобласці выказалі давер да мясцовых органаў улады. Гэта самы высокі паказчык сярод рэгіёнаў Беларусі. Пётр Руднік лічыць галоўнай задачай 25 красавіка зноў абраць дзеяздольныя органы мясцовай улады.

**Ілона ІВАНОВА.**

## НАЙМЕНШ АКТЫЎНАЯ — МОЛАДЗЬ?

**У Брэсцкай вобласці зарэгістраваны 82 кандыдаты на 60 месцаў у абласным Савеце. У раённыя Саветы 603 прэтэндэнты будуць змагацца за 555 мандатаў. Большую актыўнасць у выбарчым працэсе праявілі жыхары гарадоў. На 107 мандатаў дэпутатаў гарсаветаў Брэста, Баранавічаў і Пінска зарэгістравана 154 кандыдаты. У некаторых акругах Брэста за дэпутацкае месца змагаецца аж 4 кандыдаты. У сямі акругах ёсць па тры прэтэндэнты. Разам з тым, у адзінаццаці акругах абласнога цэнтра выбары будуць безальтэрнатыўнымі.**

Выбарчы працэс, як і раней, выявіў невялікую актыўнасць палітычных партый у вобласці. У Брэсце на 40 дэпутацкіх месцаў зарэгістравана 80 кандыдатаў. З іх 26 вылучаны палітычнымі партыямі. Лідзіруе БСДП «Грамада» — з іхніх шэрагаў выйшла 11 кандыдатаў. У цэлым жа па вобласці партыйных кандыдатаў усяго два працэнты. 34,6 працэнта вылучаны працоўнымі калектывамі, крыху больш за 60 працэнтаў — шляхам збору подпісаў. Варта адзначыць, што больш за палову цяперашніх кандыдатаў (каля 54 працэнтаў) складаюць дэпутаты дзейнага склікання. Маладых людзей да 30 гадоў у гэтых спісах менш за 5 працэнтаў.

Як сказаў нашаму карэспандэнту **старшыня абласной выбарчай камісіі Анатоль КІСЯЛЁЎ**, поўным ходам ідзе агітацыйная работа. Кандыдаты ў абласны Савет выкарысталі сваё права выступлення па радыё, і цяпер у выбаршчыкаў ёсць магчымасць штодня знаёміцца з перадвыбарнымі праграмамі прэтэндэнтаў. Праходзяць сустрэчы ў працоўных калектывах, па месцы жыхарства грамадзян. Тыповай сярод сельскіх раёнаў выглядае сітуацыя ў Пружанскай выбарчай камісіі, якую ўзначальвае Анатоль Лаптановіч. Паводле слоў Анатоля Мікалаевіча, на 36 месцаў раённага Савета зарэгістравана 37 кандыдатаў. Цікава, што на адзіную альтэрнатыўную акругу раёна кандыдатаў вылучылі працоўныя калектывы. Цяпер у мясцовай друкарні выпрацоўваюцца плакаты, лістоўкі на сродкі, выдзеленыя для агітацыі. Складзены графік выступленняў кандыдатаў перад выбаршчыкамі.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**

(Працяг тэмы на 2-й стар. «МС».)

ПЕРШЫЯ ЛАСТАЎКІ

## У знак адкрытасці

**За мясцовымі выбарамі ўпершыню будуць назіраць замежныя дыпламаты**

*На сёння ў «генеральным штабе» электаральнай кампаніі — Цэнтрвыбаркаме — тры дзясяткі заявак ад прадстаўнікоў дыпмісій 18 краін з трох кантынентаў — Еўропы, Азіі, Паўночнай Амерыкі. Жаданне назіраць за выбарамі ў асноўны дзень галасавання праяўляюць дыпламаты з Арменіі, Венгрыі, Вялікабрытаніі, Казахстана, Канады, Кіргізіі, Латвіі, Літвы, Нідэрландаў, Палесціны, Польшчы, Расіі, Румыніі, Славакіі, Таджыкістана, Фінляндыі, Францыі, Чэхіі.*

— Аднак час для падачы заявак яшчэ ёсць, мяркую, іх будзе больш, — кажа **сакратар Цэнтральнай камісіі па выбарах і правядзенні рэспубліканскіх рэферэндумаў Мікалай ЛАЗАВІК**.

Паводле яго чаканняў, колькасць заявак падвоіцца. А часу і сапраўды хапае: акрэдытацыйныя пасведчанні плануецца выдаць дыпламатам да канца другой дэкады красавіка. Тэрміны абумоўленыя тым, што назіранне кароткатэрміновае — яно закранае толькі асноўны дзень выбараў, 25 красавіка.

Дагэтуль міжнародныя назіральнікі сачылі толькі за прэзідэнцкімі, парламенцкімі выбарамі і агульнарэспубліканскімі рэферэндумамі ў Беларусі. Ды наогул у свеце не практыкуецца запрашэнне міжнародных назіральнікаў на лакальныя выбары. Таму сам факт іх удзелу ў мясцовай электаральнай кампаніі — па сутнасці беспрэцэдэнтны.

— Тым самым Беларусь дэманструе сваю гатоўнасць да больш блізкага ўзаемадзеяння з еўраструктурамі, Еўрасаюзам, АБСЕ, — падкрэслівае Мікалай Лазавік. — Наданне права дыпламатам здзяйсняць назіранне за выбарамі ў мясцовыя Саветы дэпутатаў — гэта крок насустрач еўрапейскім дзяржавам, структурам, якія дэманструе нашу адкрытасць, імкненне працаваць ва ўзаемадзеянні. Мы гатовыя паказаць, што нашы выбары адкрытыя, транспарэнтныя, свабодныя і дэмакратычныя.

Апроч замежнікаў сачыць за мясцовымі выбарамі будуць, натуральна, і нацыянальныя назіральнікі. Іх ужо акрэдытавана больш за паўтары тысячы. Аднак у ЦВК чакаюць, што на момант выбараў гэта лічба ўдзесяцярыцца. Назіраць за выбарамі маюць права прадстаўнікі палітычных партый, працоўных калектываў, грамадзяне шляхам падачы заяў, давераныя асобы кандыдатаў у дэпутаты.

**Ала МАЧАЛАВА.**



Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

НЯПРОСТАЯ ТЭМА

## ДВА Ў АДНЫМ

### Тэорыя і практыка аб'яднання

**«Тэму» адміністрацыйна-тэрытарыяльнай аптымізацыі сельсаветы «праходзілі» неаднойчы. Іх аб'ядноўвалі, падзялялі, далучалі, узбуйнялі і г.д. І ніколі гэтыя працэсы не былі простымі, таму што непасрэдна закраналі жыццё тэрыторый, а значыць, і людзей.**

У апошнія гады пра аптымізацыю тэрытарыяльнага падзелу загаварылі зноў. На ўзроўні Нацыянальнай акадэміі навук была вызначана аптымальная (у эканамічным плане) колькасць насельніцтва, якая павінна пражываць на тэрыторыі таго ці іншага сельсавета — а менавіта 2—5 тысяч чалавек. Сельсаветы з меншай колькасцю насельніцтва — скажам, ад 500 да 1000 чалавек — рэкамендавана было (з мэтай аптымізацыі расходавання дзяржаўных сродкаў) далучаць да больш буйных адміністрацыйна-тэрытарыяльных адзінак. Што з гэтага атрымалася?

Там, дзе кіраўнікі мясцовай улады не пабеглі «паперадзе паравоза», а падышлі да вырашэння гэтай праблемы ўдумліва і адказна, узважылі ўсе «за» і «супраць», прынялі папярэднія меры, прадугледзелі магчымыя «збоі ў сістэме» — аптымізацыя тэрыторый прайшла з найменшымі стратамі для насельніцтва. Там жа, дзе не ўлічылі (ці не захацелі ўлічваць) пажаданні людзей, не звярнулі ўвагі на «дробныя пытанні» — арганізацыю руху транспарту, падвоз дзяцей, графік работы крамаў, ФАПаў і да т.п. — наламалі нямала дроў...

Аднак ёсць у гэтага «медаля» і іншы бок. Часам насельніцтва малаколькаснага сельсавета зусім не супраць аб'яднацца з больш паспяховай у эканамічным плане тэрыторыяй — бо людзі спадзяюцца, што ўсе даброты зараз жа «аўтаматычна» з'явяцца і ў іх. Насамрэч, матэрыяльна-фінансавая база аб'яднаных сельсаветаў застаецца практычна на ранейшым узроўні. Так што чакаць асаблівых цудаў жыхарам далучаных тэрыторый не даводзіцца. Задача ў старшыні сельскага Савета — паспець вырашыць хоць бы першачарговыя пытанні: з асвятленнем вуліц, якасцю пітной вады, падсыпкай дарог, рамонтам водаправодаў.

### У «спадчыну» — праблемы...

Менавіта на адсутнасць нармальнага вулічнага асвятлення і дрэнную арганізацыю вывазу смецця паскардзіліся жыхары вёскі Мглё, якая яшчэ на пачатку года адносілася да Юр'еўскага сельсавета Смалявіцкага раёна. Але ўжо ў лютым Юр'еўскі сельсавет быў далучаны да Усяжскага (з цэнтрам у пасёлку Усяж).

З пункту гледжання добраўпарадкавання былому Юр'еўскаму сельсавету ў свой час не надта пашанцавала. Па-першае, вялікая тэрыторыя, па-другое, «раскіданыя», аддаленыя адна ад адной маленькія вёскі.

— Усяжскі сельсавет — я маю на ўвазе яго тэрыторыю да аб'яднання — у гэтым сэнсе меў перавагі. Ён і да райцэнтра знаходзіўся бліжэй, і населеныя пункты тут больш буйныя, і размешчаны яны кампактна, — расказвае **старшыня Усяжскага сельскага Савета дэпутатаў Уладзімір ЛЮТКО**. — Ледзь якія высокія госці ці праверка — іх адразу сюды. Хочаш не хочаш, а парадак наводзіць трэба было... А Юр'еўскі сельсавет заставаўся як бы ў баку ад добраўпарадкавання. Да ўзроўню аграгарадка падцягнулі толькі саму вёску Юр'ева, а ўсе астатнія населеныя пункты якімі былі, такімі і засталіся... Што мог зрабіць Юр'еўскі сельвыканкам, дзе з улікам старшыні працавала тры чалавекі? З мінімальнымі сродкамі на добраўпарадкаванне і адсутнасцю тэхнікі? Вось і атрымалі мы ў «спадчыну» пэўныя праблемы...

### «Бяскроўнае» далучэнне

Пытанне па далучэнні да Усяжскага сельсавета тэрыторый Юр'еўскага і часткова Прылепскага сельсаветаў пачалі абмяркоўваць у канцы мінулага года. Былі праведзены сесіі спачатку на першасным узроўні, потым сваё слова сказалі дэпутаты Смалявіцкага раённага Савета, далей — Мінскага абласнога. Насельніцтва крыху насцярожылася, але, сцвярджае Уладзімір Лютко, жыхары Юр'еўскай зоны ўспрынялі навіну амаль спакойна. Людзям усё патлумачылі,



Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

Старшыня Усяжскага сельскага Савета дэпутатаў Уладзімір ЛЮТКО.

і яны паставіліся да аб'яднання з разуменнем.

У в. Юр'ева пакінулі спецыяліста 2-й катэгорыі, якая адпрацавала там больш за дваццаць гадоў. Прыём грамадзян застаўся штодзённым, з 8 да 17 гадзін (з перапынкам на абед).

— Людзі, зразумела, цікавіліся, што ды як. Мы тлумачылі, што за кожнай драбязой ехаць сюды, у пасёлак Усяж, зусім не абавязкова. Частку пытанняў — скажам, па вулічным асвятленні ці падсыпцы дарогі — можна вырашыць і па тэлефоне. Ці вось днямі вяскоўцы папрасілі завезці на могілкі пясок да Радаўніцы... Калі даведку выдаць — гэта зробіць спецыяліст на месцы, у яе ўжо і пячатка ёсць. Землеўпарадчык прыязджае да нас кожную сераду, будзе выязджаць ён і ў Юр'ева — грамадзяніну толькі трэба загадзя запісацца і знайсці транспарт, каб завезці яго на свой участак... Пакуль з гэтым праблем не ўзнікае і людзі не наракаюць.

(Заканчэнне на 2-й стар. «МС».)


## ЗАО «ДЕЛЬТА БАНК»

*220036, г. Минск, ул. Розы Люксембург, 95.*
*Тел. 256 19 08, www.deltabank.by*

### БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС на 1 апреля 2010 г.

(в миллионах белорусских рублей)

| № п/п | Наименование статьи | Символ | 01.04.2010 | 01.04.2009 |
|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 |
| 1 | **АКТИВЫ** | | | |
| 2 | Денежные средства | 1101 | 4 362,5 | 3 195,1 |
| 3 | Средства в Национальном банке | 1102 | 1 801,6 | 2 109,6 |
| 4 | Ценные бумаги: | 1103 | - | - |
| | для торговли | 11031 | - | - |
| | удерживаемые до погашения | 11032 | - | - |
| | в наличии для продажи | 11033 | - | - |
| 5 | Кредиты и другие средства в банках | 1105 | 98 036,4 | 23 293,0 |
| 6 | Кредиты клиентам | 1106 | 81 672,7 | 60 596,1 |
| 7 | Долгосрочные финансовые вложения | 1107 | 703,4 | 703,4 |
| 8 | Основные средства и нематериальные активы | 1108 | 9 196,8 | 10 341,1 |
| 9 | Прочие активы | 1109 | 8 567,6 | 6 007,2 |
| 10 | ИТОГО активы | 110 | 204 341,0 | 106 245,5 |
| 11 | **ОБЯЗАТЕЛЬСТВА** | | | |
| 12 | Средства Национального банка | 1202 | 0,1 | - |
| 13 | Кредиты и другие средства банков | 1205 | 36 521,6 | 11 557,8 |
| 14 | Средства клиентов | 1206 | 91 329,9 | 25 220,1 |
| 15 | Ценные бумаги, выпущенные банком | 1208 | 1 218,4 | - |
| 16 | Прочие обязательства | 1209 | 701,6 | 2 717,9 |
| 17 | ВСЕГО обязательства | 120 | 129 771,6 | 39 495,8 |
| 18 | **КАПИТАЛ** | | | |
| 19 | Уставный фонд | 1211 | 72 200,0 | 64 000,0 |
| 20 | Эмиссионный доход | 1212 | - | - |
| 21 | Резервный фонд | 1213 | 739,6 | 260,0 |
| 22 | Накопленная прибыль | 1214 | 1 253,0 | 2 328,9 |
| 23 | Фонд переоценки статей баланса | 1215 | 376,8 | 160,8 |
| 24 | ВСЕГО капитал | 121 | 74 569,4 | 66 749,7 |
| 25 | ИТОГО обязательства и капитал | 12 | 204 341,0 | 106 245,5 |
| 26 | **ТРЕБОВАНИЯ И ОБЯЗАТЕЛЬСТВА НА ВНЕБАЛАНСОВЫХ СЧЕТАХ** | | | |
| 27 | Требования | 1301 | 126 637,6 | 45 323,5 |
| 28 | Обязательства | 1302 | 102 242,5 | 38 507,4 |

### ОТЧЕТ О ПРИБЫЛИ И УБЫТКАХ на 1 апреля 2010 г.

(в миллионах белорусских рублей)

| № п/п | Наименование статьи | Символ | 01.04.2010 | 01.04.2009 |
|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 |
| 1 | Процентные доходы | 2011 | 3 249,7 | 2 997,0 |
| 2 | Процентные расходы | 2012 | 3 607,6 | 786,4 |
| 3 | Чистые процентные доходы | 201 | (-357,9) | 2 210,6 |
| 4 | Комиссионные доходы | 2021 | 9 853,2 | 7 386,1 |
| 5 | Комиссионные расходы | 2022 | 102,1 | 78,1 |
| 6 | Чистые комиссионные доходы | 202 | 9 751,1 | 7 308,0 |
| 7 | Чистый доход по операциям с иностранной валютой | 203 | (-1 436,0) | (-671,1) |
| 8 | Чистый доход по операциям с ценными бумагами | 204 | - | - |
| 9 | Доход в форме дивидендов | 205 | - | - |
| 10 | Чистые отчисления в резервы | 206 | 1 066,6 | 440,1 |
| 11 | Прочие доходы | 207 | 2 846,3 | 2 874,5 |
| 12 | Операционные расходы | 208 | 7 427,5 | 8 361,9 |
| 13 | Прочие расходы | 209 | 744,3 | 396,8 |
| 14 | Налог на прибыль | 210 | 312,1 | 448,2 |
| 15 | ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК) | 2 | 1 253,0 | 2 075,0 |

**И.о. Председателя Правления** — **А.В. Бабицкая**
**Главный бухгалтер** — **С.И. Миркевич**
**Дата подписания «05» апреля 2010 г.**

Лицензия НБ РБ на осуществление банковской деятельности № 27 от 01.09.2007 г. УНП 807000015.

**ВЫБАРЫ-2010**

**(Заканчэнне. Пачатак тэмы на 1-й стар. «МС».)**

## «ДАХОДАЎ І МАЁМАСЦІ НЯМА»

**Чатыры прэтэндэнты на дэпутацкі мандат зарэгістраваныя ў Гродне па Індурскай выбарчай акрузе № 22.**

За галасы выбаршчыкаў пазмагаюцца старшы дзяржаўны падатковы інспектар, беспартыйны Аляксандр Барташ, вартаўнік жыллёва-эксплуатацыйнай службы, член партыі БНФ Мікалай Лемяноўскі, выкладчык электратэхнічнага каледжа, член Аб'яднанай грамадзянскай партыі Аляксандр Пагуляеў і дырэктар упраўлення «Гроднаміжрайгаз», беспартыйны Юрый Саўцоў.

У дзевяці выбарчых акругах — па тры кандыдаты ў дэпутаты Гродзенскага гарадскога Савета, у васьмі — па два. А вось ў дванаццаці акругах канкурэнцыі не будзе.

Дарэчы, у мясцовай прэсе можна азнаёміцца са звесткамі аб даходах і маёмасці кандыдатаў у гарсавет. Прычым у дачыненні да аднаго з зарэгістраваных прэтэндэнтаў адзначана, што «даходу за 2009 год і маёмасці няма».

Што датычыцца персаналій, то сярод кандыдатаў і тыя, хто ўжо мае «стаж» работы ў гарадскім Савеце, і навічкі.

**Барыс ПРАКОПЧЫК.**

## КАНДЫДАТЫ АД АПАЗІЦЫІ ЗДЫМАЮЦЬ СВАІХ ВЫЛУЧЭНЦАЎ

**За два з паловай тыдні да пачатку выбараў у мясцовыя Саветы дэпутатаў на Гомельшчыне не адзначаецца вялікай актывізацыі ў перадвыбарнай агітацыі сярод прэтэндэнтаў, адзначае намеснік старшыні Гомельскай абласной выбарчай камісіі Аляксандр УСАЎ.**

— Графікі сустрэч на месцах распрацаваныя, кандыдаты ў дэпутаты сустракаюцца са сваімі выбаршчыкамі ў працоўных калектывах. А вось лістовак пакуль нябачна нідзе. Усе сыходзяць з практыкі, што расклейваць такога роду агітацыйныя матэрыялы трэба ў апошні момант. Сродкі на гэтыя мэты выдзелены невялікія — пры вылучэнні ў абласны Савет — 280 тысяч, і таму шмат лістовак на такія грошы не надрукуеш. Звычайна кандыдат заказвае 2-2,5 тысячы экзэмпляраў. Думаю, на апошнім тыдні перад выбарамі друкаваная агітацыя з'явіцца паўсюль. Партыі сёлета праявілі куды большую актыўнасць у выбарчай кампаніі ў мясцовыя Саветы. Асаблівасцю Гомельшчыны спачатку перадвыбарнай кампаніі было тое, што ў вобласці, як нідзе, была вялікая ўдзельная вага прадстаўнікоў ад партый і грамадскіх аб'яднанняў. У першую чаргу тых, якія апазіцыянуюць сябе да дзяржавы — амаль што 1/3 ад усіх у краіне. А цяпер кандыдаты ў дэпутаты ад апазіцыйных партый пачалі разам здымацца з перадвыбарнай барацьбы. Іх партыі здымаюць — яны маюць на гэта права. Матывуюць гэта рознымі, у многім надуманымі, палітычнымі прычынамі — што іх назіральнікаў не ўключылі ў склад выбарчых камісій, што не могуць адсачыць аб'ектыўнасць падліку галасоў, — сказаў Аляксандр Усаў.

На гэты момант 19 кандыдатаў ў дэпутаты, якія прэтэндавалі на месца ў абласным Савеце, знялі свае кандыдатуры. Спачатку іх было 110, цяпер застаўся 91. Па горадзе Гомелі быў зарэгістраваны 81 кандыдат у дэпутаты, цяпер засталося 58 чалавек. У многіх акругах ёсць толькі адзін кандыдат на месца ў выбарчых органах. Так што канкурэнцыі вялікай няма. Самы вялікі конкурс па абласным савеце назіраецца ў трох акругах Гомеля — па 3 чалавекі на месца. У Мазыры і Жлобіне — па 2.

Намеснік старшыні абласной выбарчай камісіі Аляксандр Усаў лічыць, што, нягледзячы на адмену парога яўкі, трэба растлумачваць людзям важнасць і значнасць выбараў, бо мясцовыя Саветы — аснова для самакіравання.

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.**

## З БЕСПРАЦОЎНЫХ — У АБЛАСНЫ САВЕТ

**Сёлета на выбарах у Віцебскай вобласці кандыдаты змагаюцца за 3530 дэпутацкіх мандатаў. На іх прэтэндуюць 3820 кандыдатаў.**

Як паведаміла **член Віцебскай абласной выбарчай камісіі Людміла КАПРАНАВА**, самы высокі конкурс сярод ахвотных стаць дэпутатамі абласнога Савета. На 60 мандатаў прэтэндуюць 114 чалавек. Конкурс — 1,9 чалавека на месца. Для параўнання, у сельскія Саветы — у сярэднім 1,1 працэнты. Сярод кандыдатаў у Віцебскі абласны Савет — адзін грамадзянін Расіі. Цікава, што на дэпутацтва абласнога ўзроўню прэтэндуюць 11 беспрацоўных.

Па апошняй інфармацыі, тры зарэгістраваныя кандыдаты, якія захацелі стаць дэпутатамі абласнога Савета, знялі свае кандыдатуры. Аднаго кандыдата ў абласны Савет, пасля разгляду яго скаргі наконт адмовы ў рэгістрацыі ў кандыдаты, зарэгістравалі.

Наконт партыйцаў. Сярод кандыдатаў у дэпутаты мясцовых Саветаў былі зарэгістраваныя 67 прадстаўнікоў ад пяці партый: Беларускай партыі левых «Справядлівы свет», Беларускай сацыял-дэмакратычнай партыі «Грамада», КПБ, Аб'яднанай грамадзянскай партыі і партыі БНФ. З іх найбольш актыўныя члены Камуністычнай партыі Беларусі — 26 кандыдатаў.

Дастаткова вялікую актыўнасць праяўляе «слабы» пол. Сёлета на выбарах у мясцовыя Саветы дэпутатаў больш за 45 працэнтаў кандыдатаў — жанчыны. Маладых грамадзян — ва ўзросце да 30 гадоў — 6,5 працэнта. Прадстаўнікоў дзяржаўных органаў толькі 12,4 працэнта.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

# ДВА Ў АДНЫМ

## Тэорыя і практыка аб'яднання

**(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «МС».)**

### І сам не гам...

З чым у Юр'ева сапраўды ёсць пытанні, дык гэта са зборам і вывазам смецця і бытавых адходаў. На Усяжскай тэрыторыі, расказвае Уладзімір Лютко, такая вострая для многіх сельсаветаў праблема была вырашана даўно, паколькі тут знаходзяцца два ўчасткі раённай ЖКГ і сякая-такая тэхніка.

— Са свайго боку, мы дапамаглі ім заключыць дагаворы з насельніцтвам, і цяпер кожны год, пачынаючы з красавіка, два разы на тыдзень вывозіцца смецце. Але гэта датычыцца вёсак, якія адносяцца да нашай ранейшай тэрыторыі. А вось у Юр'еўскай зоне гэта пытанне вырашана не было.

І сёння яе жыхары (тая ж самая вёска Мглё) просяць, каб машына прыходзіла да іх хоць бы раз на месяц.

У прынцыпе, у Смалявіцкім раёне пытанні з вывазам смецця павінна вырашаць раённая ЖКГ. Калі ў яе не хапае ўласных магутнасцяў (тэхнікі ці працоўнай сілы), ЖКГ можа спакойна заключыць дагавор з якім-небудзь іншым прадпрыемствам, дзе тэхнікі дастаткова (напрыклад, з торфа-брыкетным заводам «Усяж»), і яно задзейнічае ва ўборцы тэрыторыі свой аўтапарк і сваіх вадзіцеляў. Безумоўна, не за «дзякуй», а за пэўную плату... Але такая пастаноўка пытання не вельмі падабаецца раённым камунальнікам, якім не хочацца губляць стабільную крыніцу даходаў і перадаваць вываз смецця па Юравіцкай зоне ў «чужыя рукі».

— Застаецца разлічваць, што на ЖКГ «націснуць» зверху. Тым больш што з сакавіка ў раённага жылкамунгаса змяніўся кіраўнік, а гэта заўсёды мае на ўвазе пэўныя перамены. Мы спадзяёмся, яны будуць да лепшага, — кажа Уладзімір Лютко.

### Хто «запаліць» святло?

У вёсках Мглё, Хаценава, ды і ў тым жа Юр'еве не перапыняюцца нараканні на адсутнасць нармальнага вулічнага асвятлення. І апоры стаяць, і лініі электраперадач у наяўнасці. Не хапае толькі... лямпачак, якія трэба проста ўкруціць.

— Гэта людзям здаецца, што «проста», — тлумачыць старшыня Усяжскага сельскага Савета. — Насамрэч кожны выклік брыгады па рамонце вулічнага асвятлення аплачвае сельвыканкам, ён жа закупляе лямпачкі. Працуе служба раённых электрасетак толькі па нашых заяўках, а па сваёй ініцыятыве яны нічога ўкручваць не будуць. Ёсць яшчэ так званае «рэгламентнае абслугоўванне», якое мы не аплачваем, але падчас такога выезду брыгада РЭС вырашае зусім іншыя пытанні: ліквідуе абрыў правадоў, уцечку электраэнергіі і да т.п.

У сакавіку Усяжскі сельвыканкам аплаціў РЭСу тры выезды (адзін «выезд» — гэта калі брыгада робіць рамонты па некалькіх заяўках на працягу дня). Тры дні такой працы каштавалі сельвыканкаму 1 мільён 600 тысяч рублёў.

— Жыхароў вёскі Мглё мы ўжо ўнеслі ў спіс заяўнікаў. Думаю, у самым хуткім часе, калі назбіраецца пэўная колькасць заявак, будзем выклікаць брыгаду РЭС.

Да таго ж, кожны год сельвыканкам нацэльваюць на эканомію электраэнергіі. Летась было прынята рашэнне райвыканкама аб эканоміі вулічнага асвятлення не менш чым на 50 працэнтаў. Інакш кажучы, ліхтары застануцца толькі на ўездзе і выездзе з вёскі, а таксама каля аб'ектаў сацыяльнай сферы. Так што заяўкі накшталт «чаму ля хаты Іванаўны лямпачка гарыць, а ля маёй не гарыць?» у сельвыканкаме не разглядаюцца.

* * *

— Паступова большасць вострых пытанняў па вёсках былога Юр'еўскага сельсавета будзе вырашана, як яны былі вырашаны ў свой час у нас, — запэўніў Уладзімір Лютко. — Правядзём там сход грамадзян, прывязем раённае начальства, ды і далей будзем рэгулярна сустракацца з насельніцтвам. Праблемы ж там не толькі з вулічным асвятленнем і вывазам смецця. Не ўсё «гладка» з водаправоднай сеткай, з калодзежамі, з уласнымі падсобнымі гаспадаркамі, з дарогамі... Сёлета ў сакавіку валявым рашэннем аблвыканкама вясковыя дарогі былі нарэшце перададзеныя на баланс спецыялізаваных арганізацый. Перадаць перадалі, але людзі як тэлефанавалі ў сельскі Савет, так і тэлефануюць — ну, не хапае пакуль што ў дарожнікаў уласных магутнасцяў і сродкаў, тэхніка знасілася... А ездзіць па адносна нармальных дарогах людзям хочацца сёння... Будзем разбірацца і з дапамогай уласным падсобным гаспадаркам. Я не выключаю, што кіраўнік сельгаспрадпрыемства можа некаму адмовіць у такой дапамозе, але трэба разбірацца па кожным канкрэтным выпадку: чаму? Хто тут недапрацаваў? Кіраўнік СВК? Старшыня сельвыканкама? Такія пытанні ўвогуле не павінны «выходзіць» за межы сельсавета. Мясцовая ўлада і кіраўніцтва СВК павінны ўмець дамаўляцца. Бо калі не дамовімся і пытанне выйдзе з-пад кантролю, абодва атрымаем «на арэхі» — і ад людзей, і ад вышэйшай улады...

**Наталля КАРПЕНКА,**
*Смалявіцкі раён.*

# АПЕРАЦЫЯ «КААПЕРАЦЫЯ»

**(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «МС».)**

### Адзін дасужы, ды не дужы

Практыка апошніх гадоў паказала, што аграэкатурызм можа прыносіць стабільны даход. Але трэба адзначыць і іншае: далёка не кожны з зарэгістраваных аб'ектаў сельскага адпачынку сапраўды працуе. І прычына не толькі ў «штучных бар'ерах». Бо хтосьці з гаспадароў «дамкоў у вёсцы» элементарна не разлічыў свае сілы. А хтосьці не змог прапанаваць цікавыя паслугі. Стандартнай формулы «абед — лазня — ложак» сёння ўжо недастаткова, айчыннаму і замежнаму турысту хочацца большага.

— Ідэальны варыянт, калі госць аграсядзібы можа атрымаць цэлы комплекс забаў: анімацыйную праграму, адметныя нацыянальныя стравы, экскурсію па гістарычных мясцінах рэгіёна, паход па наваколлі, паездку ў кінатэатр ці ў музей, рыбалку, паляванне, валейбол, футбол ці лыжы, — адзначае **намеснік начальніка ўпраўлення фізкультуры, спорту і турызму Мінаблвыканкама Алена БРОК**. — Аднак таксама зразумела: прапанаваць «усё і адразу» аднаму гаспадару не пад сілу. Каб мець перспектывы, уладальнікі сядзібаў павінны не канкурыраваць паміж сабой, а аб'ядноўвацца — прынамсі, у межах свайго раёна або сельсавета.

Тое, што аграэкатурызм можа стаць агульнавясковым бізнэсам, ужо пацвердзілася ва Украіне. Спробы аб'яднання робяцца і ў нас, скажам, вядзецца работа над стварэннем турыстычнай зоны ў Гомельскім Палессі. Сутнасць тут простая: асобныя сядзібы вызначаюць для сябе пэўную спецыялізацыю, а потым кааперуюцца і прымаюць гасцей па чарзе. У сваю ж чаргу турыст атрымлівае магчымасць выбару: дзе, колькі і як правесці свой час. Прычым, сама па сабе магчымасць выбару дазваляе павялічыць працягласць адпачынку і, адпаведна, колькасць грошай у рэгіёне. Бо пакуль той жа тэрмін знаходжання на аграсядзібах застаецца нязначным — як правіла, ён не перавышае 2-3 дні.

— Яшчэ адзін рэзерв для сядзібаў — больш шчыльнае супрацоўніцтва з турфірмамі, — заўважае Алена Брок. — Сапраўды, ім трэба адлічваць пэўны працэнт, але па-іншаму разлічваць на поспех цяжка. На жаль, ёсць шмат вельмі падобных прыкладаў: спачатку аграсядзіба выходзіць на турфірму, але пасля з'яўлення першых наведвальнікаў ад яе паслуг адмаўляецца. І ў рэшце рэшт справа пакрысе «замірае».

**Сяргей ГРЫБ.**
*Валожынскі раён.*

# Не спыняцца на паўдарозе

**(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «МС».)**

Асаблівая ўвага надавалася стану прыватных падворкаў. Мы тлумачылі, што дапамагчы пажылым навесці парадак ля хаты павінны іх дзеці і больш маладыя сваякі. Адзінокім нашым пенсіянерам дапамагалі школы, сацыяльныя службы, работнікі ЖКГ, сельскія Саветы. За апошнія чатыры гады ў раёне было знесена каля 500 старых будынкаў. Сёлета плануецца знос яшчэ амаль сотні такіх дамоў.

***— А ці праводзілі вы летась штомесячныя суботнікі?***

— Праводзілі. Людзі самі выступілі з ініцыятывай — пакінуць штомесячныя суботнікі і адлічваць сродкі на будаўніцтва праваслаўнага храма. Пакуль што ў Салігорску дзейнічае адна невялікая царква, адкрытая ў 2000 годзе. З кастрычніка 2008-га па 1 сакавіка 2010 года жыхары раёна ахвяравалі на храм 2,4 мільярда рублёў. Сёлета распачнуцца работы па яго будаўніцтве.

***— Калі адлічэнні ад суботнікаў ішлі на храм, за якія сродкі летась праводзіліся работы па добраўпарадкаванні?***

— Як і ўсюды, у нас за кожнай арганізацыяй, за кожнай навучальнай установай замацавана пэўная тэрыторыя (і ў горадзе, і ў сельскіх населеных пунктах). І першыя памочнікі па навядзенні парадку — гэта школы. Толькі ў самім горадзе ў нас іх 12, плюс 4 каледжы і ліцэі. Вырашаць пытанні добраўпарадкавання нам дапамагаюць мясцовыя прадпрыемствы, прадпрымальнікі. Нейкія работы яны праводзяць бясплатна, выдаткоўваюць спецыялізаваную тэхніку, аказваюць спонсарскую падтрымку. Напрыклад, апошнія 2 гады мы актыўна ўпарадкоўваем усе пахаванні і помнікі Вялікай Айчыннай вайны. На рэканструкцыю брацкай магілы ахвяраў Вялікай Айчыннай вайны на тэрыторыі Хорастаўскага сельсавета патрэбна 18 мільёнаў рублёў. Выдаткаваць такія сродкі з бюджэту ў нас не атрымаецца. Наш мясцовы прадпрымальнік, які мае прадпрыемства па аказанні рытуальных паслуг і можа выканаць усе неабходныя задачы, зрабіў нам 50-працэнтную зніжку. Неабходна знайсці 9 мільёнаў. Дзе мы будзем шукаць такія грошы? Спадзяёмся на спонсарскую дапамогу. Магчыма, знойдзем жывых сваякоў тых, хто пахаваны ў гэтай брацкай магіле. Прыцягнем іх паўдзельнічаць рублём у добраўпарадкаванні кургана.

***— А можна лічыць, што ў раёне ўжо вырашаны асноўныя праблемы добраўпарадкавання?***

— На жаль, не, хоць станоўчыя вынікі відавочныя. Напрыклад, калі я вылучалася ў 25-м скліканні, мае выбаршчыкі ўзнімалі пытанні добраўпарадкавання дваровых тэрыторый, дарог, тратуараў, асвятлення ў дварах. Цяпер можна сказаць, што ўсе гэтыя пажаданні па маёй 9-й акрузе практычна выкананы. На сёння засталося ўпарадкаваць толькі адзін двор.

Я разумею, што кожнаму асобнаму гараджаніну нецікава, што зроблена ў дваровай тэрыторыі на суседняй вуліцы. Ён хоча, каб у яго двары было ўсё прыведзена ў парадак. Аднак я хацела б заклікаць саміх жыхароў не заставацца ўбаку. Памятаю, у 2008 годзе разам з навучэнцамі ліцэя № 72 мы завяршалі добраўпарадкаванне зялёных зонаў унутрыдваровых тэрыторый па маёй выбарчай акрузе. Дзякуй тым, хто выходзіў са сваіх дамоў нам дапамагаць. Але было і так, што мы сёння ўскапалі, пасадзілі траву і кветкі, назаўтра прыйшлі, а праз свежавысаджаную зялёную зону ўжо сцяжынка пратаптаная.

Праблем з добраўпарадкаваннем яшчэ хапае. Напрыклад, мы атрымалі калектыўны зварот жыхароў вуліцы Паркавай, 14, якія скардзяцца на нездавальняючы стан сістэмы ацяплення, на неўпарадкаваную дваровую тэрыторыю, адсутнасць месцаў для паркоўкі, абсталяваных дзіцячых пляцовак і інш. І такія скаргі — не рэдкасць. У нашым горадзе ў асноўным буйнапанэльная жылая забудова, з тыпавымі дамамі і прыдамавымі тэрыторыямі. Трэба разумець, што мы не можам вырашыць усе пытанні адразу, галоўная прычына банальная — недахоп сродкаў. Што датычыцца канкрэтна сітуацыі па Паркавай, 14 — грунтоўныя планавыя работы там распачнуцца ў 2011-м.

Проста пакласці новую тратуарную плітку — гэта самае лёгкае, але калі ўжо ўзяліся за гэта, то трэба правесці работы ў комплексе, замяніць падземныя камунікацыі, пашырыць паркавачную зону, абсталяваць дзіцячыя пляцоўкі.

***— З якімі пытаннямі, акрамя добраўпарадкавання, звярталіся выбаршчыкі да сваіх раённых дэпутатаў?***

— Апроч праблем з добраўпарадкаваннем і скаргаў на работу жыллёва-камунальных службаў, людзі прыходзяць з просьбай дапамагчы з працаўладкаваннем. Рэч у тым, што сёння ў нас асноўная маса жыхароў горада і прыгарада хацела б працаваць на аб'яднанні «Беларуськалій». Але прадпрыемства прымае да сябе толькі высокакваліфікаваных спецыялістаў, якія маюць профільную адукацыю. Акрамя «Беларуськалія», ёсць жа і іншыя прадпрыемствы — будаўнічыя арганізацыі, малыя прадпрыемствы, інстытут праблем рэсурсазберажэння, домабудаўнічы камбінат і іншыя...

Часам узнікаюць пытанні і па рабоце гандлёвага абслугоўвання, у прыватнасці па рабоце аўтакрамаў. Жыхары аддаленых вёсак (у асноўным пенсіянеры) просяць, каб аўтакрама праязджала па кожнай вуліцы, як гэта робяць прыватнікі. Такая невялікая недапрацоўка ў райспажыўкааперацыі ёсць, але відавочна, што калі райпа не пойдзе насустрач людзям і не вырашыць гэтую праблему сёння, то заўтра страціць пакупнікоў. Людзі будуць набываць тавары ў таго, хто пад'язджае бліжэй, пад самую хату — у прадпрымальнікаў.

Для нашага раёна характэрны востры недахоп медыкаў, асабліва «вузкіх» спецыялістаў. Першай мерай па выпраўленні сітуацыі стала рашэнне аб максімальным павелічэнні аб'ёмаў жылога будаўніцтва на 2010 год (у нас вельмі вялікая колькасць тых, хто мае патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў). Адзін шматпавярховы дом для медыкаў летась быў здадзены. Сёлета сфарміраваны яшчэ 2 кааператывы. Акрамя таго, летась медработнікам выдаткаваны 10 дамкоў катэджнага тыпу ў вёсцы Жабіна і 3 у гарадскім пасёлку Старобін. Другой мерай па вырашэнні праблемы з медыцынскімі кадрамі стала аказанне фінансавай дапамогі студэнтам-платнікам — пры ўмове іх далейшага абавязковага працаўладкавання на тэрыторыі нашага раёна.

Нявырашанай пакуль што застаецца праблема якасці пітной вады ў сельскіх населеных пунктах (высокая канцэнтрацыя жалеза і нітратаў). Мы спадзяёмся, што наш раён уключаць у праграму «Чыстая вада» на 2011—2015 гады. Раней — да аб'яднання раёна і горада, кожны самастойна вырашаў свае праблемы. І атрымалася так, што горад увайшоў у праграму «Чыстая вада» і паспяхова яе выканаў. Сёння праблемы пітнога забеспячэння для жыхароў горада няма.

***— Ці прасцей стала працаваць пасля аб'яднання горада і раёна?***

— Безумоўна. Але тут яшчэ вельмі важнае значэнне маюць стасункі паміж органамі прадстаўнічай і выканаўчай улады. Мне як старшыні райсавета пашанцавала ў тым плане, што ў нас з райвыканкамам існуе цеснае паразуменне. Калі ўзнікае нейкая праблема, да яе вырашэння падключаюцца ўсе структуры. Зразумела, нашы арганізацыі — не пажарная каманда. Яны не ў стане выканаць задачу імгненна, але абавязкова зробяць усё заўтра.

***— Вы задаволены работай свайго дэпутацкага корпуса?***

— Не ўсім. Але, калі гаварыць у цэлым, дэпутацкі корпус падабраўся даволі актыўны, працаздольны. Прыкладна трэць склалі дэпутаты, якія былі абраны ўпершыню. Не было падзелу — маўляў, мая акруга гарадская, таму праблемы вёскі мяне не цікавяць. Мы практыкавалі выязны Дзень дэпутата, выязныя сесіі. Сярод нашых дэпутатаў былі людзі, далёкія ад вёскі. І калі мы на выязных справаздачных сесіях паказалі ім наш раён, глыбінку, яны новымі вачыма пачалі глядзець на сельскае жыццё, на вясковага чалавека і на яго праблемы. Выязныя сесіі — лепшы спосаб увачавідкі, а не на паперы, пабачыць вынікі зробленага.

**Інга МІНДАЛЁВА.**
*Салігорскі раён.*

**ЗВАРОТНАЯ СУВЯЗЬ**

# СКАРАЦІЦЬ... А ШТО ЎЗАМЕН?

## Закрыццё ўчастковых бальніц паскарае выміранне вёскі...

ФАП у в. Ціхаволя Свіслацкага раёна.




Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

**Паважаная рэдакцыя, моцна зачапіў мяне артыкул Надзеі НІКАЛАЕВАЙ «Вясковыя ўчастковыя бальніцы — учарашні дзень?»(«Мясцовае самакіраванне» за 18 сакавіка 2010 года). Не, я не маю ніякіх прэтэнзій да яго аўтара, тым больш што ў загалоўку артыкула стаіць пытальнік. Тэма па-сапраўднаму балючая.**

Вельмі крыўдна робіцца ад выказванняў **дацэнта кафедры грамадскага здароўя і аховы здароўя БелМАПА, кандыдата медыцынскіх навук Сяргея МІХАЛЮКА**. Цытую спадара Міхалюка: «Наяўнасць вялікай колькасці ўчастковых бальніц не спрыяе паляпшэнню даступнасці і павышэнню якасці медыцынскай дапамогі, паколькі ў маламоцных бальніцах адсутнічаюць умовы для аказання лячэбнай дапамогі на належным узроўні». А што, цікава, у такім разе спрыяе паляпшэнню даступнасці і павышэнню якасці медыцынскай дапамогі? На думку спадара Міхалюка, гэта вялікая бальніца ў райцэнтры, з сучасным абсталяваннем і еўрарамонтам. Лагічна. Толькі знаходзіцца яна за 30-40 кіламетраў ад тваёй вёскі, а аўтобус не кожны дзень курсіруе ў райцэнтр. Падумае чалавек, падумае, дый махне рукой — маўляў, пражыў сённяшні дзень, пражыву і заўтрашні. А калі і адважыцца паехаць, то разгубіцца ад вялікай колькасці ўрачоў, якія вельмі занятыя беганінай з кабінета ў кабінет і бясконцай пісанінай, ад сучасных «навваротаў». А, убачыўшы безліч хворых, што стаяць і сядзяць пад дзвярамі кабінетаў, захварэе яшчэ больш. Ці спозніцца на аўтобус, пакуль высветліцца, што флюарограф сёння ўжо не працуе, а вынікі аналізаў будуць вядомыя толькі заўтра. І ўсё гэта спадар Міхалюк лічыць паляпшэннем даступнасці і павышэннем якасці? Ці можа, запярэчыць, што такога не можа быць? Пацвердзіць праўдзівасць маіх слоў могуць сотні і тысячы вяскоўцаў з тых населеных пунктаў, дзе без аніякіх тлумачэнняў зачынілі ўчастковую бальніцу. А куды ім скардзіцца і ці ёсць сэнс? А наконт даступнасці ўмоў для аказання лячэбнай дапамогі на сучасным узроўні хочацца сказаць наступнае. У вёсцы і не патрэбна асаблівых умоў. Тут дастаткова фанендаскопа і танометра. І ўрач, вядома ж, патрэбны. Прыйшоўшы да ўчастковага ўрача, чалавек не разгубіцца (бо добра знаёмы з ім), будзе ўважліва выслуханы, атрымае належнае лячэнне і парады доктара.

І яшчэ з адным выказваннем спадара Міхалюка ну аніяк не магу пагадзіцца: «Дзейная доўгі час практыка адкрыцця дробных вясковых бальніц прывяла да распылення сілаў і сродкаў, стварыўшы перашкоду для выкарыстання сучаснай медыцынскай тэхнікі і абсталявання і замарудзіла развіццё спецыялізаванай медыцынскай дапамогі». Іншымі словамі кажучы, існавала такая практыка доўгі час, і раптам высветлілася, што стала яна перашкодай для прагрэсу, і з-за яе нават у гарадах замарудзілася развіццё спецыялізаванай медыцынскай дапамогі. На думку спадара Міхалюка, існуе яшчэ адна прычына закрыцця вясковых участковых бальніц: некаторыя з іх элементарна пустуюць у вяснова-летні час. Што тут сказаць? Толькі тое, што спадар Міхалюк нічога не ведае пра спецыфіку вясковага жыцця, таму патлумачу. Так, вясной і ўлетку бальніцы і сапраўды пустуюць, бо вяскоўцам няма калі хварэць — веснавы дзень год корміць. Не, людзі, безумоўна, хварэюць, і да ўрача па дапамогу звяртаюцца, але ад стацыянарнага лячэння адмаўляюцца. (У крайнім выпадку хоць дзяцей дагледзяць, кароўку выганяць у поле.) Таму, на мой погляд, паўпустыя ў летні час бальніцы — гэта не доказ таго, што яны не патрэбныя, што яны толькі перашкаджаюць развіццю сучаснай медыцыны.

Адсутнасць бальніцы як памяшкання яшчэ паўбяды. Галоўная бяда — адсутнасць урача. Але чаму маладыя кадры не затрымліваюцца ў сельскай мясцовасці? Дзяржава ўкладвае ў іх навучанне вялізныя сродкі, а яны, бачыце, не хочуць ехаць у вёску, бо там няма перспектывы... Калі на тое пайшло, чаму ваенным можна загадаць, а ўрачам — не? Магчыма, праблема у адсутнасці ахвотных працаваць у сельскай медыцыне заключаецца ў тым, што ў вышэйшыя медыцынскія навучальныя ўстановы паступаюць пераважна гараджане? Вясковая ж моладзь часцей за ўсё не можа нароўні канкурыраваць з выпускнікамі гарадскіх школ. Настаўнікам таксама не хочацца працаваць у вёсцы. Таму лічу, што для вясковых абітурыентаў павінен быць нейкі іншы адбор, бо выхадцы з сельскай мясцовасці не спалохаюцца размеркавацца ў вёску. Да таго ж, абітурыенту з сельскай мясцовасці можна пры паступленні паставіць умову: напрыклад, калі табе не хапае балаў, мы цябе прымаем, але пасля вучобы ты мусіш дзесяць гадоў адпрацаваць у сельскай мясцовасці. А хто ўжо пасля дзесяці гадоў пакіне абжытае, наседжанае месца? Хіба толькі адзінкі.

Не магу не пагадзіцца са спадаром Міхалюком — вёска і сапраўды старэе. І не толькі старэе — вымірае. І ёй у гэтым актыўна дапамагаюць, бо закрываюць бальніцы, школы, крамы, аддзяленні сувязі. А тыя збудаванні, што яшчэ нядаўна служылі людзям, сталі фактычна помнікамі. Помнікамі пры іх жыцці. Пакуль яшчэ...

**А. ЛІПЕНЬ,**
*Іўеўскі раён, вёска Даўнары.*

МЕСТНОЕ САМОУПРАВЛЕНИЕ

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ № 15 ад 17 лютага 2009 года выдадзена Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.

**Заснавальнікі:** Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Установа «Рэдакцыя газеты «Звязда»

**Галоўны рэдактар Уладзімір НАРКЕВІЧ.**

**Адказная за выпуск Наталля КАРПЕНКА.**

Грамадскі савет: **НАВІЦКІ Г.В.**, старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні; **БАЙКОЎ В.М.**, старшыня Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па дзяржаўным будаўніцтве, мясцовым самакіраванні і рэгламенце; **АЦЯСАЎ А.Я.**, старшыня Віцебскага абласнога Савета дэпутатаў; **СЦЕПАНЕНКА А.М.**, адказны сакратар Савета па ўзаемадзеянні органаў мясцовага самакіравання пры Савеце Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь; **ПРЭДКА С.У.**, старшыня Ваўкавыскага раённага Савета дэпутатаў Гродзенскай вобласці; **МАКСІМЕНКА С.А.**, старшыня Прылепскага сельскага Савета дэпутатаў Смалявіцкага раёна Мінскай вобласці

**АДРАС РЭДАКЦЫІ:** 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

**КАНТАКТНЫ ТЭЛЕФОН:** 292 21 03;

**e-mail:** info@zvyazda.minsk.by

**Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛД № 02330/0494179 ад 03.04.2009. 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79.**

**Тыраж 33.310. Нумар падпісаны ў 19.30.**

Вучыся на чужых памылках!

# «ТЫ Ж МЯНЕ ПАДМАНУЛА, ТЫ Ж МЯНЕ ПАДВЯЛА...»

## Ахвяры «рэфератчыкаў» вырашылі папярэдзіць чытачоў «Звязды» аб махлярстве, якое, як яны сцвярджаюць, з кожным днём захоплівае ў свае пасткі ўсё больш і больш людзей

Надзея ДРЫЛА

**АБ'ЯВАМІ кшталту «Рэфераты, курсавыя і дыпломныя работы...» стракацяць газеты, інтэрнэт і, безумоўна, прыдарожныя слупы. Прычым свае паслугі сёння прапаноўваюць не толькі аўтары-адзіночкі, але і прадпрыемствы, якія легальна займаюцца «рэфератным» бізнэсам. Усе ў адзін голас гарантуюць аматарам халявы за адносна невялікія грошы «сесію без «хвастоў» і, адпаведна, «добры настрой на працягу ўсяго навучальнага года»...**

### «Галоўнае садраць з кліентаў грошы, а якасць — справа другасная»

Раман Ш. з Мінска да ліку заўзятых халяўшчыкаў сябе не адносіць. Звярнуўся ў адну са сталічных фірмаў, якая займаецца выкананнем студэнцкіх работ, упершыню. І тое толькі таму, што не паспяваў усе дасланыя работы выканаць своечасова. Адным словам, як кажуць студэнты, «завал» быў.

— Фірму я знайшоў праз інтэрнэт, — распавядае студэнт-завочнік. — Замовіў адразу дзве работы: кантрольную і курсавую. Як і абяцалі, зрабілі ўсё ў тэрмін.

Я, задаволены, аплаціў паслугу і ў той жа дзень адправіў навуковыя работы на праверку ва ўніверсітэт. Якое было маё расчараванне, калі выкладчыкі вярнулі «мой допуск да сесіі» на дапрацоўку!

Раман з прэтэнзіямі звярнуўся ў фірму, дзе студэнту ветліва паабяцалі выправіць усе недалікі.

— І што вы думаеце, пасля трох і больш дапрацовак «прафесіяналы» так і не змаглі зрабіць усё так, як мае быць. Маю ж просьбу вярнуць грошы праігнаравалі.

Малады чалавек падзяліўся сваім горам з інспекцыяй міністэрства па падатках і зборах Беларусі па гораду Мінску. Там яму парэкамендавалі звярнуцца з іскам у суд.

— Юрыст, да якога я звярнуўся па кансультацыю, сказаў, што ў мяне маленькая доказная база, таму трэба адклікаць кантрольныя работы, якія я паспяхова абараніў пасля самастойнай дапрацоўкі, з універсітэта. Але па зразумелых прычынах я не хачу ўвязваць сюды сваю навучальную ўстанову.

Раман вырашыў, што асабіста ён больш з фірмай, галоўная задача якой садраць з кліентаў грошы, а якасць — справа другасная, не збіраецца мець спраў, і нам не раіць.

### «Дырэктар фірмы папрасіў прынесці афіцыйную рэцэнзію ад выкладчыка...»

Такі ж гузак набіла летась мінчанка Святлана Р., якая вучыцца завочна ў адной з ВНУ сталіцы.

— У інтэрнэце я звярнула ўвагу на сайт аднаго з прадпрыемстваў, дзе прапаноўвалі аформіць справаздачу па пераддыпломнай практыцы, — распавядае «сяброўка» Рамана па няшчасці. — Унесла задатак, але ніякай квітанцыі не атрымала. На пытанне, ці павінны мне выдаць які-небудзь дакумент, менеджар заверыў, што я магу быць спакойная: справаздача будзе зроблена якасна і ў тэрмін. І сказаў патэлефанаваць 25 снежня.

Кліентка звярнула ўвагу, што 25-га — гэта Каляды, таму перапытала, ці будуць яны наогул працаваць у гэты дзень. Менеджар пераканаў, што будуць.

— Аднак ён мяне падмануў. Калі я патэлефанавала, ніхто трубку не зняў. Пасля зайшла на сайт прадпрыемства і ўбачыла, што ў іх, аказваецца, выхадны.

Забраць справаздачу Святлана змагла толькі ў панядзелак. У той жа дзень канчаткова разлічылася з выканаўцам. Як і ў мінулы раз, ніякіх дакументаў, якія пацвярджалі б прыём наяўных сродкаў, ёй не выдалі. Калі студэнтка ўзяла ў рукі праверану кіраўніком па практыцы справаздачу, то не паверыла сваім вачам: яна была практычна цалкам перакрэсленая, з усіх пунктаў без выпраўленняў застаўся толькі першы пункт індывідуальнага задання.

— Я звярнулася ў офіс з заўвагамі. Там паабяцалі, што выправяць работу на працягу двух-трох дзён. Прайшло тры дні, пяць, дзесяць... Мяне працягвалі карміць абяцанкамі.

Студэнтка сама перааформіла справаздачу. Пасля паўторнай праверкі кіраўнік дапусціў яе да абароны.

Пасля абароны Святлана стала тэлефанаваць на прадпрыемства і патрабаваць вярнуць грошы, бо работа была выканана няякасна, а справаздача ёй ужо была непатрэбная.

— Работнікі гаварылі, што такія пытанні вырашае толькі дырэктар, якога, па волі лёсу, не было ў офісе штораз, калі я тэлефанавала. Неўзабаве мне на электронную скрыню прыйшла перарobленая справаздача.

На наступны дзень Святлана, абураная, сама пайшла ў офіс. Выслухаўшы яе, дырэктар катэгарычна адмовіўся вяртаць грошы, сказаў што кіраўнік па практыцы некампетэнтны і папрасіў прынесці афіцыйную рэцэнзію ад яго...

> **Калі я ўзяла ў рукі праверану кіраўніком па практыцы справаздачу, то не паверыла сваім вачам: яна была практычна цалкам перакрэсленая...**

### Ні адзін халяўшчык не застрахаваны ад «кідалава»

Слова **начальніку юрыдычнага аддзела грамадскага аб'яднання «Спажывец» Аляксандру КАЖАМЯЧОНКУ**.

— Пісаць курсавыя за іншых на сёння заканадаўствам не забаронена. Зарэгіструйся, спраўна плаці падаткі — і сцяг у рукі. Таму на рынку інфармацыйных паслуг прапаноў такога кшталту, не сакрэт, дастаткова шмат. Хоць, на мой погляд, гэта не зусім карэктна з пункту гледжання адукацыі. Між тым, заканадаўства ў сферы абароны правоў спажыўца распаўсюджваецца ў тым ліку і на падобнага роду заказы. У прыватнасці, згодна з пунктам 1 артыкула 29 Закона РБ «Аб абароне правоў спажыўцоў» (далей — Закона) выканаўца абавязаны аказаць паслугу ў тэрмін, устаноўлены дагаворам. За кожны дзень пратэрміноўкі парушальніку давядзецца плаціць няўстойку ў памеры аднаго працэнта ад кошту аказання паслугі. Калі ж ваш выкладчык не задаволены работай, то вы маеце права патрабаваць выканаўцу бясплатна ліквідаваць усе недахопы на працягу як мінімум 14 дзён. Адзінае, я б рэкамендаваў, прад'яўляць усе патрабаванні ў пісьмовай форме, каб выканаўца не мог цягнуць час. Больш за тое, згодна з пунктам 3 артыкула 31 Закона, калі былі выяўлены істотныя недахопы ў рабоце ці выканаўца не ліквідаваў недахопы ва ўстаноўленыя тэрміны, спажывец мае права патрабаваць разарваць дагавор і вярнуць аплачаную суму. Але, што датычыцца адукацыйных паслуг, пра якія мы вядзём гаворку, тут не ўсё так проста. Справа ў тым, што некаторыя нядобрасумленныя суб'екты гаспадарання, каб прыцягнуць кліента, на галоўных старонках інтэрнэт-сайтаў дэманструюць свае перавагі. А ўсе не зусім выгадныя ўмовы хаваюць у закладках, дзе яны выкладзеныя зусім непрыкметна дробным шрыфтам. У прыватнасці, у закладцы «гаранты на заказаныя вамі кантрольныя, курсавыя, дыпломныя і іншыя студэнцкія работы» аднаго з такіх сайтаў маецца агаворка, што «усе прэтэнзіі па якасці работы прымаюцца толькі пры наяўнасці памет альбо рэцэнзіі правяральніка». Цікава, ці знойдзецца хоць адзін студэнт, які добраахвотна прызнаецца свайму выкладчыку, што курсавую напісалі за яго?.. Хацелася б звярнуць увагу чытачоў на тое, каб яны ўважліва вывучалі ўсю інфармацыю, у тым ліку адкрывалі ўсе закладкі. Калі б спажыўцы звярталі ўвагу на падобныя надпісы, думаю, што большасць з іх яны калі б не спынілі, то насцярожылі. І заўсёдная мая рэкамендацыя, перш чым ставіць подпіс, уважліва чытайце ўсе палажэнні дагавора.

### За плагіят можна «вылецець» з універсітэта?

**Віктар ІЎЧАНКАЎ, дарадца Міністра адукацыі па сувязях са СМІ і грамадскасцю**: «Не сакрэт, ёсць людзі, якія спрабуюць зарабіць грошы на ляноце студэнтаў. Міністэрства адукацыі і я асабіста супраць такога роду «адукацыйных» паслуг. Гэта амаральна і адмоўна ўплывае на якасць адукацыі і на грамадства ў цэлым. Хіба студэнт-недавучка зможа стаць добрым спецыялістам? Ведаеце, вопытнаму выкладчыку нескладана адрозніць самастойна выкананую работу ад спісанай. Калі ж ёсць сумненне, можна звярнуцца па дапамогу да спецыяльнай праграмы «Антыплагіят». Зараз на высвятленне таго, што было спісана, а галоўнае, адкуль, выкладчыку не трэба марнаваць шмат часу. Праграма імгненна правярае работу і выдае ў працэнтных суадносінах колькасць арыгінальнага і спісанага тэксту і крыніцу запазычання. Больш таго, за плагіят студэнт можа быць адлічаны. Такое рашэнне ў праве прымаць вучоныя Саветы большасці беларускіх ВНУ».

**Ад аўтара.** «Рэфератны» бізнэс будзе жыць, пакуль на яго будзе попыт. І нават калі зачыняць такія фірмы і будуць кантраляваць сайты, наўрад ці што зменіцца. Легальныя бізнэсмены, хутчэй за ўсё, далучацца да ліку аўтараў-адзіночак і будуць пісаць дыпломы на хатнім ноўтбуку...

Выкарыстае студэнт чужую работу ці напіша сваю, залежыць ад яго матывацыі. Хоча атрымаць добрыя веды — будзе вучыцца сам. Калі ж яму патрэбна адукацыя выключна дзеля «корачкі» — будзе плаціць за халяву, рызыкуючы натрапіць на махляра. Адзінае ведаю дакладна, сур'ёзныя працадаўцы глядзяць цяпер не на прыгожыя «корачкі», а на рэальныя веды і вопыт.




**УВАГА, САМЫЯ РАСПАЎСЮДЖАНЫЯ ПАСТКІ ДЛЯ ХАЛЯЎШЧЫКА:**

**1. Аўтар прапаноўвае заказчыку сустрэцца на нейтральнай тэрыторыі. Атрымлівае грошы і аддае дыск з работай. Дома заказчык заўважае, што дыск пусты...**

**2. Заказчыку аддаюць нешта адчэпнае. Напрыклад, курсавую, сцягнутую з інтэрнэта, альбо разважанні ні аб чым замест грунтоўнага даследавання. У тэксце работы могуць быць выкарыстаны лічбы пяцігадовай даўнасці.**

**3. Фірма размяшчае рэкламу ў інтэрнэце, спісваецца з халяўшчыкам і прапаноўвае замовіць работу праз інтэрнэт. А калі студэнт авансам адпраўляе электронны плацеж (не на афіцыйныя рэквізіты), знікае.**

**4. Работа зроблена з сур'ёзнымі недалікамі. Заказчык просіць яе бясплатна дапрацаваць, аўтар на словах згаджаецца, а сам з грашыма «з'язджае да бабулі ў Сыктыўкар».**

# Французскага пасла запрасілі ў беларускі Парыж

**НАДЗВЫЧАЙНЫ і Паўнамоцны пасол Французскай Рэспублікі ў Беларусі Мішэль Рэнэры атрымаў ад губернатара Віцебскай вобласці Аляксандра Косінца афіцыйнае запрашэнне наведаць вёску Парыж, што ў Пастаўскім раёне. У час сустрэчы абмяркоўваліся, у тым ліку, і магчымасці ўдзелу Францыі ў акцыях, прысвечаных 200-годдзю вайны 1812 года. На Віцебшчыне шмат месцаў звязана з тымі падзеямі.**

Спадар пасол у паўночнай вобласці нашай краіны ўпершыню. Праграма яго візіту на Віцебшчыну вельмі насычаная. Пасол наведаў музей Шагала, які, як вядома, доўгі час жыў у Францыі, якая стала для яго другой радзімай.

7 і 8 красавіка пасол сустрэўся з кіраўнікамі праваслаўнай і каталіцкай епархій, гімназістамі і настаўнікамі гімназіі з паглыбленым вывучэннем французскай мовы.

**Губернатар Аляксандр Косінец** падчас перамоў з паслом канстатаваў, што па выніках мінулага года таваразварот вобласці з Францыяй склаў толькі 25,7 мільёна долараў. На жаль, ніводнае французскае прадпрыемства не зарэгістраванае ў свабоднай эканамічнай зоне «Віцебск». Пры гэтым для сумеснага супрацоўніцтва ёсць вялікі патэнцыял. У Францыю пакуль што ў асноўным ідзе з Віцебшчыны на экспарт прадукцыя дрэваапрацоўкі. Цікава, што летась на экспарт адпраўлена грыбоў амаль што на 750 тысяч долараў.

Паслу было прапанавана садзейнічаць у адкрыцці на базе аршанскага інструментальнага завода прадпрыемства па вырабу аўтамабіляў. На думку губернатара, вельмі паспяховым можа быць супрацоўніцтва ў ільняной галіне, аднаўленні паставак з Прыдзвінскага краю ў Францыю мэблі. Чаму б не наладзіць супрацоўніцтва па стварэнні аб'ектаў прыдарожнага сэрвісу, турызму? Безумоўна, Францыя можа садзейнічаць правядзенню ў Віцебску выставы сапраўдных твораў Шагала. Наогул, актывізаваць супрацоўніцтва у пытаннях культуры.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

## КУРЫЦЬ МОГ НЕКАЛЬКІ ГАДОЎ

**У Аршанскім раёне ля пасёлка Высокае на аўтадарозе мяжа Расійскай Федэрацыі — Мінск супрацоўнікі ДАІ затрымалі «Рэно», якім кіраваў індывідуальны прадпрымальнік — жыхар Гродна: ён перавозіў больш за 1200 пачкаў цыгарэт.**

Адпаведныя дакументы на цыгарэты (іх кошт ацэнены ў 2,6 мільёна рублёў) адсутнічалі. Прадпрымальніка, безумоўна, аштрафуюць. Цыгарэты, якія яму ўжо не выкурыць (хутчэй за ўсё, вёз на перапродаж), пасля ўсіх неабходных фармальнасцяў рэалізуюць.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

## КІРАЎНІКІ ЗАЙМАЛІСЯ ПРЫПІСКАМІ

**На два гады пазбаўлення волі, праўда, з адтэрміноўкай выканання пакарання на год, асуджаны былі кіраўнік сельскагаспадарчага вытворчага кааператыва «Калінавы Лог» Талачынскага раёна.**

Як паведаміў «Звяздзе» **намеснік пракурора Талачынскага раёна Іван Ёдыс**, старшыня кааператыва даваў указанні галоўнаму эканамісту гаспадаркі, каб той складаў заведама фіктыўныя нарады на аб'ёмы выкананых работ. У выніку былі складзены 13 фіктыўных нарадаў на здзельныя работы на агульную суму больш за 1,2 мільёна рублёў.

А ў іншай гаспадарцы раёна, «Талачынская Навінка», вельмі стараліся выканаць прагнозныя паказчыкі па продажу дзяржаве прадукцыі жывёлагадоўлі, а яшчэ баяліся не выканаць план сацыяльна-эканамічнага развіцця. Кіраўнік сістэматычна ўказваў загадчыкам фермаў уносіць у адпаведныя справаздачы фальшывыя звесткі. У прыватнасці, запісвалі ў табелях уліку працоўнага часу і разліку налічэння заробку падстаўных асобаў, якія на ферме не працавалі. За гэта кіраўнік аштрафаваны на 3,5 мільёна рублёў.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

# ПАЛЯЎНІЧЫ І РЫБАК

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

— Мой дзед быў паляўнічым з вялікай літары і перадаў мне шмат сакрэтаў гэтага старажытнага мужчынскага промыслу, — кажа Аляксандр. — Я з дзяцінства ведаў, як можна перахітрыць звера, падкрасціся да яго неўпрыкмет. Наогул, бачыць і разумець таямнічы навакольны свет, захапляцца прыродай, любіць яе ў любое надвор'е.

У Пастаўскім лясгасе Аляксандр Пайлак болей чым спецыяліст, які займаецца толькі падлікам і зімовай падкормкай звяроў, ахоўваю іх ад браканьераў ды наладжваннем сезонных паляванняў. Ягонымі рукамі аздоблены куточкі для адпачынку на лясных дарогах і дамок паляўнічага з прылеглай да яго тэрыторыяй. Асабліва ў доме паляўнічага ўражваюць карціны, намаляваныя алейнымі фарбамі. Тут Аляксандр праявіў сябе напоўную ў якасці жывапісца. Паляўнічыя — і свае, беларускія, і замежныя ў захапленні ад афармлення і ўмоў адпачынку. І як тут не пагадзіцца з распаўсюджаным выказваннем, што егер — твар паляўнічай гаспадаркі.

— Маляваннем я вылучаўся яшчэ ў школе, марыў набыць прафесію мастака, спрабаваў паступіць нават у Бабруйскае вучылішча, дзе рыхтуюць спецыялістаў дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва. Але ў мяне не было элементарнай класічнай падрыхтоўкі, — са шкадаваннем прыгадвае разьбяр-самавук.

Але прыродныя здольнасці вялі яго час ад часу і па мастакоўскай дарозе. Аляксандр адначасова і вучыўся, і выконваў працу мастака-афарміцеля: і падчас армейскай службы, і працуючы на адзіным у Варапаеве прадпрыемстве, — дрэваапрацоўчым камбінаце. Разьбярствам егер займаецца адносна нядаўна, паглядзеўшы, як робяць гэта маладыя і адукаваныя спецыялісты. Калі ж атрымаліся ў самога першыя фігуры — у асноўным казачныя персанажы, Пайлак зразумеў, што шмат гадоў марнаваў у сабе скульптара. Цяпер усё часцей бачыць у звычайным кавалку дрэва вобразы, выявы, твары. Але не адмаўляецца і ад аздаблення паляўнічых трафеяў, і ад жывапісу. У мясцовым праваслаўным храме знаходзяцца тры абразы, намаляваныя Пайлакам па замове святара.

— Аднойчы я пачуў у царкве, як людзі перашэптваліся, гледзячы на мой абраз: які прыгожы! Гэта для мяне была найлепшая ўзнагарода.

**Анатоль КЛЯШЧУК.**

*ПРАДАЕЦЦА*

❒ Зруб новы 6х6, паўбрус, цана па дамоўленасці.
Тэл.: 8 01772 53 926,
МТС 550 39 28.

❒ Дом з г/пабудовамі, на хутары.
Тэл. 8 01772 45 501.

❒ Зямельны ўчастак з камунікацыямі.
Тэл. 8 029 726 50 32.
Тэл. 8 029 212 97 78.

❒ Добраўпарадкаваная дача на беразе возера Лосвідо, тры ўзроўні, ці абмяняю на дачу недалёка ад Мінска.
Тэл. 8 029 926 27 86.

❒ Дача, 37 км ад Мінска, смалявіцкі напрамак.
Тэл.: маб. 377 72 71,
8 017 217 71 66.

## УВАЖАЕМЫЕ АКЦИОНЕРЫ ОАО «ТЕХНОБАНК»!

Настоящим уведомляем о принятии очередным (годовым) Общим собранием акционеров ОАО «Технобанк», проведенным в очной форме 30 марта 2010 г. (Протокол № 2), решения внести в устав ОАО «Технобанк» изменения и дополнения, изложив его в новой редакции, и о Вашем праве требовать выкуп акций, если это явилось следствием ограничения прав акционеров.

Подача акционерами ОАО «Технобанк» заявлений с требованиями о выкупе акций осуществляется в ОАО «Технобанк» в течение 20 рабочих дней с даты проведения Общего собрания акционеров (30.03.10). Требования о выкупе акций (либо уведомление об отказе от выкупа) удовлетворяются ОАО «Технобанк» в течение 30 рабочих дней с даты подачи заявления с требованием о выкупе акций.

**Для получения дополнительной информации предлагаем обращаться в ОАО «Технобанк» по адресу: г. Минск, ул. Кропоткина, 44, телефон (017) 237 43 80**

Лицензия Национального банка Республики Беларусь на осуществление банковской деятельности № 11 от 27.10.2006 г., УНП 100706562.

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА
### по продаже объектов республиканской собственности – капитальных строений и права заключения договоров аренды земельных участков для их обслуживания, изолированного помещения

| | | |
|---|---|---|
| **Лот № 1** Предмет аукциона, место нахождения имущества, информация о земельном участке | Капитальное строение инв. № 452/С-5421, многолетние насаждения, расположенные по адресу: Гродненская обл., Зельвенский р-н, дер. Лавриновичи, 29, и право заключения договора аренды земельного участка с кадастровым номером 422682504102000019 площадью 0,0201 га сроком на 50 лет | Начальная цена предмета аукциона – 224 311 513 руб., сумма задатка – 22 431 000 руб. |
| **Лот № 2** Предмет аукциона, место нахождения имущества, информация о земельном участке | Капитальные строения инв. № 413/С-5324, инв. № 413/С-7927, расположенные по адресу: Гродненская обл., Свислочский р-н, дер. Доброволя, ул. Урбановича, 71, и право заключения договора аренды земельного участка с кадастровым номером 425281301101000067 площадью 0,0508 га сроком на 50 лет | Начальная цена предмета аукциона – 11 000 944 руб., сумма задатка – 1 100 000 руб. |
| **Лот № 3** Предмет аукциона, место нахождения имущества, информация о земельном участке | Капитальное строение инв. № 422/С-14138, расположенное по адресу: Гродненская обл., Щучинский р-н, дер. Рожанка, ул. Советская, 22, и право заключения договора аренды земельного участка с кадастровым номером 425886515107000117 площадью 0,0826 га сроком на 30 лет | Начальная цена предмета аукциона – 11 266 527 руб., сумма задатка – 1 126 000 руб. |
| **Лот № 4** Предмет аукциона, место нахождения имущества | Изолированное помещение инв. № 440/D-3203, расположенное по адресу: Гродненская обл., Ошмянский р-н, дер. Гольшаны, ул. Трабская, 10 | Начальная цена предмета аукциона – 22 464 966 руб., сумма задатка – 2 246 000 руб. |

**Продавец недвижимого имущества по лоту № 1:** Учреждение «Гродненское областное управление Министерства по чрезвычайным ситуациям Республики Беларусь», **по лотам №№ 2, 3, 4:** Гродненское торгово-производственное республиканское унитарное предприятие «Фармация»

**Организатор аукциона:** Гродненский областной территориальный Фонд государственного имущества (Фонд «Гродноблимущество»), 230023, г. Гродно, ул. 17 Сентября, 39 (время работы с 8.30 до 13.00 и с 14.00 до 17.30, кроме выходных и праздничных дней), тел.: (8 0152) 74 53 86, 72 15 29, 74 53 82; www.region.by, www.gki.gov.by

1. Аукцион состоится **19 апреля 2010 года в 10.30** по адресу: 230023, г. Гродно, ул. 17 Сентября, 39.

2. Заявления на участие в аукционе с прилагаемыми к нему документами принимаются Организатором аукциона **по 15 апреля 2010 года до 16.00**, кабинет 6.

Сумма задатка перечисляется на расчетный счет Организатора аукциона – Фонда «Гродноблимущество» № 3642900000187, МФО 152101752 в филиале 400 Гродненского областного управления ОАО «АСБ Беларусбанк», г. Гродно, УНП 500044549.

3. **По лотам № № 1–3:** Победитель аукциона (претендент на покупку) обязан в течение 10 рабочих дней со дня принятия местным исполнительным комитетом решения о предоставлении земельного участка внести плату за право заключения договора аренды земельного участка, возместить затраты на организацию и проведение аукциона, в том числе расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам аукциона документации, необходимой для его проведения. После совершения победителем аукциона (претендентом на покупку) указанных действий, но не позднее 2 рабочих дней, с ним в установленном порядке, в соответствии с условиями аукциона, Продавцом заключается договор купли-продажи недвижимого имущества, а местным исполнительным комитетом – договор аренды земельного участка.

4. **По лоту № 4:** Возмещение затрат на организацию и проведение результативных торгов осуществляется победителем торгов (претендентом на покупку) по фактическим затратам. Победитель торгов (претендент на покупку) обязан перечислить в республиканский бюджет указанную сумму фактических затрат в течение 3 рабочих дней со дня проведения торгов. После предъявления копии платежных документов о перечислении затрат на организацию и проведение торгов в установленном порядке в соответствии с условиями торгов между продавцом и победителем торгов (претендентом на покупку) в течение 2 рабочих дней заключается договор купли-продажи предмета торгов.

5. **Подробная информация** – в извещениях о проведении аукционов, ранее опубликованных в газете «Звязда» **17 февраля 2010 г. № 29 (26637), 24 февраля 2010 г. № 34 (26651).**

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОННЫХ ТОРГОВ
### РУП «Белспецконтракт» проводит 4-й повторный открытый аукцион по продаже имущества республиканской собственности 16 апреля 2010 года

| Лот | Наименование техники | Местонахождение объекта | Год выпуска | Пробег в км/ наработка в м/ч (износ) | Начальная цена продажи (руб.) | Сумма задатка (руб.) |
|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 |
| 28. | Грузовой Урал-43202-0011-01 ш. 017604, дв. 484244 | г. Осиповичи, в/часть 12147 | 1983 | 127236 | 8 000 000 | 800 000 |

Аукцион состоится по адресу: г. Минск, ул. Казинца, 2, 6-й этаж, в 11.00 **16 апреля 2010 г.**

К участию в аукционе допускаются юридические лица, индивидуальные предприниматели и физические лица, оплатившие задаток и подавшие заявление на участие в аукционе, учредительские и другие необходимые документы до 17.00 **14 апреля 2010 года.**

**Победитель аукциона обязан:**

1. Заключить договор купли-продажи 16 апреля 2010 г.

2. Произвести оплату стоимости движимого имущества разовым платежом в течение 5-ти банковских дней со дня подписания договора купли-продажи.

Задаток и денежные средства победителем лота перечисляются на расчетный счет РУП «Белспецконтракт»: 3012008660018, код 357, в Октябрьском отд. ОАО «БПС-Банк» г. Минск, ул. Чкалова, 18/1, УНП 101099370. **Без НДС. Справки по тел. (017) 278 06 97, факс 224 20 01. Наш адрес в интернете: www.belspeckontrakt.com.**

## Отчет о работе открытого акционерного общества «МИНСКИЙ ДОМОСТРОИТЕЛЬНЫЙ КОМБИНАТ» за 2009 год

Учетный номер плательщика: **100258980**
Вид деятельности: **строительство**
Адрес: **220015, ул. Пономаренко, 43**
Единица измерения: **млн руб.**

### БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС на 01.01.2010 г.

| АКТИВ | Код строки | На начало года | На конец отчетного периода |
|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 |
| **I. ВНЕОБОРОТНЫЕ АКТИВЫ** | | | |
| Основные средства | | | |
| первоначальная стоимость | 101 | 56959 | 61796 |
| амортизация | 102 | 30224 | 33377 |
| остаточная стоимость | 110 | 26735 | 28419 |
| Нематериальные активы | | | |
| первоначальная стоимость | 111 | 3 | 2 |
| амортизация | 112 | 1 | 1 |
| остаточная стоимость | 120 | 2 | 1 |
| Вложения во внеоборотные активы | | | |
| в том числе: незавершенное строительство | 141 | 12262 | 26428 |
| **ИТОГО по разделу I** | **190** | **39053** | **55167** |
| **II. ОБОРОТНЫЕ АКТИВЫ** | | | |
| Запасы и затраты | 210 | 10436 | 14026 |
| в том числе: сырье, материалы и другие аналогичные активы | 211 | 9812 | 11026 |
| расходы будущих периодов | 218 | 624 | 1596 |
| налоги по приобретенные товарам, работам, услугам | 220 | 59 | 82 |
| Дебиторская задолженность (платежи по которой ожидаются в течение 12 месяцев после отчетной даты) | 240 | 8568 | 20062 |
| в том числе: покупателей и заказчиков | 241 | 6271 | 14283 |
| поставщиков и подрядчиков | 242 | 1704 | 4917 |
| по налогам и сборам | 243 | 11 | 26 |
| по расчетам с персоналам | 244 | 463 | 774 |
| разных дебиторов | 245 | 119 | 62 |
| прочая дебиторская задолженность | 249 | - | - |
| Расчеты с учредителями | 250 | 1863 | 1863 |
| в том числе: по вкладам в уставной фонд | 251 | 1863 | 1863 |
| Денежные средства | 260 | 7931 | 21860 |
| в том числе: денежные средства на депозитных счетах | 261 | 800 | 11800 |
| **ИТОГО по разделу II** | **290** | **28857** | **57893** |
| **БАЛАНС (190+290)** | **300** | **67910** | **113060** |
| ПАССИВ | Код строки | На начало года | На конец отчетного периода |
| **III. КАПИТАЛ И РЕЗЕРВЫ** | | | |
| Уставный фонд | 410 | 2144 | 2144 |
| Резервный фонд | 420 | 318 | 1375 |
| в том числе: резервные фонды, образованные в соответствии с учредительными документами | 422 | 318 | 1375 |
| Добавочный фонд | 430 | 24195 | 26186 |
| Нераспределенная (неиспользованная) прибыль (непокрытый убыток) | 450 | 13276 | 28926 |
| Целевое финансирование | 460 | 18847 | 39129 |
| **ИТОГО по разделу III** | **490** | **58780** | **97760** |
| **IV. ДОЛГОСРОЧНЫЕ ОБЯЗАТЕЛЬСТВА** | | | |
| Долгосрочные кредиты и займы | 510 | 871 | 511 |
| **ИТОГО по разделу IV** | **590** | **871** | **511** |
| **V. КРАТКОСРОЧНЫЕ ОБЯЗАТЕЛЬСТВА** | | | |
| Кредиторская задолженность | 620 | 7799 | 13732 |
| в том числе: перед поставщиками и подрядчиками | 621 | 1827 | 3974 |
| перед покупателями и заказчиками | 622 | 1603 | 4057 |
| по расчету с персоналом по оплате труда | 623 | 1825 | 2228 |
| по налогам и сборам | 625 | 1367 | 1462 |
| по социальному страхованию и обеспечению | 626 | 665 | 668 |
| перед прочими кредиторами | 628 | 512 | 1343 |
| Задолженность перед участниками (учредителями) | 630 | 460 | 1057 |
| В том числе: По выплате доходов, дивидендов | 631 | 460 | 1057 |
| **ИТОГО по разделу V** | **690** | **8259** | **14789** |
| **БАЛАНС (490+590+690)** | **700** | **67910** | **113060** |
| Из строки 620: | | | |
| Краткосрочная кредиторская задолженность | 702 | 7799 | 13732 |

### ОТЧЕТ О ПРИБЫЛЯХ И УБЫТКАХ на 01.01.2010 г.

| Наименование показателей | Код строки | За отчетный период | За аналогичный период прошлого года |
|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 |
| **I. ДОХОДЫ И РАСХОДЫ ПО ВИДАМ ДЕЯТЕЛЬНОСТИ** | | | |
| Выручка от реализации товаров, продукции, работ, услуг | 010 | 141800 | 102715 |
| Налоги, сборы, включаемые в выручку от реализации товаров, продукции, работ, услуг | 011 | 1976 | 3236 |
| Выручка от реализации товаров, продукции, работ, услуг (за вычетом налогов и сборов, включаемых в выручку) (010-011) | 020 | 139824 | 99479 |
| Себестоимость реализованных товаров, продукции, работ, услуг | 030 | 112015 | 85761 |
| Валовая прибыль (020-021-030) | 040 | 27809 | 13718 |
| ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК) от реализации товаров, продукции, работ, услуг (020-030-050-060) | 070 | 27809 | 13718 |
| **II. ОПЕРАЦИОННЫЕ ДОХОДЫ И РАСХОДЫ** | | | |
| Операционные доходы | 080 | 5557 | 3843 |
| Налоги и сборы, включаемые в операционные доходы | 081 | 791 | 589 |
| Операционные доходы (за вычетом налогов и сборов, включаемых в операционные доходы) (080-081) | 090 | 4766 | 3254 |
| в том числе: проценты к получению | 091 | 399 | 21 |
| доходы от операций с активами | 093 | 3979 | 3233 |
| прочие доходы | 099 | 388 | - |
| Операционные расходы | 100 | 3607 | 2644 |
| в том числе: расходы от операций с активами | 102 | 3552 | 2644 |
| прочие операционные расходы | 109 | 55 | - |
| ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК) от операционных доходов и расходов (090-100) | 120 | 1159 | 610 |
| **III. ВНЕРЕАЛИЗАЦИОННЫЕ ДОХОДЫ И РАСХОДЫ** | | | |
| Внереализационные доходы | 130 | 31 | 31 |
| Внереализационные доходы (за вычетом налогов и сборов, включаемых в операционные доходы) (130-131) | 140 | 31 | 12 |
| Внереализационные расходы | 150 | 660 | 513 |
| ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК) от внереализационных доходов и расходов (140-150) | 160 | -629 | -501 |
| ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК) (±070±120±160) | 200 | 28339 | 13827 |
| Расходы, не учитываемые при налогообложении | 210 | 619 | 478 |
| Доходы, не учитываемые при налогообложении | 220 | 14 | 5 |
| ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК) до налогообложения (±200+210-220) | 240 | 28944 | 14300 |
| Налог на прибыль | 250 | 6879 | 2992 |
| Прочие налоги, сборы из прибыли | 260 | 937 | 620 |
| ЧИСТАЯ ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК) (200-250-260-270) | 300 | 20523 | 10215 |

### ИНФОРМАЦИЯ О ДИВИДЕНДАХ И АКЦИЯХ

| Наименование показателя | Единица измерения | За отчетный период | За аналогичный период прошлого года |
|---|---|---|---|
| Начислено на выплату дивидендов в данном отчетном периоде | млн рублей | 1056 | 459 |
| Дивиденды, приходящиеся на одну акцию (включая налоги) | рублей | 591 | 257 |
| Обеспеченность акции имуществом Общества | тыс. рублей | 31,8 | 22,0 |
| Количество простых акций, находящихся на балансе Общества | шт. | - | - |
| Количество акционеров, всего | шт. | 2844 | 2845 |
| В том числе: юридических лиц физических лиц | шт. | 2 2842 | 2 2843 |

По мнению аудиторской организации ИП «Бухарова М.И.», бухгалтерская (финансовая) отчетность ОАО «Минский домостроительный комбинат» сформирована в соответствии с требованиями законодательства Республики Беларусь по бухгалтерскому учету и отчетности, достоверно во всех существенных аспектах отражает финансовое положение ОАО «Минский домостроительный комбинат» на 1 января 2010 г. и результаты его финансово-хозяйственной деятельности за 2009 г., при этом совершенные ОАО «Минский домостроительный комбинат» финансовые (хозяйственные) операции во всех существенных отношениях соответствуют законодательству.

Акционеры – физические лица могут получить дивиденды за 2009 год с 19.05.2010 г. по 20.06.2010 г. в установленном порядке из расчета 591 рубль на одну акцию (за вычетом налога на доходы). Телефон для справок: (8017) 2072060; телефон депозитария ООО «Лидеринвест»: (8017) 2130213 (ул. Пономаренко, 35а, к. 229).

**И.о. директора** **В.Л. Вайнилович**

**Главный бухгалтер** **Н.С. Кармызов**

Краіна здароўя
Выпуск № 13 (182)


Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

Дзяржава — чалавеку

# НАВУКОВЫЯ ТЭХНАЛОГІІ ДЛЯ САЦЫЯЛЬНАЙ АБАРОНЫ

## Калі Міністэрства працы і сацыяльнай абароны папросіць навукоўцаў зрабіць праграму сацыяльнай абароны пажылых людзей?

**Сваякі жанчыны, якая трапіла ў бальніцу з інсультам, сутыкнуліся з праблемай: як пасля аказання меддапамогі даставіць цяжка хворую дадому? Медыкі сказалі, што сваю місію выканалі, а свякоў мужчынскага полу ў жанчыны не аказалася. У рэшце рэшт, у становішча ўвайшлі... выратавальнікі, супрацоўнікі МНС. Можна бясконца пералічваць сітуацыі, у якіх мы рэгулярна аказваемся і з якіх не бачым аптымальнага выйсця. Дзе нам лепей жыць — на вёсцы ці ў горадзе? Якая адукацыя нам патрэбна? Як правільна ўкласці заробленае? Куды падацца пасля скарачэння? Чым заняцца на пенсіі? Як умацаваць сям'ю, забяспечыць шчаслівую старасць, павагу да старэйшага пакалення, здароўе ў сучаснай стрэсагеннай цывілізацыі, якасць жыцця?.. Усё гэта — пытанні сацыяльнай абароны і рэабілітацыі, прасцей кажучы, «адраджэння» чалавека ў пераломныя моманты яго жыцця. Няма чалавека, які жыў бы па-за гэтым і, на жаль, няма беларуса, які мог бы сёння іх вырашыць з лёгкасцю — з прафесійнай дапамогай.**

**Пра неабходнасць рэфармавання сацыяльнай сістэмы Беларусі, пра тое, што павінна дзяржава чалавеку, расказвае доктар медыцынскіх навук, прафесар кафедры сацыяльнай работы Дзяржаўнага інстытута кіравання і сацыяльных тэхналогій Белдзяржуніверсітэта Эдуард ЗБАРОЎСКІ.**

**— Гарадское насельніцтва летась налічвала 7148,5 тысячы чалавек, сельскае — 2523,4 тысячы, адпаведна — 74 і 26 працэнтаў. Адносная большасць сталых людзей у нас пражывае ў сельскай мясцовасці, моладзь — у гарадах. Пры гэтым асноўныя выгоды — медыцынскія, адукацыйныя, сацыяльныя, культурныя — знаходзяцца ў гарадах, а значыць, пажылым — толькі гонар...**

— Я прыгадваю Аўстрыю, дзе гарады, вёскі цягнуцца адно за адным, і ўсе — упарадкаваныя, радуецца вока. А ў нас — правільна вы кажаце — рэзкая мяжа паміж вёскай і горадам. Тут — гмахі, там — каменны век. Аднак я хацеў бы зазначыць вельмі важную рэч: вёска была і сёння часам застаецца захавальнікам духоўнасці, маральнасці, сямейных традыцый. Узяць хоць бы статыстыку разводаў. У 2008 годзе, напрыклад, было зарэгістравана 8945 шлюбаў і 4300 разводаў. Апошніх — амаль палова. На вёсцы ж разводаў значна менш. За 70 гадоў у маёй вёсцы Ліхаўня Нараўлянскага раёна наогул не было ніводнага!

**— Бо стрымлівала агульная гаспадарка: выжыць разам прасцей, чым паасобку.**

— Не думаю, што толькі гэта. Дастаткова сказаць, што ў Гродзенскай і Брэсцкай абласцях з моцна развітым хрысціянствам колькасць разводаў дагэтуль меншая, чым у іншых рэгіёнах. Вёска — гэта запаведнік, дзе захоўваюцца традыцыі хрысціянскай маралі. Людзі звязаны кроўнымі сувязямі, кожны — пад прыглядам усёй вёскі, адказны за яе традыцыі і сацыяльны ўклад з малых гадоў.

**— Але ж не будзем забывацца і на «традыцыйна» вясковае злоўжыванне моцнымі напоямі, імклівую страту здароўя сялянамі, нізкую працягласць жыцця...**

— Той факт, што вясковыя мужчыны жывуць дзесьці на чатыры гады менш за гарадскіх, — нонсенс. Яны павінны жыць даўжэй. Сапраўды, моцны ўплыў аказваюць цяжкая праца, традыцыі выпівання, нізкая даступнасць дасягненняў культуры, адсутнасць шэрагу перспектыў, магчымасцяў для інтэлектуальнага і прафесійнага развіцця...

Я добра памятаю сваю вёску. Скончыў чатырохгадовую школу. У дзесяцігодку хадзіў за 5-6 кіламетраў. Але стаў, як бачыце, прафесарам. Сёння ж дзеці вучацца ў ліцэях, з рэпетытарамі, але прымусіць іх узяць кнігу ў рукі проста немагчыма! Прыгадваю, як дзесьці ў класе шостым мне на суткі дасталіся «Дзеці капітана Гранта». Удзень чытаў за статкам авечак, уначы — ля вогнішча на выгане калгасных коней. Прачытаў у час... Штодзённая праца, навучанне і выхаванне былі цесна звязаныя. Сёння мы разглядаем школу выключна з пазіцыі адукацыі, а калісьці ж яна была ачагом культуры! Кажучы вобразна, наша адукацыя рыхтуе чалавека як дадатак да станка. А ў прынцыпе ж... станок для чалавека. Мы надзвычай мала займаемся выхаваннем Асобы. У вучэбных праграмах амаль няма пытанняў этыкі і маралі. Я напісаў дзесяць кніг, у якіх мараль нітуецца са здароўем. Вы думаеце, хоць адно дзяржаўнае выдавецтва ўзялося іх выдаць? Парадамі дапамагаюць, але не выдаюць. Маўляў, людзей гэта не хвалюе і «бабак» выданне не прынясе.

Мы павінны выхоўваць моладзь на прыкладах людзей, якія з'яўляюцца ўзорам маралі. Сённяшнія шматлікія куміры моладзі такімі ўзорамі быць не могуць. Павінны быць важкія прыклады з ліку масавых прафесій, такія, якім ёсць сэнс прыпадабняцца... Мая вёска пахаваная ў Чарнобыльскай зоне. Штогод мы з дзецьмі, унукамі ездзім на Радаўніцу на могілкі. Бо там — карані. Прывялі магілы прадзедаў у належны стан, і, паглядзеўшы на нас, многія зрабілі тое ж самае. А летась удалося зрабіць яшчэ адну добрую справу.

Жыў некалі ў маёй вёсцы Міхаіл Фёдаравіч Дравіла. Жыў адзін, працаваў з дрэвам, быў сталяром, бандарыў. Надзвычай сумленны чалавек. Лічыў, грэх есці, калі не зарабіў. Ладзіў для нашай сям'і шэраг рэчаў. Памятаю, маці перадала яму ў якасці аплаты кавалак тварагу. Прыношу. Той разгарнуў «падзяку» — вялікі кавалак — і разрэзаў яго на дзве часткі са словамі: «Калі зараблю, прынясеш другую палову». Хто сёння так ацэньвае сваю работу?.. Пакуль мы не ўсвядомім, што есці можна толькі тое, што зарабіў, пра сацыяльную справядлівасць можна не ўзгадваць... Міхаіл Фёдаравіч памёр каля 50 гадоў таму. На мінулую Радаўніцу мае дзеці зрабілі яму крыж замест таго, што згніў, прывезлі за 350 кіламетраў і пачалі яго ставіць. Навакольныя пацікавіліся, што за чалавек, для якога мы гэта робім. Я расказаў, і як толькі ўзяўся за рыдлёўку, нехта з моладзі выхапіў яе з рук, маўляў, «і я хачу дакрануцца да такой пачэснай справы». Так мы паставілі крыж — сімвал праўды — простаму селяніну на закінутых могілках. Вось такіх людзей і трэба шукаць па вёсках. Трэба паказваць чалавека працы, бо яго вопыт можа паўтарыць кожны... На крыжы, дарэчы, замацавалі таблічку вось з такімі маімі радкамі:

*Жыў, бандарыў, сталярыў,*
*праўдай жыў, праўды марыў.*
*Як крышталь меў сумленне —*
*вёсцы ўсёй на здзіўленне.*

**— Словам, «назад, да вёскі»...**

— Я не заклікаю ўсіх пераязджаць на вёску, я заклікаю да сур'ёзнага вывучэння яе вопыту, карыснага для горада, у якім будаўніцтва жылля апярэджвае клопат пра маральныя каштоўнасці.

**— А што ўсё ж такі трэба зрабіць, каб сама вёска зажыла паўнавартасна?**

— Трэба зрабіць людзей гаспадарамі сваёй зямлі. Занятасць людзей, магчымасць быць гаспадарамі свайго лёсу — прынцыпова важныя пытанні. Калі гэтага не будзе, чалавек на вёсцы не застанецца.

**— Аграгарадкі спрыяюць вырашэнню праблемы?**

— Трагедыя ў тым, што мы не падумалі, як дапамагчы таму, хто ўжо жыве на вёсцы... Рабіць разлік на тое, што ў аграгарадкі нехта паедзе, я лічу, няправільна. Ніколі нельга разглядаць чалавека як інструмент для вырашэння тых ці іншых дзяржаўных праблем. Штосьці і дзяржава павінна рабіць для чалавека.

**— У кожным раёне ёсць, напрыклад, тэрытарыяльныя цэнтры сацыяльнага абслугоўвання...**

— Стварэнне такіх цэнтраў — гэта прарыў. Але ім яшчэ трэба даць сур'ёзную тэхналогію, паводле якой яны будуць працаваць. Вось у ахове здароўя ёсць служба, якая прыходзіць да нас, калі мы не ў стане зрабіць гэта. Так і тут. Сацыяльны работнік павінен прыйсці да чалавека, а не чалавек да сацыяльнага работніка. Асноўная задача сацыяльнай работы — абарона людзей, якія трапілі ў складаную жыццёвую сітуацыю, а таксама папярэджванне такіх сітуацый. Скажам, чалавек трапіў на рабоце пад скарачэнне. Сацыяльная служба павінна дапамагчы яму знайсці новае месца, пакуль ён не папоўніў колькасць беспрацоўных. Больш за тое, яна павінна была спрагназаваць, у якіх галінах чакаецца скарачэнне, якія вытворчасці будуць ліквідаваныя, і падумаць, дзе будуць працаваць вызваленыя людзі.

Сацыяльная работа як прафесія, якая існуе ў свеце ўжо больш за стагоддзе, а ў нас — каля 20 гадоў, заклікана дапамагаць чалавеку ў забеспячэнні годнасці, свабоды выбару, сацыяльнай справядлівасці, умоў для творчай і сацыяльнай самарэалізацыі, рэалізацыі права на здароўе... Тэхналогіям, якімі можна дабіцца такіх мэтаў, мы і вучым нашых студэнтаў.

**— Калі ж гэтыя тэхналогіі будуць прымяняцца на практыцы?**

— Калі Міністэрства працы і сацыяльнай абароны звернецца да навукоўцаў са словамі «Зрабіце праграму сацыяльнай абароны пажылых людзей, мы яе прафінансуем, і гэта будзе адпаведны крок для ўзняцця якасці жыцця тых, хто паклаў свае сілы на алтар нашай краіны»... На жаль, у Беларусі няма сацыяльнай навукі, акрамя, хіба, сацыялогіі ды пытанняў занятасці. Між тым ужо шэсць ВНУ рыхтуюць спецыялістаў па сацыяльнай рабоце. Але ім трэба яшчэ даць працоўныя месцы і добрыя тэхналогіі па абароне сям'і, пажылых, інвалідаў, беспрацоўных...

Вышэйшая атэстацыйная камісія лічыць, што навука для сацыяльнай абароны не патрэбна. Але паглядзіце, як развілася сацыяльная рэабілітацыя ў Германіі. Некалі Бісмарк выдаў закон, паводле якога без гэтай рэабілітацыі нельга даваць людзям пенсію, каб не спрыяць утрыманству. Калі ёсць магчымасць, трэба спрабаваць вярнуць чалавека да працы — каб ён плаціў падаткі і такім чынам забяспечваў рэабілітацыю іншага чалавека. Рэабілітацыя — аднаўленне страчаных магчымасцяў у медыцынскім, сацыяльным і прафесійным сэнсе — гэта эканамічны механізм. Рэабілітацыйная навука мае эканамічны вынік. Толькі міласэрнасці не дастаткова. Але ж такую тэхналогію нехта павінен распрацаваць. Нам патрэбна свая навуковая праграма па шэрагу пытанняў, у тым ліку рэабілітацыі пажылых, інвалідаў з абавязковым канчатковым сацыяльна-эканамічным вынікам. Каб захаваць здароўе, людзі павінны кіравацца сацыяльнымі паняццямі здароўя: даход, занятасць, адукацыя, якасць жыцця, жыццёвыя каштоўнасці.

Навуковая праграма па сацыяльных пытаннях патрэбна, у першую чаргу, для забеспячэння работы тэрытарыяльных цэнтраў сацыяльнага абслугоўвання, дзе даволі хутка ствараюцца аддзяленні першаснага прыёму, інфармацыі, аналізу і прагназавання, тэрміновага сацыяльнага абслугоўвання, сацыяльнай адаптацыі і рэабілітацыі, сацыяльнай дапамогі на даму, дзённага знаходжання для інвалідаў, дзённага знаходжання для грамадзян сталага ўзросту, кругласутачнага пражывання для сталых людзей і інвалідаў. Зараз у цэнтрах працуюць цудоўныя людзі, энтузіясты, але ім не хапае сучасных тэхналогій. Без іх і заробкі нават саміх абаронцаў не надта абараняюцца. Само абслугоўванне ажыццяўляецца па заяўным прынцыпе. Калі табе дрэнна — прыйдзі, папрасі дапамогі. Але чалавек не павінен нічога прасіць. Цэнтры існуюць за кошт падаткаў тых, хто працуе. Нельга забываць і пра тое, што самыя знявечаныя лёсам не маюць сілаў і дайсці да цэнтра.

**— Словам, наша сацыяльная служба сама мае патрэбу ў рэабілітацыі...**

— Не так даўно пацікавіўся ў адным з такіх цэнтраў, колькі інвалідаў яны абслужылі за год. Аказалася, каля тысячы. А на ўліку ў раёне — 12 тысяч... Малады чалавек трапляе ў аварыю, і ўсё, што яго чакае, — чатыры сцяны і пенсія па інваліднасці. А ён мог бы працаваць і не мець патрэбы ў поўным аб'ёме пенсіі. Перад гэтым чалавекам раскрыўся б шэраг магчымасцяў. У базе даных цэнтраў сацыяльнага абслугоўвання павінны быць усе інваліды і іх патрэбы, зыходзячы з індывідуальнай праграмы рэабілітацыі. Планаваць работу на чарговы год трэба зыходзячы з патрэбаў канкрэтных людзей.

Колькі гадоў таму ў той жа Германіі было 27 цэнтраў па перанавучанні інвалідаў на новыя прафесіі. І навучалі там не на вартаўніка. Інваліды асвойвалі прэстыжную, патрэбную новым тэхналогіям работу. З ліку перавучаных на працягу года 80 працэнтаў знаходзілі занятасць на агульных умовах. Я сам бачыў, як малады калясачнік кіраваў за камп'ютарам цэхам станкоў з лічбавым праграмным кіраваннем... Рэабілітацыя, спецыяльныя трэнінгі патрэбны і тым, хто выйшаў са зняволення, і алкаголікам, і наркаманам, і жанчынам пасля дэкрэтнага водпуску.

Беларусі патрэбна навуковая праграма па тэхналогіях работы тэрытарыяльных цэнтраў у розных накірунках. Каб наладзіць грамадскую абарону, варта павышаць узровень сацыяльных ведаў у грамадстве. Усе ведаюць, скажам, што такое асабістая гігіена, а хто ведае або дзе вучаць, як правільна распарадзіцца сваім бюджэтам, як яго правільна выкарыстаць, як захаваць здароўе сацыяльнымі датэрмінантамі? Колькі людзей задумваюцца над тым, што самае важнае ўкладанне сродкаў — уласная адукацыя і адукацыя дзяцей?! У нас абітурыенты часам чуюць: не туды паступіш — перавучышся. А пяць гадоў жыцця і грошы вылятаюць! Наша прафарыентацыя таксама пакуль не на належным узроўні. У ідэале неабходна вызначыць псіхафізіялагічныя магчымасці чалавека, даць яму адэкватную прафесію з улікам таго, што больш падыходзіць яму па здольнасцях і патрэбна дзяржаве.

З сацыяльнымі пытаннямі чалавек сутыкаецца на кожным кроку, і дапамагчы яму ў вырашэнні гэтых пытанняў цалкам магчыма. Гэта шлях да здароўя нацыі. Яшчэ тысячу гадоў таму вялікі Авіцэна выказаў думку, што хвароба — гэта абмежаванае ў сваёй свабодзе жыццё.

**Святлана БАРЫСЕНКА.**

Сезонныя хваробы

# АЛЕРГІКАМ ТРЭБА ПАДРЫХТАВАЦЦА ДА ПЫЛЕННЯ РАСЛІН

**У той час, як большасць людзей з нецярплівасцю чакае вясну, ёсць такія, што цярпець не могуць гэтую пару года. Бо вясна для іх звязана са слёзамі, насмаркам, чханнем і дрэнным самаадчуваннем. Так праяўляе сябе сезоннае алергічнае захворванне паліноз.**

Хвароба ўзнікае часцей за ўсё ў другой палове красавіка, калі з'яўляецца пылок бярозы, вольхі, ляшчыны, дуба, клёна, ясеня і некаторых кустоў. Усяго каля 100 раслін могуць выклікаць сезонную алергію. Таму вельмі важна ведаць, на пылок якіх дрэў і раслін так востра рэагуе арганізм і ў сувязі з гэтым рабіць пэўныя захады. Варта звярнуцца да алерголага для таго, каб спецыяліст па-за сезонам цвіцення раслін паставіў скурныя пробы. І на іх падставе праз 20 хвілін можна вызначыць, на якія алергены ёсць адмоўная рэакцыя.

За 10—14 дзён да чаканага перыяду абвастрэння хваробы неабходна пачынаць прымаць супрацьалергічныя, у прыватнасці, антыгістамінныя прэпараты. Гэта могуць быць эрыус, зіртэк, цэлфаст, кесцін, супрасцін, тавегіл, дыязалін і г.д. Яны дапамогуць даволі паспяхова справіцца з сімптомамі хваробы.

Ва ўмовах Беларусі адзначаецца тры пікі цвіцення раслін і тры перыяды ў цячэнні палінозу,

**Першы** — гэта т. зв. **драўляны** паліноз, калі цвітуць дрэвы (канец красавіка — май). У нашых краях асноўнымі алергеннымі дрэвамі з'яўляюцца бяроза, ляшчына, ясень, нярэдка таполя. Гэты драўляны паліноз можа спалучацца з харчовай алергіяй, інакш кажучы, калі ў чалавека ёсць алергія на пылок дрэў, то ўжыванне бярозавага соку, ігруш, усіх костачкавых (чарэшні, вішні, персікі, абрыкосы, слівы) можа прыводзіць да абвастрэння хваробы. Акрамя таго, гэтаму могуць спрыяць арэхі, асабліва фундук, грэцкія арэхі, міндаль. Негатыўную рэакцыю можа выклікаць нават звычайная морква, такая зяляніна, як сельдэрэй, кмен. Нельга лячыцца прэпаратамі з бярозавых пупышак, альховых шышак, кары крушыны.

**Другі перыяд** — цвіценне **злакавых** культур і пустазелля (жыта, цімафееўка, мятлік, ежа і інш.). Ёсць травы, якіх дастаткова не толькі ў сельскай мясцовасці, але і ў горадзе. Як правіла, яны цвітуць у пачатку чэрвеня і да сярэдзіны ліпеня. Зноў-такі ў гэты перыяд можа мець месца харчовая алергія. Да абвастрэнняў палінозу можа прыводзіць ужыванне такіх прадуктаў, як крупяныя кашы, макаронныя і хлебабулачныя вырабы, прадукты, у склад якіх уваходзіць мука.

**Трэці перыяд** пачынаецца з другой паловы ліпеня і працягваецца да верасня. У гэты час цвіце складанакветнае пустазелле. І асноўнай алергеннай травой з'яўляецца палын. Зноў-такі цэлы шэраг прадуктаў можа падтрымліваць праявы палінозу. У прыватнасці, гэта алей, халва, маянэз, гарчыца, прадукты, прыгатаваныя з выкарыстаннем палыну — вермуты, бальзамы. Сюды ж адносяцца сельдэрэй, кроп, пятрушка, перац, мускатны арэх, карыца, каляндра, могуць быць і морква, і бурак, і шпінат.

**Правілы, якіх трэба прытрымлівацца, калі ў вас ёсць паліноз:**

- калі пачырванелі і забалелі вочы, прамыйце іх халоднай вадой, зрабіце халодныя прымочкі на твар або пратрыце лёдам;
- старайцеся менш бываць на сонцы і не загарайце, гуляйце ў сырое надвор'е, калі пылок прыбіваецца да зямлі;
- вясной не карыстайцеся тушшу для веек, фарбай для павекаў і іншай касметыкай;
- змяніце рэжым дня (пік утварэння пылку — паміж 5 і10 гадзінамі раніцы), па магчымасці плануйце выхад з дому на іншы час сутак;
- звярайцеся з прагнозамі надвор'я;
- моцны дождж вымывае пылок з паветра, таму прагулкі пасля дажджу найбольш пажаданыя;
- асцерагайцеся сухіх ветраных дзён, калі пылок можа быць асабліва інтэнсіўным;
- карыстайцеся маскай падчас працы ў двары — маска можа забяспечыць эфектыўны бар'ер паміж пылком і мембранамі слізістай абалонкі;
- душ і змена адзення — добры сродак ад пылку, які, магчыма, сабраўся ў валасах і тканках, пакуль вы былі на вуліцы;
- мыйце галаву на ноч. Купайце хатніх жывёлін, якія часта бываюць на вуліцы. Не сушыце адзенне на свежым паветры.

**Падрыхтавала Вольга ШАЎКО.**

Дзіцячая тэма

# ДЫЯГНАЗ — ПЛОСКАСТУПНЁВАСЦЬ

**Плоскаступнёвасць — самы распаўсюджаны від дэфармацыі ступні ў дзяцей. Часам бацькі не ўсведамляюць сур'ёзнасць гэтага захворвання, бо з боку яно спачатку непрыкметнае і, на першы погляд, не аказвае значнага негатыўнага ўплыву на дзіця. Аднак гэта памылковае меркаванне можа прывесці да сумных наступстваў. Плоскаступнёвасць парушае «рысорныя» функцыі ступні, амаль знікае амартызацыя, і падчас хады ўся «аддача» (штуршкі) дастаецца галёнцы і тазасцегнавому суставу, што можа справакаваць развіццё артрозу, астэахандрозу. Таму з плоскаступнёвасцю абавязкова трэба змагацца.**

***Вас павінна насцярожыць, калі:***

- дзіця скардзіцца на боль у ступнях пасля фізічных нагрузак;
- да вечара ступні стамляюцца і нават ацякаюць, а ў запушчаных выпадках боль даходзіць да каленяў;
- у дзіцяці вельмі хутка вырасла нага, асабліва ў шырыню (насамрэч яна проста расплюшчылася);
- на старым абутку дзіцяці абцасы стаптаныя з унутранага боку.

Просты тэст на плоскаступнёвасць можна правесці ў хатніх умовах з дапамогай аркуша не вельмі шчыльнай (і не атласнай) паперы і любога тлустага крэму або алею. Намажце падэшвы дзіцяці крэмам (алеем) і папрасіце яго наступіць на паперу, пакладзеную на цвёрдую паверхню. Не варта пераносіць усю вагу цела на адну нагу — стаяць трэба на дзвюх нагах адначасова, інакш вынік можа быць памылковым. Цяпер уважліва разгледзьце тлусты адбітак кожнай ступні. У норме па ўнутраным краі ступні павінна быць выемка, глыбіня якой узрастае па меры росту дзіцяці. Адбітак плоскай ступні выемкі не мае.

Калі з'явіліся сумненні, не абысціся без візіту да доктара, які паставіць канчатковы дыягназ. (Дарэчы, страх бацькоў і іх ранні зварот па прычыне «самастойна выяўленай плоскаступнёвасці» ў дзяцей першых гадоў жыцця часцей за ўсё не апраўданы, бо да 4—6 гадоў звод ступні дзіцяці яшчэ не сфарміраваны, а яе «ўплашчэнне» з'яўляецца вынікам згладжвання зводу тлушчавай падушкай.)

Прыроджаная і абумоўленая недастатковасцю злучальнай тканкі. Але прыроджаная плоскаступнёвасць — з'ява рэдкая. Часцей за ўсё плоскаступнёвасць узнікае ў дзяцей у перадшкольным і школьным узросце. Прычынамі яе могуць быць траўмы, залішняя вага, вялікія фізічныя нагрузкі, працяглае знаходжанне ў ложку (з-за хваробы), нашэнне няправільна падабранага абутку. На апошнім спынімся больш падрабязна.

Туфлікі на абцасах, тапачкі на абсалютна плоскай падэшве, вузкія носікі — гэта не зусім тое, што трэба малому. Для таго, каб падчас хады ступня прымала фізіялагічную форму і не дэфармавалася, неабходны «правільны» абутак. Асноўная задача яго — засцерагаць нагу ад udараў, надаваць устойлівасць і не перашкаджаць натуральнаму развіццю мышцаў ступні. Абутак павінен быць лёгкім, выраблены з натуральных матэрыялаў, з жорсткім высокім заднікам і невялікім абцасікам. Абавязковай дэталлю дзіцячага абутку павінен быць супінатар. Гэты маленькі бугарок ля ўнутранага краю падэшвы падымае падоўжны звод ступні і забяспечвае фізіялагічна правільную фіксацыю ножкі. Педыятры не раяць даваць малым даношваць чужы абутак, бо разношаная чужой нагой калодка, па сутнасці, становіцца адбіткам чужой ступні і няправільна размяркоўвае нагрузку на ступні. І яшчэ: не варта «на ўсялякі выпадак» карыстацца артапедычнымі вусцілкамі. Калі насіць іх пастаянна без аб'ектыўнай неабходнасці, то зводы ступні стануць расслабленымі, і плоскаступнёвасць можа развіцца нават у здаровага з артапедычнага пункту гледжання дзіцяці.

Для правільнага фарміравання ступні дзецям патрэбен не толькі добры абутак. Мае значэнне і харчаванне. Злучальная тканка па сваім складзе часткова падобная на касцявую тканку. І гэтаксама пакутуе ад рахіту, гэта значыць няправільнага фосфарна-кальцыевага абмену ў арганізме. Пры недахопе кальцыю, як вядома, косці становяцца мяккімі і дэфармуюцца, а злучальная тканка ступні перастае быць эластычнай і пругкай і гэтаксама ж падпарадкоўваецца ціску вагі цела. Таму нават калі ў вашага малога не назіраецца прыкметаў рахіту, не забывайце і пра плоскаступнёвасць — яшчэ адно наступства дэфіцыту кальцыю. А значыць, падтрымлівайце ў штодзённым рацыёне дзіцяці дастатковую колькасць прадуктаў, багатых на фосфар і кальцый (рыба, малочныя прадукты). Не забывайце і пра сонечныя ванны або прафілактычны прыём вітаміну D у зімовы час.

Для фарміравання пругкага зводу ступні, як і для любой іншай мышачнай функцыі, патрэбная трэніроўка. Няхай дзіця хоць бы час ад часу ходзіць па каменьчыках, пяску, зямлі, траве — па ўсім, што прымушае яго ногі пастаянна напружвацца, пераносіць цяжар цела з адной паверхні на другую, з пяткі на носік. Дома гэта практыкаванне можна з поспехам рабіць з дапамогай маленькіх кубікаў, шарыкаў, дробных нявострых цацак, бабовых, карацей кажучы, любых няроўнасцяў падлогі. Пры гэтым малое можа быць у тоўстых шкарпэтках, але не ў абутку (нават на тонкай падэшве).

У дзяцінстве поўнае вылечванне плоскаступнёвасці яшчэ цалкам рэальнае. Штодзённую зарадку для «гультаяватых» мышцаў ступняў робяць з дапамогай масажу, кантрасных ванначак і спецыяльнай гімнастыкі. Па вечарах папесціце ногі дзіцяці ў гарачай ванначцы з танізавальным настоем рамонку, хвойнага экстракту або марской солі. Пагладзьце распараныя ступні, а потым з сілай разамніце вялікімі пальцамі або кулаком. Асабліва энергічна разамніце вонкавы край ступні — менавіта ён павінен быць самым моцным. Пасля разміналання абліце ногі халаднаватай вадой або пратрыце кавалачкам лёду.

На спецыяльную гімнастыку ад плоскаступнёвасці дзіцяці давядзецца траціць не менш як 10 хвілін на дзень. Дзе ўзяць гэтыя 10 хвілін занятаму школьніку? Купіце масажны дыванок і пакладзіце яго ў ванным пакоі. Пакуль дзіця ўмываецца і чысціць зубы, няхай становіцца на дыванок босымі нагамі, прыпаднімаецца на насках, перакачваецца з наска на пятку, стаіць на вонкавым краі падэшваў.

**КОМПЛЕКС ПРАКТЫКАВАННЯЎ ДЛЯ ЎМАЦАВАННЯ МЫШАЧНА-ЗВЯЗАЧНАГА АПАРАТУ СТУПНЯЎ:**

**1 — заціснуўшы паміж нагамі мячык, павольна ісці, стараючыся не ўпусціць яго;**
**2 — пакласці на падлогу палку і прайсці па ёй бокам, завёўшы рукі за галаву;**
**3 — качаць па падлозе мяч па чарзе то левай, то правай нагой;**
**4 — седзячы на крэсле, браць пальцамі ног алоўкі, раскіданыя на падлозе.**

**Падрыхтавала Вольга ЦЫБУЛЬСКАЯ.**

# «СВЯТОЧНЫ ГРАФІК» УСТАНОЎ АХОВЫ ЗДАРОЎЯ

**У сувязі з пераносам працоўнага дня з панядзелка 12 красавіка на суботу 17 красавіка, змяняецца і графік работы арганізацый аховы здароўя. Адпаведны загад падпісаны міністрам аховы здароўя нашай краіны.**

Так, 10 красавіка ўсе арганізацыі аховы здароўя будуць працаваць па суботнім графіку работы, 11 красавіка — па графіку выхаднога дня. 12 красавіка бальнічныя арганізацыі аховы здароўя, якія маюць стацыянарныя ложкі, будуць працаваць па графіку працоўнага дня, а амбулаторна-паліклінічныя арганізацыі — па суботнім графіку работы.

13 красавіка ва ўсіх арганізацыях аховы здароўя будзе дзейнічаць святочны графік работы.

Для аказання медыцынскай дапамогі насельніцтву ў выхадныя і святочныя дні загад Міністэрства аховы здароўя прадпісвае ўзмацніць работу прыёмных аддзяленняў бальніц, траўматалагічных пунктаў, аддзяленняў інтэнсіўнай тэрапіі і рэанімацыі высокакваліфікаванымі спецыялістамі, а таксама забяспечыць адміністрацыйныя дзяжурствы ў святочныя і выхадныя дні ва ўпраўленнях аховы здароўя, Камітэце аховы здароўя Мінгарвыканкама, у падведамасных арганізацыях і дома работнікаў кіруючага складу (галоўных урачоў, дырэктараў і іх намеснікаў).

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

УНП 100103346

ГОДОВОЙ ОТЧЕТ ЭМИТЕНТА ЦЕННЫХ БУМАГ

Полн. наименование:

ОТКРЫТОЕ АКЦИОНЕРНОЕ ОБЩЕСТВО «МИНСКИЙ ПОДШИПНИКОВЫЙ ЗАВОД»

Адрес: **220026, г. Минск, ул. Жилуновича, 2. Т/ф. 295 01 32**
Полное ф.и.о руководителя: **Лабусов Александр Фёдорович**
Полное ф.и.о гл. бухгалтера: **Шут Татьяна Константиновна**
Основные виды деятельности: **Производство подшипников**

БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС на 1 января 2010 года

Единица измерения млн руб.

| АКТИВ | Код стр. | На начало года | На конец отчетного периода |
|---|---|---|---|
| I. ВНЕОБОРОТНЫЕ АКТИВЫ | | | |
| Основные средства | | | |
| Остаточная стоимость | 110 | 107 545 | 125 661 |
| Нематериальные активы | | | |
| Остаточная стоимость | 120 | 40 | 42 |
| Вложения во внеоборотные активы | 140 | 6 844 | 845 |
| в т.ч. незавершенное строительство | 141 | 59 | 15 |
| **ИТОГО по разделу I** | **190** | **114 429** | **126 548** |
| II. ОБОРОТНЫЕ АКТИВЫ | | | |
| Запасы и затраты | 210 | 90 768 | 82 301 |
| В том числе: | | | |
| сырье, материалы и другие аналогичные активы | 211 | 30 548 | 24 957 |
| животные на выращивании и откорме | 212 | 1 506 | 1 938 |
| затраты в незавершенном производстве и полуфабрикаты | 213 | 13 020 | 9 733 |
| готовая продукция и товары для реализации | 215 | 45 288 | 45 170 |
| расходы будущих периодов | 218 | 406 | 503 |
| Налоги по приобретенным товарам, работам, услугам | 220 | 274 | 175 |
| Дебиторская задолженность | 240 | 11 428 | 19 215 |
| В том числе: | | | |
| покупателей и заказчиков | 241 | 3 755 | 11 714 |
| поставщиков и подрядчиков | 242 | 1 013 | 512 |
| по налогам и сборам | 243 | 376 | 681 |
| по расчетам с персоналом | 244 | 98 | 183 |
| разных дебиторов | 245 | 6 186 | 6 125 |
| Денежные средства | 260 | 391 | 640 |
| Финансовые вложения | 270 | 835 | 827 |
| Прочие оборотные активы | 280 | 6 608 | 10 353 |
| **ИТОГО по разделу II** | **290** | **110 304** | **113 511** |
| **БАЛАНС (190+290)** | **300** | **224 733** | **240 059** |
| ПАССИВ | | | |
| III. КАПИТАЛ И РЕЗЕРВЫ | | | |
| Уставный фонд | 410 | 9 669 | 9 669 |
| Резервный фонд | 420 | | 598 |
| Добавочный фонд | 430 | 122 810 | 128 246 |
| Нераспределенная (неиспользованная) прибыль (непокрытый убыток) | 450 | 14 054 | – 15 785 |
| Целевое финансирование | 460 | 8 | 1 |
| Доходы будущих периодов | 470 | 9 | 2 |
| **ИТОГО по разделу III** | **490** | **146 550** | **122 731** |
| IV. ДОЛГОСРОЧНЫЕ ОБЯЗАТЕЛЬСТВА | | | |
| Долгосрочные кредиты и займы | 510 | 7 693 | 54 396 |
| Прочие долгосрочные обязательства | 520 | 315 | 458 |
| **ИТОГО по разделу IV** | **590** | **8 008** | **54 854** |
| V. КРАТКОСРОЧНЫЕ ОБЯЗАТЕЛЬСТВА | | | |
| Краткосрочные кредиты и займы | 610 | 47 792 | 29 762 |
| Кредиторская задолженность | 620 | 16 547 | 25 989 |
| В том числе: | | | |
| перед поставщиками и подрядчиками | 621 | 9 068 | 18 424 |
| перед покупателями и заказчиками | 622 | 1 872 | 2 644 |
| по расчетам с персоналом по оплате труда | 623 | 2 881 | 2 947 |
| по прочим расчетам с персоналом | 624 | 5 | 43 |
| по налогам и сборам | 625 | 1 157 | 804 |
| по социальному страхованию и обеспечению | 626 | 1 069 | 516 |
| по лизинговым платежам | 627 | 145 | 145 |
| перед прочими кредиторами | 628 | 350 | 466 |
| В том числе из строки 625: | | | |
| инновационный фонд Минпрома | 629 | 134 | 52 |
| Задолженность перед участниками (учредителями) | 630 | 6 | 765 |
| в том числе: по выплате доходов, дивидендов | 631 | 6 | 765 |
| Прочие краткосрочные обязательства | 650 | 5 830 | 5 958 |
| **ИТОГО по разделу V** | **690** | **70 175** | **62 474** |
| **БАЛАНС (490+590+690)** | **700** | **224 733** | **240 059** |

ОТЧЕТ О ПРИБЫЛЯХ И УБЫТКАХ ОАО «МИНСКИЙ ПОДШИПНИКОВЫЙ ЗАВОД» с 01.01.2009 г. по 31.12.2009 г.

Единица измерения млн руб.

| НАИМЕНОВАНИЕ ПОКАЗАТЕЛЕЙ | Код стр. | За отчетный период | За аналогичный период прошлого года |
|---|---|---|---|
| I. ДОХОДЫ И РАСХОДЫ ПО ВИДАМ ДЕЯТЕЛЬНОСТИ | | | |
| Выручка от реализации товаров, продукции, работ, услуг | 010 | 126 949 | 176 128 |
| Налоги и сборы, включаемые в выручку от реализации товаров, продукции, работ, услуг | 011 | 9 051 | 13 866 |
| Выручка от реализации товаров, продукции, работ, услуг (за вычетом налогов и сборов, включаемых в выручку) (010-011) | 020 | 117 898 | 162 262 |
| Себестоимость реализованных товаров, продукции, работ, услуг | 030 | 124 354 | 141 085 |
| Валовая прибыль (020-021-030) | 040 | – 6 456 | 21 177 |
| Управленческие расходы | 050 | 36 | 59 |
| Расходы на реализацию | 060 | 1 142 | 1 186 |
| **ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК) от реализации товаров, продукции, работ, услуг (020-030-050-060)** | **070** | **– 7 634** | **19 932** |
| II. ОПЕРАЦИОННЫЕ ДОХОДЫ И РАСХОДЫ | | | |
| Операционные доходы | 080 | 52 098 | 57 203 |
| Налоги и сборы, включаемые в операционные доходы | 081 | 152 | 631 |
| Операционные доходы (за вычетом налогов и сборов, включаемых в операционные доходы) (080-081) | 090 | 51 946 | 56 572 |
| В том числе: | | | |
| проценты к получению | 091 | 2 | 6 |
| доходы от участия в создании (учредительстве) других организаций | 092 | 80 | 189 |
| доходы от операций с активами | 093 | 177 | 489 |
| прочие операционные доходы | 099 | 51 687 | 55 888 |
| Операционные расходы | 100 | 58 134 | 54 991 |
| В том числе: | | | |
| проценты к уплате | 101 | 5 931 | 410 |
| расходы от операций с активами | 102 | 127 | 247 |
| прочие операционные расходы | 109 | 52 076 | 54 334 |
| **Прибыль (убыток) от операционных доходов и расходов ( 090-100)** | **120** | **– 6 188** | **1 581** |
| III. ВНЕРЕАЛИЗАЦИОННЫЕ ДОХОДЫ И РАСХОДЫ | | | |
| Внереализационные доходы | 130 | 3 057 | 4 536 |
| Внереализационные доходы (за вычетом налогов и сборов, включаемых во внереализационные доходы) (130-131) | 140 | 3 057 | 4 536 |
| Внереализационные расходы | 150 | 12 635 | 6 959 |
| **Прибыль (убыток) от внереализационных доходов и расходов (140-150)** | **160** | **– 9 578** | **– 2 423** |
| **ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК) ( 070+120+160)** | **200** | **– 23 400** | **19 090** |
| Расходы, не учитываемые при налогообложении | 210 | 8 585 | 4 763 |
| Доходы, не учитываемые при налогообложении | 220 | – 253 | – 216 |
| **ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК) до налогообложения (200+210-220)** | **240** | **– 14 562** | **24 069** |
| Налоги на прибыль | 250 | | 5 572 |
| Прочие налоги, сборы из прибыли | 260 | 1 188 | 1 505 |
| Прочие расходы и платежи из прибыли | 270 | 344 | 47 |
| **ЧИСТАЯ ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК) (200-250-260-270)** | **300** | **– 24 932** | **11 966** |

| | |
|---|---|
| **Данные отчетности подтверждены** *(наименование и номер лицензии аудиторской организации или наименование контролирующего органа, проводившего проверку)* | **ООО «Белросаудит». УНП 600506719 Лицензия № 02200/0495344 выдана Министерством финансов Республики Беларусь, срок действия до 25.02.2014.** |

| | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|
| **Кол-во акционеров** | **Всего** | **8 456** | **Юридических лиц** | **1** | **Физических лиц** | **8 455** |

**Информация о дивидендах и акциях**

| Наименование показателя | Единица измерения | За отчетный период | За аналогичный период прошлого года |
|---|---|---|---|
| **Обеспеченность акции имуществом Общества** | **Тысяч рублей** | **0,174** | **0,212** |
| **Информация о задолженности** | | | |
| **Просроченная краткосрочная дебиторская задолженность** | **Миллионов рублей** | **4 952** | **811** |
| **Просроченная кредиторская задолженность** | **Миллионов рублей** | **13 967** | **4 222** |
| **Среднесписочная численность работающих (человек)** | | **3 947** | |

# ВЫБУХ КАТЛА

на цвёрдым паліве ў адным з дамоў вёскі Азераны Рэчыцкага раёна прывёў да разбурэння міжпакаёвай перагародкі жылога памяшкання. У выніку здарэння гаспадыня дома атрымала шматлікія траўмы, паведамілі ў прэс-службе Гомельскага абласнога ўпраўлення МНС. Жанчына шпіталізаваная ў мясцовую бальніцу. Па папярэдняй версіі, прычынай стала парушэнне правілаў эксплуатацыі абсталявання. Выбух адбыўся з-за збоя цыркуляцыі вады.

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.**

Организация:
**ОАО «НППК «Саулит-Инжиниринг»**
Учетный номер плательщика: **УНП 191018258**
Вид деятельности: **Деятельность в области архитектуры**
Организационно-правовая форма: **частная**
Орган управления: **ОАО**
Единица измерения: **млн руб.**
Адрес: **220034, г. Минск, ул. Краснозвездная, 18Б, 3 этаж, комн. 11**

**БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС на 01 января 2010 года**

| АКТИВ | Код строки | На начало года | На конец отчетного периода |
|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 |
| **I. ВНЕОБОРОТНЫЕ АКТИВЫ** | | | |
| Основные средства | | | |
| первоначальная стоимость | 101 | 125,0 | 139,0 |
| амортизация | 102 | 8,0 | 25,0 |
| остаточная стоимость | 110 | 117,0 | 114,0 |
| Нематериальные активы | | | |
| первоначальная стоимость | 111 | - | - |
| амортизация | 112 | - | - |
| остаточная стоимость | 120 | - | - |
| Доходные вложения в материальные ценности | | | |
| первоначальная стоимость | 121 | - | - |
| амортизация | 122 | - | - |
| остаточная стоимость | 130 | - | - |
| Вложения во внеоборотные активы | 140 | - | - |
| в том числе: незавершенное строительство | 141 | - | - |
| Прочие внеоборотные активы | 150 | - | - |
| **ИТОГО по разделу I** | **190** | **117,0** | **114,0** |
| **II. ОБОРОТНЫЕ АКТИВЫ** | | | |
| Запасы и затраты | 210 | 186,0 | 625,0 |
| в том числе: сырье, материалы и другие аналогичные активы | 211 | 13,0 | 12,0 |
| животные на выращивании и откорме | 212 | - | - |
| затраты в незавершенном производстве и полуфабрикаты | 213 | - | - |
| расходы на реализацию | 214 | - | - |
| готовая продукция и товары для реализации | 215 | 131,0 | - |
| товары отгруженные | 216 | - | - |
| выполненные этапы по незавершенным работам | 217 | - | - |
| расходы будущих периодов | 218 | 42,0 | 613,0 |
| прочие запасы и затраты | 219 | - | - |
| Налоги по приобретенным товарам, работам, услугам | 220 | 66,0 | 51,0 |
| Дебиторская задолженность (платежи по которой ожидаются более чем через 12 месяцев после отчетной даты) | 230 | - | - |
| в том числе: покупателей и заказчиков | 231 | - | - |
| прочая дебиторская задолженность | 232 | - | - |
| Дебиторская задолженность (платежи по которой ожидаются в течение 12 месяцев после отчетной даты) | 240 | 679,0 | 677,0 |
| в том числе: покупателей и заказчиков | 241 | 678,0 | 672,0 |
| поставщиков и подрядчиков | 242 | 1,0 | 5,0 |
| по налогам и сборам | 243 | - | - |
| по расчетам с персоналом | 244 | - | - |
| разных дебиторов | 245 | - | - |
| прочая дебиторская задолженность | 249 | - | - |
| Расчеты с учредителями | 250 | - | - |
| в том числе: по вкладам в уставный фонд | 251 | - | - |
| прочие | 252 | - | - |
| Денежные средства | 260 | 602,0 | 62,0 |
| в том числе: денежные средства на депозитных счетах | 261 | 108,0 | 60,0 |
| Финансовые вложения | 270 | - | 465,0 |
| Прочие оборотные активы | 280 | - | - |
| **ИТОГО по разделу II** | **290** | **1 533,0** | **1 880,0** |
| **БАЛАНС (190+290)** | **300** | **1 650,0** | **1 994,0** |
| **ПАССИВ** | **Код строки** | **На начало года** | **На конец отчетного периода** |
| 1 | 2 | 3 | 4 |
| **III. КАПИТАЛ И РЕЗЕРВЫ** | | | |
| Уставный фонд | 410 | 150,0 | 150,0 |
| Собственные акции (доли), выкупленные у акционеров (учредителей) | 411 | - | - |
| Резервный фонд | 420 | - | - |
| в том числе: резервные фонды, образованные в соответствии с законодательством | 421 | - | - |
| резервные фонды, образованные в соответствии с учредительными документами | 422 | - | - |
| Добавочный фонд | 430 | 2,0 | 14,0 |
| Чистая прибыль (убыток) отчетного периода | 440 | - | - |
| Нераспределенная (неиспользованная) прибыль (непокрытый убыток) | 450 | -58,0 | -101,0 |
| Целевое финансирование | 460 | - | - |
| Доходы будущих периодов | 470 | - | - |
| **ИТОГО по разделу III** | **490** | **94,0** | **63,0** |
| **IV. ДОЛГОСРОЧНЫЕ ОБЯЗАТЕЛЬСТВА** | | | |
| Долгосрочные кредиты и займы | 510 | 1 538,0 | 1 893,0 |
| Прочие долгосрочные обязательства | 520 | - | - |
| **ИТОГО по разделу IV** | **590** | **1 538,0** | **1 893,0** |
| **V. КРАТКОСРОЧНЫЕ ОБЯЗАТЕЛЬСТВА** | | | |
| Краткосрочные кредиты и займы | 610 | - | - |
| Кредиторская задолженность | 620 | 18,0 | 38,0 |
| том числе: перед поставщиками и подрядчиками | 621 | 5,0 | 2,0 |
| перед покупателями и заказчиками | 622 | - | 24,0 |
| по расчетам с персоналом по оплате труда | 623 | 8,0 | 8,0 |
| по прочим расчетом с персоналом | 624 | - | |
| по налогам и сборам | 625 | 2,0 | 1,0 |
| по социальному страхованию и обеспечению | 626 | 3,0 | 3,0 |
| по лизинговым платежам | 627 | - | - |
| перед прочими кредиторами | 628 | - | - |
| Задолженность перед участниками (учредителями) | 630 | - | - |
| в том числе: по выплате доходов, дивидендов | 631 | - | - |
| прочая задолженность | 632 | - | - |
| Резервы предстоящих расходов | 640 | - | - |
| Прочие краткосрочные обязательства | 650 | - | - |
| **ИТОГО по разделу V** | **690** | **18,0** | **38,0** |
| **БАЛАНС (490+590+690)** | **700** | **1 650,0** | **1 994,0** |
| Из строки 620: | | | |
| долгосрочная кредиторская задолженность | 701 | - | - |
| краткосрочная кредиторская задолженность | 702 | 18,0 | 38,0 |
| **Активы и обязательства, учитываемые за балансом** | **Код строки** | **На начало года** | **На конец отчетного периода** |
| 1 | 2 | 3 | 4 |
| Арендованные (в том числе полученные в пользование, лизинг) основные средства | 001 | - | - |
| Товарно-материальные ценности, принятые на ответственное хранение | 002 | - | - |
| Материалы, принятые в переработку | 003 | - | - |
| Товары, принятые на комиссию | 004 | - | - |
| Оборудование, принятое для монтажа | 005 | - | - |
| Бланки строгой отчетности | 006 | - | - |
| Списанная в убыток задолженность неплатежеспособных дебиторов | 007 | - | - |
| Обеспечения обязательств и платежей полученные | 008 | - | - |
| Обеспечения обязательств и платежей выданные | 009 | - | - |
| Амортизационный фонд воспроизводства основных средств | 010 | -115,0 | -104,0 |
| Основные средства, сданные в аренду (лизинг) | 011 | - | - |
| Нематериальные активы, полученные в пользование | 012 | - | - |
| Амортизационный фонд воспроизводства нематериальных активов | 013 | - | - |
| Потеря стоимости основных средств | 014 | - | - |

**ОТЧЕТ О ПРИБЫЛЯХ И УБЫТКАХ**
**с 1 января 2009 г. по 31 декабря 2009 г.**

| Наименование показателей | Код строки | За отчетный период | За аналогичный период прошлого года |
|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 |
| **I. ДОХОДЫ И РАСХОДЫ ПО ВИДАМ ДЕЯТЕЛЬНОСТИ** | | | |
| Выручка от реализации товаров, продукции, работ, услуг | 010 | 155,0 | - |
| Налоги и сборы, включаемые в выручку от реализации товаров, продукции, работ, услуг | 011 | 24,0 | - |
| Выручка от реализации товаров, продукции, работ, услуг (за вычетом налогов и сборов, включаемых в выручку) (010-011) | 020 | 131,0 | - |
| Справочно: из строки 010 сумма государственной поддержки (субсидий) на покрытие разницы в ценах и тарифах | 021 | - | - |
| Себестоимость реализованных товаров, продукции, работ, услуг | 030 | 159,0 | - |
| Валовая прибыль (020-021-030) | 040 | -28,0 | - |
| Управленческие расходы | 050 | - | - |
| Расходы на реализацию | 060 | - | - |
| **ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК) от реализации товаров, продукции, работ, услуг (020-030-050-060)** | **070** | **-28,0** | **-** |
| **II. ОПЕРАЦИОННЫЕ ДОХОДЫ И РАСХОДЫ** | | | |
| Операционные доходы | 080 | 541,0 | 2 070,0 |
| Налоги и сборы, включаемые в операционные доходы | 081 | 1,0 | 129,0 |
| Операционные доходы (за вычетом налогов и сборов, включаемых в операционные доходы) (080-081) | 090 | 540,0 | 1 941,0 |
| в том числе: проценты к получению | 091 | 12,0 | 2,0 |
| доходы от участия в создании (учредительстве) других организаций | 092 | - | - |
| доходы от операций с активами | 093 | 3,0 | 719,0 |
| прочие операционные доходы | 099 | 525,0 | 1 220,0 |
| Операционные расходы | 100 | 540,0 | 1 935,0 |
| в том числе: проценты к уплате | 101 | - | - |
| расходы от операций с активами | 102 | 5,0 | 711,0 |
| прочие операционные расходы | 109 | 535,0 | 1 224,0 |
| **ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК) от операционных доходов и расходов (090-100)** | **120** | **-** | **6,0** |
| **III. ВНЕРЕАЛИЗАЦИОННЫЕ ДОХОДЫ И РАСХОДЫ** | | | |
| Внереализационные доходы | 130 | 43,0 | 97,0 |
| Налоги и сборы, включаемые во внереализационные доходы | 131 | - | - |
| Внереализационные доходы (за вычетом налогов и сборов, включаемых во внереализационные доходы) (130-131) | 140 | 43,0 | 97,0 |
| Внереализационные расходы | 150 | 58,0 | 159,0 |
| **ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК) от внереализационных доходов и расходов (140-150)** | **160** | **-15,0** | **-62,0** |
| **ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК) (±070±120±160)** | **200** | **-43,0** | **-56,0** |
| Расходы, не учитываемые при налогообложении | 210 | 16,0 | 61,0 |
| Доходы, не учитываемые при налогообложении | 220 | - | - |
| **ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК) до налогообложения (±200+210-220)** | **240** | **-27,0** | **5,0** |
| Налог на прибыль | 250 | - | 1,0 |
| Прочие налоги, сборы из прибыли | 260 | - | 1,0 |
| Прочие расходы и платежи из прибыли | 270 | - | |
| **ЧИСТАЯ ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК) (200-250-260-270)** | **300** | **-43,0** | **-58,0** |
| Справочно (из строки 300): сумма предоставленной льготы по налогу на прибыль | 310 | - | - |
| Прибыль (убыток) на акцию | 320 | - | - |
| Количество прибыльных организаций / сумма прибыли | 330 | - / - | - / - |
| Количество убыточных организаций / сумма убытка | 340 | 1,0 / -43,0 | 1,0 / -58,0 |

**РАСШИФРОВКА ОТДЕЛЬНЫХ ВНЕРЕАЛИЗАЦИОННЫХ ДОХОДОВ И РАСХОДОВ**

| Показатель | | За отчетный период | | За аналогичный период предыдущего года | |
|---|---|---|---|---|---|
| наименование | код | доход | расход | доход | расход |
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 |
| Штрафы, пени и неустойки, признанные или по которым получены решения суда (арбитражного суда) об их взыскании | 350 | - | - | - | - |
| Прибыль (убыток) прошлых лет | 360 | - | - | - | - |
| Возмещение убытков, причиненных неисполнением или ненадлежащим исполнением обязательств | 370 | - | - | - | - |
| Курсовые разницы по операциям в иностранной валюте | 380 | 43,0 | 43,0 | 97,0 | 97,0 |
| Списание дебиторских и кредиторских задолженностей, по которым истек срок исковой давности | 390 | - | - | - | - |
| Прочие доходы и расходы | 400 | - | 15,0 | - | 62,0 |
| **ИТОГО** | **500** | **43,0** | **58,0** | **97,0** | **159,0** |

**Руководитель** **Комолов В.С.**
**Главный бухгалтер** **Трухан З.М.**
**31 марта 2010 г.**

Слоўніца

# ВУЗЕЛЬЧЫКІ НА ПАМЯЦЬ

**Трэба дома бываць часцей, трэба дома бываць не госцем, каб душою не ачарсцвець... Гэтыя вершаваныя радкі пачалі круціцца ў маёй галаве, калі я села за лісты, дасланыя нашымі чытачамі. За імі схаваная ўлюбёнасць у мясціны, адкуль людзі родам. Магчыма, і цягне на вёску беларусаў менавіта таму, каб сапраўды душою не ачарсцвець. Родны куток наталяе чалавека, робіць яго моцным, лагодным, шчаслівым, дае спакой.**
**Я, гараджанка, адчуваю гэта, калі назіраю за старэйшым пакаленнем. Сувязь з малой радзімай не перарываецца. Гэта радасць у вачах і імпэт, з якім людзі вітаюць нечакана сустрэтага земляка, менавіта з тваёй або суседняй вёскі, хіба не пацвярджэнне таму? А патокі машын і перапоўненыя аўтобусы, што цягнуцца да вясковых могілак на Радаўніцу, а імкненне даведацца, хто мы, адкуль мы, вывучэнне радаводу, хіба не сведчаць, што сувязі не парываецца, што беларусы не «чарсцвеюць душой»? Многія імкнуцца захаваць часцінку сваёй радзімы, няхай праз успаміны, праз расповеды дзецям, унукам альбо праз збіранне нейкай сваёй моўнай спадчыны. Гэта як тыя вузельчыкі на памяць. Пра свой непаўторны край, пра мясцовы каларыт , пра характар землякоў, пра лёс сваёй краіны.**

***«Колькі гадоў таму я пачаў укладанне слоўнічка мовы жыхароў вёскі Скобраўка, што ў Пухавіцкім раёне,*** **— піша Зміцер ЦЕХАНОВІЧ.** ***Дужа не хочацца, каб стагоддзямі крышталізаваная спадчына нашых дзядоў і прадзедаў пайшла дымам. Таму дзякую вам за выдатны пачатак рубрыкі. І буду дужа рады, калі ў яе развіццё прыдадуцца матэрыялы, якія дасылаю.***

## Слоўніца Скобраўкі

Як вядома, геаграфічны цэнтр Беларусі знаходзіцца ў Пухавіцкім раёне. А ў сярэдзіне Пухавіцкага раёна, «як тое ядро ў арэху» (даруйце, землякі!), радзіма маіх дзядоў і прадзедаў — вёска Скобраўка.

Тут ужо няма ні маёнтка, ні фальваркаў, ні царквы (разбураная ў 1932 годзе).

Але засталася вусная памяць вёскі Скобраўка з-пад самага сэрца Беларусі. Засталася старадаўняя, крынічная беларуская мова скобраўцаў — яе залацінкі сабраныя мною ў слоўнічак Скобраўкі, які ўключае прымаўкі і прыказкі, зычанні і віншаванні, а таксама асобныя словы.

Варта зазначыць: карэнная мова жыхароў Скобраўкі адносіцца да цэнтральнабеларускіх гаворак, што ляглі ў аснову літаратурнай беларускай мовы. Таму не дзіўна, што на моўную спадчыну Скобраўкі звярталі сваю ўвагу такія славутыя беларускія мовазнаўцы XX стагоддзя, як Яўхім Карскі і Фёдар Янкоўскі.

Так, Яўхім Карскі ў сваёй працы «Чэрвеньская гаворка (з беларускай дыялекталогіі)» (1930 год) на прыкладзе запісаных амаль сто гадоў таму ў Скобраўцы словаў звяртаў увагу на характэрную рысу мовы тагачасных скобраўскіх жыхароў — імкненне пазбягаць гуку ф: праз арху, з новаю арпай (замест — арфу, арфай).{Гук «Ф» яшчэ і цяпер не прымаецца прадстаўнікамі старэйшага пакалення на значнай тэрыторыі Беларусі. Нягледзячы на тое, што прайшло дзесяць стагоддзяў з часу, як прынятае хрысціянства і як фіта ўведзена ў славянскі алфавіт, наша адметная фанетыка не зжылася з гэтым гукам. Яшчэ і цяпер на запісах, сабраных у розных вёсках Беларусі, навукоўцы могуць пачуць замест Філіп — {хвіліп}, замест ферма — {хверма}, нават новае слова факт гучыць як {хвакт}. Моўныя асаблівасці перадаваліся людзям па традыцыі, у якой не было гука {ф}. А цяпер, калі беларуская мова інтэнсіўна завучваецца, калі ёсць радыё і прэса, гэты гук пачаў засвойвацца. — **Алена Дзядзюля**}.
Некалькі скобраўскіх фразеалагізмаў падае ў сваёй кнізе «Беларуская фразеалогія. Фразеалагізмы, іх значэнне, ужыванне» (1968 год) Фёдар Янкоўскі:

ВЫБІВАЦЦА З СІЛЫ. ВЫБІЦЦА З СІЛЫ (вельмі стамляцца, змарвацца, знясільвацца).

ЯК ЖАР ГАРЫЦЬ (палымнее, чырванее). Тыя гады пазірнеш на Скобраўку, дык уся Скобраўка як жар гарыць. Адны вішні! А нейкае лета, мусіць, пазалетась, нешта зрабілася з вішнямі, пасохлі.

Але асноўная фразеалагічная спадчына Скобраўкі яшчэ чакае свайго асэнсавання.

Вось, напрыклад, фразеалагізмы, запісаныя ад Цехановіч Зінаіды Ігнатаўны і Сітнік Валянціны Ігнатаўны:

**Ані шум баравы** (хоць бы што). Кажаш, кажаш, а яму — ані шум баравы.

**Ганяюць, як Марку па пекле.**

**Дарам і каза не скача** (відавочныя калядныя карані гэтай прыказкі).

**Дурны, як баўтун** (баўтун — яйка, з якога пасля наседжвання курыцай-квактухай не з'яўляюцца кураняты).

**На то Бог дзірачку вярцеў, каб нячысты дух ляцеў.**

**Не хачу іхняга ні мёду, ні смуроду.**

**У жарт перакідай!**

**Хадзіць пустымі сцежкамі** (нешта рабіць без сэнсу).

**Які палец не парэж, кожны баліць.**

Колькі скобраўскіх фразеалагізмаў, запісаных ад Харытончык Валянціны Уладзіміраўны — былой жыхаркі Скобраўкі, якая сёння пражывае ў Гродне:

**Выбірай жонку не на свяце, а на працы.**

**Як дбаеш, так і маеш.**

**Дару грошы і пчол калоду, і жадаю мець сына да году** (так гаварылі, калі на вяселлі віншавалі маладых і дарылі ім падарункі).

**Няхай Бог гадуе ды добрую долю гатуе** (так казалі, калі па нараджэнні дзіцяці прыходзілі ў адведкі, віншавалі з нараджэннем).

**Злодзей вуглы пакіне, а пажар нічога не пакіне.**

**Злы чалавек не верыць, што добры на свеце ё.**

**Гаспадынька сумела прыгатаваць, ды не сумела на стол падаваць.**

**Мужык з жабу, а цэніцца за самую лепшую бабу.**

**Праца корміць, вучыць і мучыць.**

Некалькі скобраўскіх фразеалагізмаў, згаданых Бацюк Зояй Іосіфаўнай (у дзявоцтве—Дудко), якая цяпер жыве ў г. Любань:

**Не хваліся трыма днямі, а хваліся трыма гадамі** (пра паспешныя вывады).

**Май — валам дай, ды на печ уцякай** (пра тое, што і ў маі бывае холадна).

**Каб сяло, дык бы і веры дало** (таму казалі, хто яўна хлусіць).

**Ідзі, ідзі, дачушка, замуж, ды замужам не баўся** (жарт).

**З'еш хоць вала, ды адна хвала** (так казалі ў асуджэнне сквапнасці).

**За пераборы застаюцца лапці ды аборы** (пра людзей, якія ў чымсьці перабіраюць).

А вось шэраг адметных слоў з традыцыйнай гаворкі Скобраўкі:

**Абракацца** (даваць зарок; пасціць, каб загаданае адбылося).

**Варавацца** (пабойвацца).

**Вярлыза, варлыза** (высокі чалавек).

**Гегала** (няўдаліца).

**Грубіня** (таўшчыня чаго-небудзь).

**Збуёдаць** (страціць).

**Пагнілкі** (пра нешта ўшчэнт састарэлае).

**Распахтарыць** (парэзацца).

**Хлупіць** (цяжка дыхаць).

**Чаўпсці** (гарадзіць-гаварыць абы-што).

Напрыканцы прашу адгукнуцца праз газету былых і сённяшніх жыхароў вёскі Скобраўка. Дасылайце лісты і ўспаміны. Давайце разам напішам гісторыю Скобраўкі — вёскі, з якою звязаны наш Род.

**Зміцер ЦЕХАНОВІЧ.**

**ХАЦЕЛАСЯ б зрабіць адну заўвагу: вышэй згаданыя нашым чытачом словы і выразы будзе няправільна лічыць выключна спадчынай Скобраўкі, імі карыстаюцца і ў іншых кутках Беларусі. Многія з іх навукоўцы ўжо сустракалі і запісвалі. «Каласальная колькасць інфармацыі знаходзіцца ў розных лексікаграфічных крыніцах. Трэба быць вельмі асцярожным, перш чым заяўляць, што пэўныя словы ўнікальныя і характэрныя толькі для пэўнай тэрыторыі. Для гэтага кожнае слова трэба перамацаць і паглядзець у самых розных крыніцах», — заўважае супрацоўнік аддзела дыялекталогіі і лінгвагеаграфіі Інстытута мовы і літаратуры Нацыянальнай акадэміі навук Вераніка КУРЦОВА.**

Некаторыя з выразаў у іншых рэгіёнах могуць хадзіць у крыху зменянай форме, з іншымі кампанентамі.

**На адным дні тры поўдні** (пра непаслядоўнага ў сваіх меркаваннях чалавека) — а вядомы яшчэ варыянт: на адным дні тры серады.

**Паслала Рыгора па пясок за мора — ні Рыгора, ні пяску.** (а часам кажуць «паслала цялёначка за мора»).

**Чужое дабро вылезе праз рабро** (альбо праз горла).

**Бацюта** — дзіця, падобнае на бацьку знешнасцю, характарам. — Такое слова, гэтак жа як і яго жаночы варыянт «матуся» вядома ў гаворках не толькі цэнтральнай Беларусі, але і шырэй, яго навукоўцы сустракалі і ў Старадарожскім раёне, у Любанскім, у Асіповіцкім.

**Выцяў** — вельмі моцна пабіў. У іншых мясцінах кажуць «адцяў».

**Мандрымоніць** (лішняе гаварыць) — ёсць іншыя варыянты, напрыклад, «мандры гнаць».

**Усурычыць** (даць нешта гвалтам) — вядома блізкае слова «ўсучыць».

**Уздзябурыцца** (падняцца рана) — ёсць і варыянт «узбурыцца».

**Цурынка** (дзірачка). У «Краёвым слоўніку Чэрвеньшчыны», які ўклаў М.В. Шатэрнік, можна пабачыць слова цурачка (дай хоць цурачку малака) — вельмі мала.

**Шыдэлак** (кручок для вязання) — слова вядома найперш у цэнтральнай частцы Беларусі і на паўночным захадзе, на іншых тэрыторыях могуць называць гэты прадмет «тамбуркай».

**Жыжка** (крапіва) — калі ўзяць Лексічны атлас беларускіх народных гаворак, можна прасачыць, пад якімі назвамі «прадстаўлена» гэтая расліна ў розных мясцінах: жыгучка, жугушка, жугучка, жыжуха, жывушка, жыжка і іншае.

**Плісні**к (аер) — у атласе яшчэ зафіксаваны варыянты: плішнік, пліснік, плюснік, свойскі плюшнік, плешнік, плыснік, плюшняк, явар, лепех, лепешнік і іншыя.

А вось словы, якія Вераніка Курцова сустракае ўпершыню: «Сэнды, бэнды» — мянташыць языком (гаварыць абы-што; пачатак гэтага выраза — відавочна, па-народнаму высмеяная польская мова). Магчыма, напачатку так казалі пра людзей, якія ў сваім маўленні блыталі словы з беларускай і польскай моў.

**Напісторыцца** (ладна пад'есці).

**Выкамарваць** (вычужваць, выдурвацца).

**Распахтарыць** (парэзацца).

Вядома, многія са слоў, што нарадзіліся ў народных гаворках, зафіксаваныя навукоўцамі. Іх можа не быць у літаратурнай мове, але яны ўжо захаваныя для нас у розных пісьмовых крыніцах. Напрыклад, у пачатку 20-х гадоў мінулага стагоддзя была задума стварыць серыю слоўнікаў па беларускаму маўленню, асобныя з іх пабачылі свет (напрыклад, «Краёвы слоўнік Чэрвеньшчыны», укладзены М.В. Шатэрнікам). Тыя, хто шукае старыя словы, могуць зазірнуць і ў Слоўнік цэнтральных гаворак. Вельмі вялікая колькасць матэрыялаў па краязнаўстве друкавалася ў часы станаўлення беларускай літаратурнай мовы ў часопісе «Наш край». Калі гаварыць пра фразеалагізмы, вялікая праца была праробленая І. Насовічам, М. Даніловічам. На працягу 1993—1998 гадоў выходзіў Лексічны атлас беларускіх народных гаворак, за працу над якім мовазнаўцы былі ўганараваныя Дзяржаўнай прэміяй Беларусі. Збіранне моўных скарбаў працягваецца, словы, дасланыя нашымі чытачамі, таксама будуць «улічаныя» навукоўцамі.

Але хочацца верыць, што некаторыя з іх знойдуць і практычнае прымяненне. Магчыма, зараз хтосьці шукае адказ на пытанне: «А як сказаць па-беларуску?». А вы ведаеце на яго адказ.

**Чакаем лістоў.**

**Алена ДЗЯДЗЮЛЯ.**

## «МЁРТВАЯ ДУША» АКАМПАНІЯТАРА

Суд Талачынскага раёна на 35 базавых велічыняў аштрафаваў былога дырэктара Дома культуры ў гарадскім пасёлку Коханава. Як паведаміў «Звяздзе» **намеснік пракурора раёна Іван Ёдыс**, жанчына на працягу двух гадоў, з'яўляючыся адказнай асобай, асабіста ўносіла ў афіцыйныя дакументы заведама фальшывыя звесткі аб рабоце акампаніятара. Насамрэч на гэтай пасадзе ніхто не працаваў.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

**Информация**
**ОБ ОТКРЫТОМ АКЦИОНЕРНОМ ОБЩЕСТВЕ**
**«БРЕСТСКИЙ КОМБИНАТ СТРОИТЕЛЬНЫХ МАТЕРИАЛОВ»**
**и его деятельности за 2009 год**

**Местонахождение:** 224028 г. Брест, ул. Московская, 360.
**Основной вид деятельности:** производство кирпича керамического, плитки керамической для внутренней облицовки стен. Количество акционеров всего — 778, в том числе: юридических лиц — 1, физических — 777. Среднесписочная численность работающих — 555 человек.
УНП — 200295903.

**БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС на 1 января 2010 года** млн руб.

| АКТИВ | Код строки | На начало года | На конец отчетного периода |
|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 |
| Основные средства (остаточная стоимость) | 110 | 10416 | 14910 |
| Нематериальные активы (остаточная стоимость) | 120 | 2 | 2 |
| Вложения во внеоборотные активы | 140 | 1938 | 56 |
| Запасы и затраты | 210 | 7506 | 7978 |
| Налоги по приобретенным товарам, работам, услугам | 220 | 7 | 23 |
| Дебиторская задолженность | 240 | 456 | 739 |
| Денежные средства | 260 | 3376 | 3271 |
| Финансовые вложения | 270 | 43 | 43 |
| **Баланс** | **300** | **23744** | **27022** |
| **ПАССИВ** | | | |
| Уставный фонд | 410 | 14643 | 14643 |
| Добавочный фонд | 430 | 1120 | 2795 |
| Нераспределенная прибыль (непокрытый убыток) | 450 | 7085 | 8413 |
| Кредиторская задолженность | 620 | 896 | 1171 |
| **Баланс** | **700** | **23744** | **27022** |

**ОТЧЕТ О ПРИБЫЛЯХ И УБЫТКАХ за 2009 год** млн руб.

| Наименование показателей | Код строки | За отчетный период | За аналогичный период прошлого года |
|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 |
| 1. Доходы и расходы по видам деятельности | | | |
| Выручка от реализации товаров, продукции, работ, услуг (за вычетом налогов и сборов, включаемых в выручку) | 020 | 26407 | 28960 |
| Себестоимость реализованных товаров, продукции, работ, услуг | 030 | 23372 | 23973 |
| Расходы на реализацию | 060 | 641 | 861 |
| Прибыль (убытки) от реализации товаров, продукции, работ, услуг (020-030-060) | 070 | 2394 | 4126 |
| Прибыль (убыток) от операционных доходов и расходов | 120 | -1 | - |
| Прибыль (убыток) от внереализационных доходов и расходов | 160 | 1088 | 109 |
| Прибыль (убыток) | 200 | 3481 | 4235 |
| Налог на прибыль | 250 | 804 | 965 |
| Прочие налоги, сборы из прибыли | 260 | 207 | 306 |
| Чистая прибыль (убыток) (200-250-260-270) | 300 | 2470 | 2964 |

| Показатель | Единица измерения | С начала года | За аналогичный период прошлого года |
|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 |
| Начислено на выплату дивидендов в данном отчетном периоде | млн руб. | 681,46 | 715 |
| Дивиденды, приходящиеся на одну акцию (включая налоги) | рублей | 12255,66 | 12855 |
| Обеспеченность акции имуществом Общества | тыс. руб. | 457 | 425 |

**Директор** **В.П. Морозов**
**Главный бухгалтер** **В.Л. Мищук**

**ОАО «Жабинковский сахарный завод»**
**объявляет о выплате дивидендов за 2009 год.**
Срок выплаты дивидендов — с 24.03.2010 г. до 23.05.2010 г.
Размер дивидендов на 1 акцию: 0,21 рубля
(0,15% к номинальной стоимости). Порядок выплаты дивидендов:
перечисление дивидендов будет осуществляться
следующим образом:
— юридическим лицам — на расчетные счета в банках;
— физическим лицам — почтовыми переводами по месту жительства.
УНП 200037600

Радавыя Перамогі

# «ЗВЯЗДА» ЗНАЙШЛА родзічаў беларуса — абаронца Рыгі

